№ 13 (371) 2 красавіка 2004 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы




## NATO вакол!



Сяргей Дубавец пра NATOўскую будучыню Беларусі і расейскамоўныя СМІ. Старонка 5.

## У Лукашэнкі на хвасьце



Сацыёлягі «Новака»: апазыцыя паціху здаганяе. Старонка 3.

## Перамога геяў



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Ільля Крачына бараніў ня толькі гонар свайго сайту, але і сваё «я». Старонка 2.



«БЕЛОРУССКИЙ РЫНОК»

## Ізноў галадоўка, ізноў посьпех

30 сакавіка пайшлі дзясятыя суткі бестэрміновай галадоўкі 10 з 20 работнікаў малога смалявіцкага прадпрыемства «Юкі». Улады ідуць на перамовы і гатовыя на саступкі. Старонка 7.

## Шарм невытлумачальны



Старонка пісьменьніка: паўночны і каталіцкі творца Франц Сіўко. Старонка 15.

# Арыстакраты духу

## Аднавіўся выхад газэты «Свабода»

У адроджанай газэце, якую рэдагуе Сяргей Дубавец, сталыя чытачы «НН» пазнаюць той самы творчы дух і тэматыку, якія вылучалі «Нашу Ніву» 1990-х. Новая «Свабода» задуманая як выданьне элітарнае, але не для вузкага кола, а для «маральнай большасьці» нашага грамадзтва — яе палітычнай і культурнай эліты. «Выданьне, якое падымала б дух, каб насоў ня вешалі». У першым нумары — верш Янкі Купалы «Шчасьце», эсэ Генадзя Сагановіча «Historia vivit» і Ігара Бабкова «Пасьля Атлянтыды», апытаньне на тэму «Чым беларусы адрозьніваюцца ад расейцаў». Значную літаратурную частку вянчаюць праекты пераносу сталіцы Беларусі ў Горадню і Полацак.

Распаўсюд газэты пачаўся на Дзень Волі. Першы тыраж разышоўся сярод удзельнікаў вечарыны «Дзеяслова» ў Доме літаратара. Выданьне не зарэгістраванае — змушана, але і прынцыпова. Вітаем «Свабоду»! Пыл мінулага сьмялей зьбівайце зь пёраў!

Рэдакцыйны артыкул «Свабоды» мы перадрукоўваем на **старонцы 6.**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Не дарма!

**У 1990-я Дзень Волі праходзіў пад знакам змаганьня за Незалежнасьць. І ўпартыя ўдзельнікі незалежніцкіх маршаў зрабілі сваё. У тым, што пагрозы дзяржаўнасьці больш няма, найперш іхная заслуга.**
**Цяпер акцэнт Дня Волі зьмяніўся. На парадку дня стаіць не патрабаваньне Волі-Незалежнасьці, але Волі-Дэмакратыі. Спатрэбіцца колькі гадоў і колькі маніфэстацый, каб сыстэма саступіла і ў гэтым. Уладам цяжка нешта проціпаставіць эфэкту мітынгаў. Што ты там ні пляці з экранаў, а вось — народ пратэстуе! Аксана Новікава для махавіка страху небясьпечнейшая за тысячу публіцыстаў. Таму штогод так нэрвова рэагуюць на Дзень Волі — нават на нявінныя гуляньні — рэпрэсіўныя органы і аракулы БТ. Але карны патэнцыял іх сыстэмы абмежаваны. Перабор б'е бумэрангам па ёй самой, па яе верагоднасьці. Сыстэма запалохвае, а Новікава не баіцца.**

**Працяг на старонцы 2.**

# «Жыві сам сабе»

Двор Уладзімера Залатара нагадвае лябірынты — мноства вальераў, хляву, адрынаў, зь якіх нясецца чыліканьне й квахтаньне. У хляўку — самаканструяваны яйказборнік, па жолабе якога могуць скочвацца яйкі розных памераў — ад двухсантымэтровых да гіганцкіх. На рай гэта непадобна, на рацыянальную гаспадарку — таксама. Нешта сярэдняе арытмэтычнае. Летам тут заасад, батанічны сад і дзіцячы сад у адным флаконе. Чалавек жыве сам сабе… **Старонка 8.**

# Сьвіньня XXI стагодзьдзя



Беларускія навукоўцы ў 2005 г. выведуць новую супэрмясную пароду, здольную канкураваць з эўрапейскімі і прыстасаваную да беларускіх умоваў. Таўшчыня сала ў беларускіх сьвіней пакуль што 25—27 мм (у заходніх — 20—22 мм), сабекошт кілаграма мяса — большы за даляр (на Захадзе — 0,7—0,9). Але сэлекцыянэры гатовыя даць рады гэтай праблеме.

**Старонка 9.**

**«Наша Ніва» — незалежная крыніца інфармацыі і грунтоўны аналітык беларускага і міжнароднага жыцьця.** «Наша Ніва» — гэта 16 старонак без чужога слова штотыдзень. Падпісны індэкс 63125. Падпіску прымаюць на любой пошце, а ў Менску — і на шапікі «Белсаюздруку» ды ў прыватным агенцтве «Эй Бі ПрэсСэрвіс». Цана на месяц — 2580 рублёў на поштах або 1800 рублёў на шапікі «Белсаюздруку». Гэта абыдзецца нашмат таньней, чым купляць уразброд. **Дык падпісвайся!**

## Каханьне бяз правілаў,

новы Дастаеўскі, Ales Rasanau: Wortdichte. Навіны культуры. **Старонкі 13—14.**

## Галоўнае — торс

Лёлік Ушкін пра самых прыгожых дзяўчат Горадні. **Старонка 16.**

# Не дарма!

Працяг са старонкі 1.

**Аглядальнік «Беларускіх навінаў» напісаў, што маніфэстантаў наўрад ці было б нашмат больш, нават калі б апазіцыі не перашкаджала міліцыя. Гэта ня так. Шматступеньчатая сыстэма запалохваньня, калі першых адсякаюць і хапаюць яшчэ каля мэтро, другіх — дэманстратыўна да часу збору, а трэціх падчас яго, для таго і ўжываецца, і ўдасканальваецца мудрацамі з МУС, што дае добры эфэкт. Аднак Сяргей Пульша слушна кажа, што нешматлікасьць мае прычынай нашыя пахібкі ды бесталковасьць. Некаторыя зь іх паўтараюцца з году ў год. Паспрабуем зрабіць «работу над памылкамі».**

**Самая відавочная зь іх — непаважна пачынаць сьвяточныя гуляньні або маніфэстацыю а 17-й у працоўны дзень, калі большасьць людзей робіць або вучыцца да 18-й, а то й пазьней. Прыхільнікі апазіцыі — гэта ж пераважна тыя, хто шмат і сумленна працуе, а не гультаі ці бамжы. Дарэчы, на Захадзе вечаровыя дэманстрацыі ці імпрэзы, ды нават тэатральныя спэктаклі традыцыйна пачынаюцца а 20-й або нават а 21-й.**

**Таксама несалідна штогод прапаноўваць адны й тыя самыя формы ўрачыстасьцяў. Амаль упэўнены, што «зуброўцы», ліцэісты ці рокеры на чале аргкамітэту прыдумалі б нешта небанальнае. Аднак чамусьці на фармаваньне аргкамітэту глядзяць, як на подпісы да нэкралёгаў «Советской Белоруссии».**

**Чаму сьвята адзначалася больш сьціпла, чым у папярэднія гады, патлумачыў і сустаршыня аргкамітэту Аляксей Марачкін: «Вырашылі, што найбольш масавым шэсьцем, дзе прагучыць і сёньняшняя праблема жыцьця кожнага беларуса, і праблема экалёгіі, — будзе 26 красавіка Чарнобыльскі Шлях».**

**І гэта, бадай, сьветапоглядная памылка. Чарнобыльскія аргумэнты апазіцыі не спрацоўваюць. Лукашэнка Чарнобылю не ўзрываў і не прыхоўваў. Чарнобыльская тэма людзей не хвалюе. Мы ў 2004-м, а не ў 1990-м ці 96-м. Цяпер ясна, што, на шчасьце, наступствы Чарнобылю аказаліся не такімі страшнымі, як мы ўсе баяліся.**

**Сьвяткаваньню Дня Волі ўладам няма чаго проціпаставіць. Бо гэта не «маніфэстацыя супраць», а «маніфэстацыя за».**

**Барыс Тумар**




**Сябры незарэгістраванай арганізацыі «Зубр» давалі сёлета прысягу ля помніка цару беларускіх пушчаў. Рэпартаж з Баранавічаў — старонка 4.**

## Пробныя тэсты — сабаку

ВНУ Беларусі правялі першыя пробныя тэсты па беларускай літаратуры. Вынікі досыць пэсымістычныя. У Беларускім пэдагагічным унівэрсытэце імя Максіма Танка максымум балаў — 58 з сотні. А на пробным тэсьце па расейскай літаратуры вынікі даходзяць аж но да 91 балу. Тое ня дзівіць — да сёньня не зьявіўся зборнік тэставых заданьняў па беларускай літаратуры. А як абітурыенту адказаць, да прыкладу, на пытаньне пра перакладчыкаў «Слова пра паход Ігара», калі сярод іх названы і Максім Багдановіч? З аднаго боку, ён пераклаў кавалак «Слова», а зь іншага — не працаваў над усім творам, як іншыя названыя пісьменьнікі. Незразумела таксама, адносіць выданьне кніг Біbліі да Скарынавай літаратурнай дзейнасьці ці не...

**Сяргей Трафілаў**

## Прэмія імя Юхнаўца

Беларуская эміграцыя заснавала літаратурную прэмію імя Янкі Юхнаўца з мэтай ушанаваньня памяці выбітнага пісьменьніка-эмігранта ды спрыяньня разьвіцьцю літаратуры. Прэмію можна атрымаць за арыгінальны твор ці пераклад у якой заўгодна форме. Твор павінен быць нацыянальнай літаратурнай зьявай, моўнай зьявай, вольнай зьявай. Творы, напісаныя «наркамаўкай», да разгляду не прымаюцца.

Вызначаць ляўрэата будзе Прэміяльны камітэт, у які ўвайшлі паэт і бард Сяржук Сокалаў-Воюш (старшыня), крытык Андранік Антанян, супрацоўнік БІНіМу Лявон Юрэвіч, рэдактар газэты «Беларус» Марат Клакоцкі, стваральнік інтэрнэт-сайту «Беларуская палічка» Андрусь Жвір. Дасылаць творы на разгляд можна праз пошту (Kreceuski Foundation. 166-34 Gothic Drive, Jamaica, N.Y. 11432 USA) ці праз электронную пошту (premija@winterbrood.com). Прысуджэньне адбудзецца 3 лістапада — на дзень нараджэньня Юхнаўца.

**Аркадзь Шанскі**

## Першакрасавіцкія мяхі

МГА «Гісторыка» запрашае прыняць удзел у чарговым паседжаньні Клюбу па актуальных пытаньнях гісторыі на тэму «Дзесяць мяхоў беларускай гісторыі». Выступоўцы: Зьміцер Дзядзенка — супрацоўнік газэты «Наша Ніва», Усевалад Сьцебурака — гісторык і аўтар газэты. Чакаем вас 1 красавіка а 18-й у аўд.44 гістарычнага факультэту БДУ (вул.Чырвонаармейская, 9).

## ШТО Ў СЬВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Рублёвага саюзу ня будзе

Міністар фінансаў Расеі Аляксей Кудрын заявіў, што шанцаў на ўвядзеньне супольнае валюты Беларусі й Расеі з 2005 г. няма. Паводле Кудрына, прадстаўнікі ўраду Беларусі прапанавалі «не абмяркоўваць пытаньня».

### Пятае дзіця Юшчанкі




У Віктара Юшчанкі, лідэра ўкраінскіх нацыянал-дэмакратаў, нарадзіўся хлопчык. 50-гадовы Юшчанка цяпер мае двух сыноў і трох дачок. Старэйшаму сыну 23 гады. Меншанькі — трэцяе дзіця ад другога шлюбу, якім палітык пабраны з 47-гадовай амэрыканскай украінкай Кацярынай Чумачэнкай. Нараджала яна ў Вене.

### М'янма дэмакратызуецца?

17 траўня аднаўляецца праца Канстытуцыйнай канвэнцыі як першы крок на дарозе дэмакратызацыі, абвесьціла ў аўторак хунта, што кіруе краінай. Канвэнцыю распусьцілі ў 1996 г. М'янмай (яе раней называлі Бірма) кіруюць вайскоўцы. Цяпер вайскоўцы гатовыя запрасіць апазіцыю на чале з Су Чжы да ўдзелу ў Канвэнцыі.

### Палітычная кар'ера генэрала Шпака

Новым губэрнатарам Разанскай вобласьці Расеі стаў былы камандуючы дэсантнымі войскамі Георгі Шпак. Ён перамог на выбарах у нядзелю кандыдата ад «Адзінай Расеі», палкоўніка Службы замежнай выведкі. Шпак — беларус, родам з Асіповічаў, які ў 1991 г. выбраў не вяртаньне на бацькаўшчыну, а працяг кар'еры ў Расеі.

### Візы таньнеюць

З 1 траўня польскія візы для беларусаў, як і беларускія для палякаў, будуць каштаваць 12 даляраў (аднаразовая) і 18 (двухразовая). Аднаразовая віза пры тэрміновым афармленьні будзе каштаваць 22 даляры. Гэта палітычнае рашэньне.

### Па зроку

Штогод у Беларусі інвалідамі зроку становяцца паўтары тысячы чалавек, заявіў старшыня Беларускага таварыства інвалідаў па зроку Алег Шэпель. У БелТІЗ уваходзяць 20 тыс. інвалідаў.

### Рэкорд хуткасьці

У сем разоў хутчэй за гук, больш за 7600 км у гадзіну! Гэта скорасьць прататыпу X-43A, вестуна новай эры ў самалёта- і ракетабудаўніцтве, выпрабаваньні якога прайшлі над Ціхім акіянам. Самая рэвалюцыйная частка X-43A — гэта рухавік «скрэмджэт» (струменны звышгукавы). У ім няма турбін і рухомых частак. Паветра сьціскаецца выключна дзякуючы самой вялізнай хуткасьці і геамэтрыі самалёта. Са звышгукавой хуткасьцю пралятае яно праз камэру згараньня, дзе рэагуе з палівам, вадародам.

### Новыя хвалі «Свабоды»

З 28 сакавіка радыё «Свабода» перайшла на новыя частоты вяшчаньня. Цяпер перадачы можна чуць ад 6 да 8-й на частотах 6170 КГц (на хвалі 49 мэтраў) і 9635 КГц (31 м); з 18 да 20-й — на частотах 9565 КГц (31 м) і 15215 КГц (19 м); з 20 да 22 гадзіны — на частотах 7190 КГц (41 м) і 15480 КГц (19 м); з 22 да 24-й — на частотах 7115 КГц (41 м) і 9750 КГц (31 м). Частата на сярэдніх хвалях — 612 КГц.

**МБ; БелаПАН; gazeta.pl**

# Перамога геяў

## Ільля Крачына абараняў ня толькі гонар свайго сайту, але і сваё «я»




26 сакавіка ў судзе Першамайскага раёну Менску прайшоў першы ў Беларусі працэс: сайт геяў і лесьбіянак выступаў супраць інтэрнэт-правайдэра. Суд разглядаў пазоў адміністратара рэсурсу «Апагей» (www.apogay.com) Ільлі Крачыны да замежнага прадпрыемства «Red Graphic Systems». Крачына прасіў суд «абавязаць адказчыка аказаць паслугі, прадугледжаныя дамовай на паслугі хостынгу, і тэхнічную рэгістрацыю дамэнных імёнаў на ўмовах публічнай афэрты, а таксама спагнаць матэрыяльную кампэнсацыю нанесенае маральнае шкоды».

У студзені хостынгавая кампанія N1.BY, сузаснавальнікам якой зьяўляецца «Red Graphic», адмовіла парталу ў хостынг-паслугах, нягледзячы на папярэдне заключаную дамову. Рэсурс месяц не працаваў. Прадстаўнікі «Red Graphic» матывавалі сваю адмову тым, што партал парнаграфічны. Тады геі атрымалі заключэньне Рэспубліканскай экспэртнай камісіі па прадухіленьні прапаганды парнаграфіі, гвалту і жорсткасьці пра тое, што матэрыялы сайту ня ўтрымліваюць прыкметаў парнаграфіі. Сайт існуе з 1998 г. і прапануе навіны, а таксама бясплатныя паслугі: чат, службу знаёмстваў, электронную пошту. Партал уваходзіць у дзясятку самых наведвальных сайтаў Беларусі.

Заключэньне камісіі і стала важкім аргумэнтам у судзе. Паседжаньне скончылася «міравым пагадненьнем». Кампанія абавязалася выслаць ліст «Апагею» ды «заверыць у сваёй пазыцыі недыскрымінацыі», а таксама «забясьпечыць нармальны банэрны паказ у колькасьці 30 тыс. штук згодна з дамовай аб абмене банэрамі». А пазоўнік цалкам адмаўляецца ад сваіх патрабаваньняў.

І.Крачына лічыць такі вынік безумоўнай перамогай. Для яго гэта прынцыповы посьпех, бо ён скрозь сутыкаецца з адмовамі ў разьмяшчэньні банэраў. Дый у прыватным жыцьці беларускія геі маюць праблемы зь нецярпімым стаўленьнем да сябе. Варта аднаму мужчыну ўзяць другога на калені ў мэтро, наракае І.Крачына, і гэта ўжо правакуе акты агрэсіі.

Ён цешыцца, што пасьля працэсу кампанія «Экстмэдыя» прапанавала «Апагею» бясплатны сэрвэр і пошту на год, каб паказаць адкрытасьць і даступнасьць кожнага кліента. Між тым «Red Graphic» вырашае задачу — як выканаць міравое пагадненьне і не сапсаваць сабе рэпутацыі. Бо на думку некаторых мэнэджэраў кампаніі, банэры «Апагею» здольныя непрыемна зачапіць пачуцьці часткі партнэраў.

**АЛ; БелаПАН**

## ПРЫРОДА



### Медзьвядзі выйшлі зь бярлогаў

Практычна ўсе мядзьведзі ў пушчах Беларусі выйшлі зь зімовае сьпячкі, паведамілі ў НДІ заалёгіі Акадэміі навук Беларусі. У канцы сакавіка зьвяры пакідаюць свае бярлогі і пачынаюць шукаць корм. Пакуль ня вылезьлі вясновыя расьліны, мядзьведзі выконваюць функцыю санітараў лесу, бо харчуюцца пераважна тушамі загінулых парнакапытных. А засмачваюць мурашамі, каб папоўніць зрасходаваны за зіму запас вітамінаў.

У Беларусі цяпер жыве каля 150 мядзьведзяў.

**СМ; Інтэрфакс**

# Матрыца несьмяротная!

**Прызначэньне новага кіраўніка тэлебачаньня толькі выглядае нелягічна. Прызначэньне ідэоляга Ўладзімера Матвейчука кіраўніком Белтэлерадыё супала з гадавінай абвяшчэньня неабходнасьці стварыць дзяржаўную ідэалёгію. Галоўная ж «віна» Ягора Рыбакова палягала ў ягонай маладосьці, а значыць — патэнцыяле далейшага кар’ернага росту.**



PHOTO.BYMEDIA.NET

Адзін мой знаёмы прызнаўся, што нядаўна адкрыў для сябе беларускае тэлебачаньне. Па-першае, за час яго адсутнасьці ў краіне тэлеканалаў стала некалькі і пры жаданьні цяпер заўсёды можна пачуць у этэры нешта беларускае — ці мову, ці аповед пра якую-небудзь памятную мясьціну або помнік архітэктуры. У крайнім выпадку гэта будзе беларускі погляд на палітыку або грамадзтва. Прычым поглядаў таксама можа быць некалькі, нават на дзяржаўным узроўні.

Тэлевядучы, напрыклад, можа давадзіць, што ў Эўрапейскім Зьвязе жывецца кепска, а суседзі Беларусі пасьля далучэньня да гэтай арганізацыі будуць жыць яшчэ горш, як цяпер. А запрошаны госьць, наадварот, будзе даказваць, што горш, як у цяперашняй Расеі, жыць проста немагчыма. Хіба можна было ўявіць сабе такое на БТ гадоў пяць таму?

Цяпер маладыя вядучыя аднаго зь дзяржаўных тэлеканалаў у ранішняй перадачы (якую ня буду раскрываць з мэтаў канспірацыі) 25 сакавіка павіншавалі гледачоў са сьвятам. Зь якім сьвятам — яны не ўдакладнялі, бо гледачы ж усё самі разумеюць. Плюралізм дый годзе! Але, рызыкуючы расчараваць свайго знаёмца, хачу падзяліцца прагнозам, што з падобным «разгулам анархіі» ў этэры будзе хутка скончана. Менавіта такую задачу паставіў кіраўнік дзяржавы перад новапрызначаным старшынём тэлерадыёкампаніі.

На першы недасьведчаны погляд, прызначэньне на гэтую пасаду намесьніка дырэктара ТАА «Полацак-Шкловалакно» выглядае неяк не зусім лягічна. Праўда, яшчэ генэральны сакратар ЦК КПСС Леанід Брэжнеў любіў пры выпадку паўтараць сваім рэфэрэнтам: «Лёгікі — не шукайце!» Аднак і за брэжнеўскім часам была, і цяпер ёсьць у намэнклятурнай практыцы савецкага ўзору свая лёгіка. Толькі яна не заўсёды зразумелая шараговым грамадзянам.

Згодна з гэтай практыкай, рэктара інстытуту геадэзіі можна заўсёды кінуць на ўмацаваньне кадраў якой-небудзь плодаагароднінай базы, начальніка Генштабу паставіць адказным за культуру й турызм, а сьледчага па асабліва важных справах — зрабіць паслом у асабліва далікатных даручэньнях. Усе шрубкі намэнклятурнае сыстэмы ўзаемазамяняльныя. Галоўнае — ідэалягічная вытрымка.

Па-другое, паводле няпісанага закону аўтарытарнае ўлады, усіх, хто адкрыта дэманструе сваю адданасьць правіцелю і тым самым падкрэсьлівае ўласную значнасьць у вачох падначаленых ды іншых чыноўнікаў, набліжаных да першай асобы, чакае сумны фінал. Незаменных жа няма!

Галоўная «віна» былога старшыні Белтэлерадыё палягала ў ягонай маладосьці, а значыць — патэнцыяле далейшага кар’ернага росту. Прэзыдэнт таксама прыйшоў да ўлады даволі маладым. Але тое, што дазволена Юпітэру, не дазволена падначаленым.

Ну, і самае галоўнае — прызначэньне новага кіраўніка Белтэлерадыё супала з гадавінай абвяшчэньня неабходнасьці стварыць дзяржаўную ідэалёгію. Час прысьпеў паказаць, што ідэолягі ў нас ужо ёсьць. А заадно — прадэманстраваць, як будуць заахвочвацца чыноўнікі-кадравікі, якія прынялі новыя правілы гульні. Што да тэлебачаньня, дык правілы тыя зусім простыя: ня тое што кожная перадача, але кожнае слоўца напярэдадні восеньскіх выбараў павінна правярацца на прадмет ідэалягічнай вытрымкі. З адпаведнымі аргвысновамі.

Ёсьць і яшчэ адно меркаваньне. Прэзыдэнт суседняй дзяржавы ўразіў усіх, прызначыўшы на пасаду прэм’ера непрыкметнага чыноўніка з мэнэджэрскімі здольнасьцямі Фрадкова. Мяняць прэм’ера ў Беларусі пакуль неяк дачасна. Але, адпаведна духу часу, на пасаду кіраўніка галоўнага ідэалягічнага ведамства краіны прызначаны таксама мэнэджэр-кадравік. Задача перад мэнэджэрамі пастаўленая аднолькавая — сьлепа выконваць загады вышэйшай асобы.

Занепакоеных станам свабоды слова ды пэрспэктывай жахлівай інфармацыйнай блякады хачу крыху суцешыць. Нават калі спраўдзяцца пагрозы кіраўніцтва краіны адключыць усе расейскія тэлеканалы на тэрыторыі Беларусі, гэтага ніхто не заўважыць. Ужо цяпер няма, фактычна, ніводнай папулярнай тэлеперадачы ў расейскім этэры, якая ня мела б аналягу на беларускіх каналах, — пачынаючы ад «Кватэрнага пытаньня» і да «Свабоды слова» ўлучна. Асабліва гэта заўважна на прыкладзе т.зв. інфармацыйна-аналітычных праграмаў.

> Нават калі адключаць усе расейскія тэлеканалы, гэтага ніхто не заўважыць. Ужо цяпер няма ніводнай папулярнай тэлеперадачы ў расейскім этэры, якая ня мела б аналягу на беларускіх каналах. Татальнае папугайства беларускіх тэлерэпарцёраў не залежыць ад узросту.

Толькі праграма «Надоечы» паказала сюжэт пра тое, як расейская моладзь адрываецца на дыскатэках ад Масквы да сельскіх ускраінаў Расеі, як беларускі аналяг паказвае амаль такі самы сюжэт, дзе фонам грае тая самая музыка. І толькі здымкі ў тутэйшым вясковым клюбе, дзе хлопцы гавораць зь беларускім акцэнтам, выдаюць тэрытарыяльную прыналежнасьць аўтара сюжэту, які гаворыць па-расейску амаль тымі ж словамі, амаль з тымі ж інтанацыямі, што яго маскоўскія калегі. Так і хочацца сказаць: старэйшыя калегі. Але ж гэта будзе зусім ужо няпраўда: татальнае папугайства беларускіх тэлерэпарцёраў і вядучых не залежыць ад узросту. Дастаткова паглядзець хоць бы на камэнтатараў, якія выступаюць з рознага роду пастскрыптумамі.

Копія інфармацыйнае матрыцы пасьпяхова створаная і ў Беларусі. І калі ўявіць, што заўтра расейскае тэлерадыёвяшчаньне спыніцца, мы ўсё адно будзем глядзець тую ж папсу, тую ж рэкляму, тыя ж амэрыканскія фільмы, слухаць тыя ж песьні й развагі «на вечныя тэмы» на той самай расейскай мове. Хіба што на экранах, асабліва ўвечары, будзе менш зьнявечаных чалавечых целаў, крыві, проста няшчасных твараў. Ну і, вядома, на аднаго прэзыдэнта й прэм’ера таксама стане меней. Утопія збудзецца, і беларусы канчаткова пераселяцца ў віртуальны «горад Сонца», дзе замест сьвяціла заўсёды зьзяе блакітны экран.

**Віталь Тарас**

# У Лукашэнкі на хвасьце

## Сацыялягічнае апытаньне «Новака»: апазыцыя паціху здаганяе

26 лютага — 3 сакавіка сацыёлягі лябараторыі «Новак» правялі чарговае агульнанацыянальнае апытаньне. Высьвятляліся рэйтынгі апазыцыйных дзеячоў — прэтэндэнтаў у прэзыдэнцкі фатэль, папулярнасьць палітычных партыяў ды меркаваньне людзей пра адносіны паміж Беларусяй і Расеяй у кантэксьце апошняга газавага крызысу. Апытана 1107 рэспандэнтаў. Хібнасьць выбаркі складае 0,3.

Як паказала апытаньне, старшыня Аб’яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька, якога пракуратура вінаваціць у паклёпе на кіраўніка дзяржавы, — мае найбольшую пазытыўную вядомасьць сярод апазыцыйных палітыкаў.

Разам зь Лябедзькам у тройку самых вядомых уваходзяць лідэр ЛДПБ Сяргей Гайдукевіч, які мае фатальны нэгатыўны рэйтынг, і лідэр БНФ Вінцук Вячорка. Генэрал Валеры Фралоў застаецца малавядомым.

Цікава, што пры пастаноўцы пытаньня «Калі выбары прэзыдэнта будуць праходзіць у два туры і ў другі тур выйдзе адна з пазначаных ніжэй пар кандыдатаў, каго ў кожнай пары выбралі б асабіста Вы?» апазыцыйныя палітыкі зусім нязначна адстаюць ад Лукашэнкі. Гэта цалкам новая тэндэнцыя. Хоць летась сумарны рэйтынг апазыцыйных партыяў упершыню перавысіў прэзыдэнцкі, А.Лукашэнка ўсё яшчэ перамагае канкурэнтаў. Праўда, пераможны лік, асабліва проці Фралова ці Лябедзькі, ужо не такі «элегантны». Шкада, што сярод палітыкаў ня значыцца Ўладзімер Парфяновіч, каціроўкі якога на палітычным рынку ўздымаюцца.

**Працяг на старонцы 4.**

# Украіна перайшла на прапарцыйную

**25 сакавіка Вярхоўная Рада Ўкраіны прыняла новы закон «Аб выбарах народных дэпутатаў на прапарцыйнай аснове». Раней выбары праводзіліся паводле зьмяшанай, мажарытарна-прапарцыйнай, сыстэмы.**

Назіральнікі і экспэрты не сумняюцца: новы закон падпіша і прэзыдэнт Леанід Кучма. Кіраўнік Украіны ўжо публічна заявіў, што падтрымлівае выбары дэпутатаў на прапарцыйнай аснове. Гэты крок істотна павялічыць ролю партыяў у палітычным жыцьці Ўкраіны, паскорыць паўставаньне сярэдняй клясы, якая галасуе не за абяцанкі дэмагога, а за пэўны сьветапогляд, які ўвасабляе канкрэтная партыя. Закон — дзіця палітычнага кампрамісу. Ён быў прапанаваны дэпутатамі ад «Нашай Украіны» і Сацыялістычнай партыі. Закон прадугледжвае, што дэпутатаў у парлямэнт будуць абіраць паводле выбарчых сьпісаў ад партыяў і блёкаў у шматмандатнай агульнадзяржаўнай выбарчай акрузе. За кожнай партыяй ці блёкам вызнаецца права на прапарцыйны ўдзел ва ўчастковых камісіях.

Новы закон крытыкуюць за зьніжэньне «прахаднога бар’еру» з 4 да 3% галасоў выбаршчыкаў. Гэта фактычна размывае саму сутнасьць прапарцыйнага галасаваньня — палітычную структурызацыю грамадзтва, кажуць крытыкі. У парлямэнт змогуць трапляць малаўплывовыя «алігархічныя» партыі ды пазапартыйныя аб’яднаньні. Але, каб не зьмяншэньне працэнта, невядома, ці прайшоў бы закон. Ня ўсе дэпутаты, абраныя ад мажарытарных акругаў, былі ў захапленьні ад законапраекту.

Між тым «за» прагаласавалі 255 дэпутатаў, «супраць» — 4, устрымаліся — 2. Закон уступіць у сілу з 1 кастрычніка 2005 г. Так што выбары 2006 г. будуць ладзіцца ўжо ў адпаведнасьці зь ім.

Лідэр Сацыялістычнай партыі Ўкраіны Аляксандар Мароз перакананы: закон цалкам адпавядае эўрапейскім стандартам. «Швэдзкі выбарчы закон амаль такі самы, як і наш. Дакладней, ён больш дэмакратычны, ён дазваляе са сьпісу дэпутатаў выводзіць, замяняць іншымі, а пасьля пры пэўных нюансах вяртаць назад тых жа людзей. Я лічу, што гэта вельмі карысна. Тым больш што ў Швэцыі людзі жывуць у дабрабыце», — гаворыць А.Мароз.

Кіраўнік праўрадавай дэпутацкае групы «Дэмакратычныя ініцыятывы» Сьцяпан Гаўрыш ужо 30 сакавіка заявіў, што прыняты пяць дзён таму закон можа быць зьменены: «Ва ўсім сьвеце аналягічнай мадэльлю выбарчага прапарцыйнага закону карыстаюцца толькі чатыры маленькія краіны. Аднак гэта быў адзіна магчымы кампраміс. Наступны крок — пошук найбольш эфэктыўнае прапарцыйнае сыстэмы — альбо папросту з адкрытымі або нават з рэгіянальнымі адкрытымі сьпісамі, альбо зь іншай мадэльлю больш эфэктыўнага набліжэньня да выбаршчыка. Напрыклад, калі партыя вылучае сваіх сяброў па мажарытарных акругах».

**Глеб Хмяльніцкі**

# У Лукашэнкі на хвасьце

Працяг са старонкі 3.

Гэта што тычыцца прэзыдэнцтва. А вось свайго прадстаўніка ў парлямэнце беларускія выбаршчыкі па-ранейшаму жадалі б бачыць беспартыйным. Прага пераменаў застаецца вельмі неакрэсьленай і не асацыюецца з канкрэтнай палітычнай сілай.

Сярод партыяў найвышэйшы рэйтынг традыцыйна мае «Надзея» Валянціны Матусевіч. Аднак рэальнага эфэкту на выбарах гэта ніколі не давала. На другім месцы — АГП і нашумелыя лібэрал-дэмакраты.

## Гаспадар інфапрасторы

Апытаньне засьведчыла й узмацненьне ўплыву Беларускага тэлебачаньня. БТ і АНТ дамінуюць у беларускай інфармацыйнай прасторы, выціскаючы расейскія СМІ — яшчэ колькі гадоў таму безумоўных лідэраў.

Трэба адзначыць, што недзяржаўная прэса, нягледзячы на свае абрэзаныя наклады ды спартанскія ўмовы існаваньня, мае па-ранейшаму немалую аўдыторыю.

**Глеб Хмяльніцкі**

**Калі б бліжэйшым часам адбыліся ўсеагульныя выбары, за якую зь пералічаных ніжэй партыяў вы б прагаласавалі (%)?**

| | |
|---|---|
| Жаночая партыя «Надзея» (В.Матусевіч) | 7,7 |
| Аб’яднаная грамадзянская партыя (А.Лябедзька) | 5,5 |
| Лібэральна-дэмакратычная партыя (С.Гайдукевіч) | 5,0 |
| Беларуская сацыял-дэмакратычная грамада (С.Шушкевіч) | 3,5 |
| Партыя БНФ «Адраджэньне» (В.Вячорка) | 2,6 |
| Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя «Народная грамада» (М.Статкевіч) | 2,3 |
| Камуністычная партыя Беларусі (У.Захарчанка) | 2,3 |
| Беларуская партыя працы (Л.Лемяшонак) | 2,2 |
| Партыя камуністаў беларуская (С.Калякін) | 1,8 |
| Кансэрватыўна-хрысьціянская партыя БНФ (З.Пазьняк) | 0,5 |
| Іншая | 0,9 |
| Беспартыйны | 0,4 |
| Ніякі | 3,9 |
| Няма адказу | 17,4 |
| Цяжка адказаць | 44,3 |

**Калі выбары прэзыдэнта Беларусі будуць адбывацца ў два туры і ў другі тур выйдзе адна з указаных ніжэй параў кандыдатаў, каго ў кожнай пары выбралі б вы асабіста (%)?**

| | |
|---|---|
| В.Вячорка | 7,6 |
| А.Лукашэнка | 12,1 |
| Супраць абодвух | 11,1 |
| Ня ведаю/Цяжка адказаць | 69,2 |
| А.Вайтовіч | 3,2 |
| А.Лукашэнка | 9,1 |
| Супраць абодвух | 9,6 |
| Ня ведаю/Цяжка адказаць | 78,0 |
| С.Гайдукевіч | 9,7 |
| А.Лукашэнка | 18,5 |
| Супраць абодвух | 17,3 |
| Ня ведаю/Цяжка адказаць | 54,6 |
| А.Казулін | 3,9 |
| А.Лукашэнка | 7,5 |
| Супраць абодвух | 7,8 |
| Ня ведаю/Цяжка адказаць | 80,9 |
| П.Краўчанка | 5,9 |
| А.Лукашэнка | 7,8 |
| Супраць абодвух | 7,4 |
| Ня ведаю/Цяжка адказаць | 78,9 |
| А.Лябедзька | 10,3 |
| А.Лукашэнка | 12,1 |
| Супраць абодвух | 8,4 |
| Ня ведаю/Цяжка адказаць | 69,2 |
| М.Марыніч | 5,0 |
| А.Лукашэнка | 7,5 |
| Супраць абодвух | 7,6 |
| Ня ведаю/Цяжка адказаць | 80,0 |
| В.Фралоў | 6,8 |
| А.Лукашэнка | 8,1 |
| Супраць абодвух | 5,5 |
| Ня ведаю/Цяжка адказаць | 79,5 |

**Зь якіх крыніцаў вы атрымлівалі інфармацыю пра канфлікт, зьвязаны з пастаўкамі расейскга газу ў Беларусь (%)?**

| | |
|---|---|
| Зь беларускай дзяржаўнай прэсы | 19,3 |
| Зь беларускай недзяржаўнай прэсы | 8,1 |
| Зь перадачаў беларускага радыё | 33,7 |
| Зь перадачаў беларускай тэлевізіі | 81,1 |
| Зь перадачаў расейскай тэлевізіі | 64,9 |
| Зь перадачаў заходняга радыё | 3,9 |
| З размоваў з калегамі па працы, знаёмымі, сябрамі | 21,4 |
| Іншае | 2,6 |
| Ня ведаю/Цяжка адказаць | 0,6 |
| Адмова ад адказу | 0,5 |

**Калі б бліжэйшым часам адбыліся выбары ў палату прадстаўнікоў Беларусі, якога кандыдата вы б падтрымалі ў першую чаргу (%)?**

| | |
|---|---|
| Кандыдата — прыхільніка А.Лукашэнкі | 24,4 |
| Кандыдата — праціўніка А.Лукашэнкі | 13,3 |
| Нэўтральнага кандыдата | 40,8 |
| Ня ведаю/Цяжка адказаць | 18,3 |
| Адмова ад адказу | 3,2 |

**Калі б выбары прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі адбыліся ў найбліжэйшую нядзелю, за якога кандыдата з прыведзенага ніжэй сьпісу вы хутчэй за ўсё прагаласавалі б, а за якога — хутчэй за ўсе не прагаласавалі б (%)?**

| | Хутчэй прагаласую | Хутчэй не прагаласую | Ня ведаю такога |
|---|---|---|---|
| Вінцук Вячорка | 5,0 | 22,7 | 59,4 |
| Аляксандар Вайтовіч | 1,6 | 17,3 | 67,1 |
| Сяргей Гайдукевіч | 6,2 | 34,9 | 39,3 |
| Аляксандар Казулін | 2,7 | 12,2 | 72,4 |
| Пятро Краўчанка | 3,3 | 14,3 | 68,0 |
| Анатоль Лябедзька | 8,3 | 19,4 | 54,9 |
| Міхаіл Марыніч | 3,5 | 12,8 | 68,8 |
| Мікалай Статкевіч | 4,0 | 21,4 | 57,3 |
| Валер Фралоў | 4,9 | 11,5 | 70,3 |
| Аляксандар Ярашук | 1,2 | 12,7 | 75,6 |
| Ні за кога зь сьпісу | 38,6 | | |

# Прысяга «зуброў»

12 чалавек прынялі прысягу руху супраціву «Зубр» у нядзелю 28 сакавіка. Маладзёны з чатырох гарадоў — Менску, Баранавіч, Стоўпцаў і Бярозы — сабраліся на мяжы Менскай, Берасьцейскай і Гарадзенскай абласьцей, у сымбалічным месцы — каля вялізнай скульптуры зубра. Тутака на палянцы новаўзятыя «зубры» і далі клятву гонару й вернасьці.

Хоць месца прысягі захоўвалася ў сакрэце, без удзелу міліцыянтаў не абышлося. Сустрэча зь менскімі й стаўпецкімі «зубрамі» была прызначаная ў Гарадзеі. «Зубры» з Баранавіч дабіраліся «стопам», разьбіўшыся па два чалавекі. Аднак дзеля эканоміі часу толькі двое паехалі праз Гарадзею — астатнія скіраваліся проста на месца прызначэньня. У Гарадзеі быў затрыманы **Аляксей Ляўковіч**, ля берасьцейскай шашы — яшчэ некалькі «зуброўцаў». На аднаго зь іх, **Вадзіма Якушкіна,** склалі пратакол: за апаганьваньне помніка «надпісам, які ганьбуе прэзыдэнта». Як толькі ўся калёна дайшла да месца, хлапца адпусьцілі.

На гэтым сустрэчы з праваахоўнымі органамі ня скончыліся. Каля самога зубра чакалі ўжо баранавіцкія міліцыянты. Падышоўшы да маладзёнаў, адзін зь іх «па-бацькоўску» папярэдзіў пра тое, чаго нельга рабіць. Але нікуды зьяжджаць яны не зьбіраліся: сачылі здалёк.

У другі раз той жа «бацька» падышоў, калі над галовамі ўзьняліся два сьцягі: бел-чырвона-белы й «зуброўскі». Бел-чырвона-белы «адстаяць» удалося (гістарычная сымболіка), а «зуброўскі» прыйшлося схаваць.

Калі прагучаў гімн «Магутны Божа», прысягалі менскія «зубры». Працягнулі баранавіцкія, затым бярозаўскія. У іх, дарэчы, прысягу прымаў Мікіта Сасім. Усе «навабранцы» атрымалі фірмовыя «зуброўскія» значкі.

Пасьля прысягі каардынатар арганізацыі **Яўген Афнагель** быў затрыманы за «арганізацыю несанкцыяванага мітынгу». Але гэта яго ня моцна засмуціла. Раней «Зуброўская» прысяга ладзілася раз на год, — кажа Я.Афнагель. — Але цяпер гэта будзе рабіцца часьцей, бо ахвотных шмат».

**Агата Ступакова, Баранавічы**

## ХРОНІКА АПАЗЫЦЫІ

На старшыню Слонімскай арганізацыі БНФ **Івана Бедку** міліцыянты склалі два пратаколы — за мітынг 21 сакавіка і выкарыстаньне на ім незарэгістраванай сымболікі. Вышэйшы гаспадарчы суд 23 сакавіка адхіліў пазоў **«Белорусской деловой газеты»** да Мінінфармацыі: журналісты спрабавалі аспрэчыць папярэджаньне, вынесенае газэце 30 студзеня за артыкул Ірыны Макавецкай «Віконт» не ўпісаўся ў беларускую рэчаіснасьць». Цяпер у «БДГ» тры папярэджаньні. Намесьніца старшыні ПКБ **Алена Скрыган**, старшыня Партыі БНФ **Вінцук Вячорка** і сябра АГП **Анатоль Паўлаў** былі затрыманыя 23 сакавіка ў Слоніме: яны прыехалі на сустрэчу з выбарцамі на запрашэньне дэпутата мясцовага савету Івана Шэгі. Затрыманых пратрымалі ў РУУСе 2,5 гадзіны і паабяцалі скласьці пратакол паводле арт.167 КаАП (парушэньне парадку й арганізацыі мітынгаў і сходаў). На Дзень Волі ў Менску затрымалі старшыню зачыненага праваабарончага цэнтру «Вясна» **Алеся Бяляцкага** (яго зьбілі з ног, цягнулі па зямлі), юрыста «Вясны» **Валянціна Стэфановіча**, **Вінцука Вячорку**, старшыню менскай гарадзкой арганізацыі БНФ **Уладзімера Кішкурну**, **Валянціна Мацкевіча**, намесьніка старшыні менскай гарадзкой арганізацыі АГП **Андрэя Козела** (быў зьбіты пры затрыманьні), **Рыгора Кійка**, **Яўгена Скочку**, **Алега Гнедчыка**. У той самы дзень **Вячаслаў Сіўчык**, **Дзяніс Буйніцкі**, **Валянцін Баранаў** з плякатамі «Жыве БНР», «Жыве незалежная Беларусь» і «Беларусы маюць права абіраць уладу» прыкулі сябе ланцугамі да ліхтарных слупоў на Кастрычніцкай плошчы. Іх раскулі і 26 сакавіка ў Цэнтральным судзе Менску асудзілі: В.Баранава і Дз.Буйніцкага — на 20 базавых адзінак (350 тыс.руб.), В.Сіўчыка — на 50 б.а. (875 тыс.руб.). У Менску на вуліцы Каліноўскага незарэгістраваная арганізацыя **«Правы альянс»** спрабавала аднавіць памятную дошку ў гонар Каліноўскага, калісьці скрадзеную. Амапаўцы і супрацоўнікі ў цывільным канфіскавалі шыльду. 25 сакавіка судовы выканаўца Бярозаўскага раённага суду апісаў маёмасьць журналісткі рэгіянальнай «Газеты для вас» **Тамары Шчапёткінай**. У Салігорску 25 сакавіка міліцыя затрымала 7 удзельнікаў сьвяткаваньня Дня Волі, 26 сакавіка адбыліся суды: актывіст ПБНФ **Зьміцер Тычына** і старшыня гарадзкой арганізацыі КХП-БНФ Алег Борын аштрафаваныя на 20 б.а., актывіст ПБНФ **Андрэй Лапановіч** — на 25 б.а., навучэнка тэхнікуму **Вольга Курловіч** і інвалід **Ігар Хаменка** дасталі судовыя папярэджаньні, актывіст ПБНФ **Ігар Казакоў** і актывіст АГП **Андрэй Нагорны**, якія адмовіліся прызнаць сваю віну, атрымалі па 100 б.а. штрафу кожны. Арганізатары мітынгу **Натальля Зубарэвіч**, **Марыя Волчак**, **Ларыса Алешка** і старшыня аргкамітэту мітынгу **Аляксей Прыходзька** былі абвешчаныя ў вышук і затрыманыя 29 сакавіка. 25 сакавіка судовая калегія па грамадзянскіх справах Берасьцейскага абласнога суду не задаволіла скаргі кіраўніцы гарадзкой арганізацыі БНФ **Ніны Давыдоўскай**, аштрафаванай за распаўсюд улётак-віншаваньняў зь Міжнародным днём правоў чалавека (10 сьнежня 2003 г.), 26 сакавіка жанчыну зьбіў аўтамабіль з бруднымі нумарамі. У самім Берасьці на мітынгу 27 сакавіка была затрыманая намесьніца старшыні абласной арганізацыі АГП **Алеся Пукала** — за распаўсюд інфармацыйных матэрыялаў кааліцыі «Пяцёрка плюс». Неўзабаве яе адпусьцілі. Старшыню суполкі Свабоднага прафсаюзу Полацкай ЦЭЦ **Алега Шайтара** 26 сакавіка звольнілі з працы. Савецкі суд Менску апраўдаў Уладзімера Ліхадзеева, які ў кастрычніку 2003 г. зьбіў праваабаронцу **Алега Воўчака**: судзьдзя Сяргей Сікліцкі палічыў Воўчака ініцыятарам бойкі, пацярпелы мае намер абскарджваць прысуд. Актывіста «Маладога фронту» **Зьмітра Дашкевіча** 29 сакавіка затрымалі на памежным пераходзе «Каменны Лог» на беларуска-літоўскай мяжы. Беларускія мытнікі пратрымалі яго тры гадзіны, канфіскаваўшы агітацыйныя матэрыялы «Маладога фронту». 29 сакавіка **А.Бяляцкага** выклікалі ў пракуратуру: пракурор Новікаў цікавіўся ягонай дзейнасьцю ў грамадзкіх арганізацыях і замежнымі паездкамі. Дэпутат Жлобінскага раённага Савету, кіраўнік раённай арганізацыі АГП **Марат Афанасьеў** падаў у суд на адміністрацыю Беларускага мэталюргічнага заводу. За грамадзкую дзейнасьць яго пазбавілі прэміяў за люты і сакавік, абвесьцілі вымову і з 20 траўня звальняюць з працы ў сувязі з скарачэньнем.

**АШ**




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Нэўтралітэт не дапаможа

VII Менскі форум паставіў рэкорд прадстаўнічасьці: 400 удзельнікаў. Форум зь беларуска-нямецкага ператварыўся ў трохбаковы «Нямеччына—Польшча—Беларусь» і меў падзагаловак «Новае суседзтва пасьля пашырэньня Эўразьвязу».

Упершыню за шэсьць гадоў сустрэчу наведалі прадстаўнікі ўраду. Гэта быў не міністар Мартынаў, а ягоны намесьнік. «Мы зьбольшага расцэньваем працэс пашырэньня Эўразьвязу як пазытыўны», — сказаў на палітычнай сэкцыі форуму Аляксандар Міхневіч. Ён асабліва падкрэсьліў ролю беларускай дзяржавы ў справе спыненьня наркатрафіку й нелегальнай міграцыі ў Эўропу. Выступ меў адценьне самарэклямы Беларусі: маўляў, падтрымайце нас, незаменных, матэрыяльна.

Іншы прадстаўнік афіцыйнага боку, прафэсар Уладзімер Улаховіч з Цэнтру міжнародных дасьледаваньняў БДУ, заявіў: «Ідэі так званага санітарнага кардону з Турцыі, Украіны, Малдовы ды Беларусі — гэта ізаляцыянісцкі падыход. Ён абсалютна непрымальны. Хутчэй трэба прыняць за аснову рэгіянальную канцэпцыю «ўсходняга вымярэньня», якая прапанавана Польшчай».

Намесьнік старшыні БНФ Юры Хадыка выказваў незадаволенасьць іншым: зь дзевяці мільёнаў эўра дапамогі новым суседзям толькі 7% ідзе на Беларусь. Гэта прыкладна 5 цэнтаў на кожнага беларуса. «Памажыце Беларусі стаць нэўтральнай», — заклікаў Ю.Хадыка. «Расея зацікаўленая ў Беларусі як сатэліце, а з гэтага вынікае — у слабой Беларусі», — засьцерагаў Станіслаў Шушкевіч.

Аднак Эўразьвяз не гатовы браць на сябе функцыі адваката беларускай апазыцыі. Як сказаў дырэктар усходнеэўрапейскіх праграмаў Нямецкае рады замежнае палітыкі Аляксандар Рар у інтэрвію «Белорусской деловой газете», «а чаму Эўропа павінна выступаць за зьмену ўлады ў Беларусі? Эўразьвяз ня можа зрабіць таго, што патрабуе ад яго беларуская апазыцыя».

Яшчэ адна дэталь шматзначна прагучала ў выступе пасла Францыі Стэфана Шмялеўскага, які прадстаўляў Эўразьвяз: «З 1 траўня новымі суседзямі Эўразьвязу стануць Беларусь, Украіна, Малдова і Калінінградзкая вобласьць Расеі». Не Расея, а менавіта Калінінградзкі анклаў разглядаецца як новы сусед.

**«Час прымушае сьпяшацца. Беларусь мусіць прымаць рашэньне. Думаю, нэўтралітэт ёй не дапаможа. Глябалізацыя патрабуе свайго. Ня думаю, што Захад у асобе ЗША і Эўразьвязу цяпер быў бы зацікаўлены ў тым, каб Беларусь аб'ядналася з Расеяй. Ня думаю, што Захад верыць у тое, што пуцінская Расея, якая пайшла аўтарытарным шляхам пасьля думскіх выбараў, здольная пазытыўна паўплываць на дэмакратызацыю Беларусі, як гэта лічылася яшчэ год таму. Я думаю, што Захад ставіць Беларусь перад выбарам, тлумачачы ягонаму кіраўніцтву, што працэс, які па-ангельску называецца «wider Europe», гэта вельмі сур'ёзны працэс», — заявіў палітоляг Аляксандар Рар на «Менскім форуме».**

У працоўнай групе па эканамічнай супрацы ЭЗ і Беларусі гаварылі больш пра гандаль. Канстатавалася, што пасьля 1 траўня Беларусь вымушана скароціць экспарт сельгаспрадукцыі, хіміі. Пашырэньне Эўразьвязу нясе аўтаматычную дэнансацыю шматлікіх двухбаковых пагадненьняў з краінамі-кандыдаткамі. Будуць практычна спыненыя пастаўкі ў Цэнтральную Эўропу машынатэхнічнай і прыладабудаўнічай прадукцыі — у сувязі зь неадпаведнасьцю стандартам экалёгіі ды бясьпекі, прынятым у ЭЗ.

Самай нешматлікай працоўнай групай была тая, што абмяркоўвала гісторыю, традыцыі, мову, адукацыю, культуру. Яна была адзінай, дзе адной з працоўных моваў была беларуская. Аднак гэтая адсутнасьць беларускай мовы ў астатніх сэкцыях падавалася выпадковай і часовай, да зьмены палітычнага клімату.

Карысьць такіх канфэрэнцыяў відавочная. Яна ня толькі ў кантактах Беларусь—Захад, але і ў дыскусіях Беларусь—Беларусь, між афіцыйнай ды неафіцыйнай Беларусяй, што адбываюцца ў межах такіх вось форумаў. Бо «чыноўнікі нават нізкіх рангаў не прыходзяць на такія канфэрэнцыі бяз санкцыі чыноўнікаў самага высокага рангу», — адзначыў Мечыслаў Грыб. У параўнаньні зь мінулымі форумамі прадстаўнікоў афіцыйных структураў на гэтым значна паболела, а незалежнага грамадзтва — паменела.

**Зьміцер Данскі, Мікола Бугай**

# Вобраз краіны

Пасьля ліквідацыі аўтарытарнага рэжыму адбудзецца другі «выхад Беларусі з СССР». Ад далучэньня Беларусі да Паўночнаатлянтычнага альянсу шок будзе ня меншы, чым ад развалу Савецкага Саюзу. Аднак альтэрнатыва NATO — страта незалежнасьці і нябыт.

Ці ёсьць для Беларусі месца ў клюбе яе новых эўрапейскіх суседак? Для такой, як сёньня, — няма. Краіна зь недаробленым уласным вобразам выглядае не як краіна, а як тэрыторыя з насельніцтвам, што жыве ў «іншым вымярэньні». Незразумелая, не такая, як усе, пазбаўленая звычайных матывацыяў быць. Вобраз краіны — гэта і ёсьць галоўная матывацыя і зразумелае ў вачох сьвету права на існаваньне самастойнае дзяржавы.

З падачы цяперашняе ўлады нашы людзі сапраўды жывуць у нерэальным сьвеце, у якім канкрэтнае (скажам, правы чалавека) успрымаецца як абстракцыя, а абстракцыя (скажам, дысцыпліна і парадак) — як самая што ні ёсьць рэальнасьць. У выніку мы кожнага разу пачынаем няўцямна лыпаць вачыма, ня могучы зразумець, як гэта разваліўся Савецкі Саюз, як гэта нашы суседзі паўступалі ў NATO, як усё гэта ў прынцыпе магчыма? Рэальны сьвет увесь час абводзіць нас з нашымі фантазіямі вакол пальца.

Пасьля ліквідацыі аўтарытарнага рэжыму адбудзецца другі «выхад Беларусі з СССР» — ня менш фантастычны, чым першы. Асабліва зьдзівяцца многія далучэньню Беларусі да Паўночнаатлянтычнага альянсу. Шок будзе ня меншы, чым ад развалу Савецкага Саюзу. І таму варта ўжо цяпер спакойна ўсьвядоміць, што альтэрнатыва NATO — страта незалежнасьці і нябыт. Праўда, усякая рэальнасьць, якой бы фантастычнай яна нам ні ўяўлялася, гэта ўсё ж рэальнасьць. А што было б нерэальным, дык гэта каманды афіцэраў беларускіх натаўскіх падразьдзяленьняў, аддаваныя па-расейску.

Беларуская мова і культура, як абсалютна рэальны ў вачох усяго сьвету атрыбут дзяржаўнасьці і сэгмэнт палітыкі, у нас — абстракцыя і апазыцыянізм. Па вялікім рахунку, гэта і ёсьць галоўная прыкмета дэмакратычнай апазыцыі, галоўнае, што вонкава адрозьнівае яе ад рэжыму.

Уявіце сабе, што гэтыя 10 гадоў Лукашэнка кіруе пад Пагоняй і бел-чырвона-белым сьцягам, а дэкрэты піша клясычным правапісам. Што б мы атрымалі? Дыскрэдытацыю самой нацыянальнай ідэі? Ці свайго Туркмэнбашы, у якога, дзякуючы апоры на вечнае (нацыянальная ідэя) і на АМАП, ёсьць пэрспэктыва пажыцьцёвага сядзеньня? Трэці варыянт — «эвалюцыя самога Лукашэнкі» — нерэалістычны. Чаму ён і ня мог прыняць мовы, гербу і сьцяга, прапанаваўшы Беларусі свае рэфэрэндумы — «трэці шлях у трэці сьвет» — пераходны пэрыяд.

Лукашэнка ня мае і ня можа мець той культурнай кампанэнты ў сваёй палітыцы, якая стала вырашальнай для перамен у постсавецкіх краінах, што ўжо адной нагой стаяць у Эўразьвязе. Але трэба заўважыць, што ў нас, імкнучыся адпавядаць аўтарытарнаму кіраўніку, часьцяком адмаўляюцца ад гэтай кампанэнты і дэмакратычныя сілы. Нібыта каб гучаць з кіраўніком на адной ноце, гаварыць на адной мове. Але насамрэч якраз свая мова і нацыянальная ідэя ў Беларусі — гэта тая палітычная кампанэнта, якой у рэжыму няма, на якую ён кульгае і на якую ён слабы. Тым часам нават калі б мы не хацелі ісьці шляхам Польшчы, Літвы або Чэхіі, нас усё адно вынесе на гэты шлях, нас ужо нясе туды. І адзіная альтэрнатыва гэтаму — гвалтоўнае ўсмоктваньне Беларусі ў расейскую арбіту, у «іншае вымярэньне», у перакулены сьвет, дзе жывуць «бедна, але горда» (з чаго б гэта?).

Нацыянальная ідэя ўяўляецца абстрактнай і для многіх недзяржаўных СМІ. Што наўзамен? Толькі рацыя гэтага моманту і цьмяная відзежа будучыні. А ў выніку газэты ды інтэрнэт-парталы самі не заўважаюць, як прыпадабняюцца да афіцыёзных выданьняў манерай думаньня і пісьма. Пішуць, да прыкладу, у календарах пра героя Сусаніна, замучанага «літоўскімі інтэрвэнтамі» з той самай дыспазыцыяй да беларушчыны, як «Саўбелія» ўмудраецца 25 сакавіка не згадаць пра гістарычную дату. Недаацэньваньне такіх «дробязяў» зусім немагчыма ўявіць сабе дзе-небудзь у Чэхіі ці, калі хочаце, у Расеі. Я ўжо не кажу пра недаацэньваньне мовы. У выніку яно абярнаецца аслабленьнем дэмакратычных сілаў, якім заўтра трэба будзе браць у свае рукі лёс краіны.

Не разумеючы і не прымаючы культурнай кампанэнты палітыкі, аўтарытарны рэжым зацята няславіць «нацыяналізм» і знаходзіць водгук у сэрцах часткі публікі і часткі дэмсілаў. Але, па-першае, Беларусь як незалежная краіна яшчэ не сфармавала свайго новага дэмакратычнага аблічча, па-другое, калі нацыяналізм і прысутнічае ў нашым дэмакратычным лягеры, дык стакроць больш зашуганы і невыразны, чым ва ўладных структурах любой разьвітай краіны Эўропы. Мы гаворым усяго толькі аб праве на сваю мову і сваё бачаньне ўласнай гісторыі — вось і ўвесь наш нацыяналізм, настолькі ж небясьпечны, як скрадзеныя сталінскім часам каляскі, за якія калгасьнік атрымліваў таўро «вораг народу»...

Гісторыі не перапішаш. У тым ліку гісторыі рэфэрэндумаў, на якіх мова была адрынутая ў адным пакеце з падзелам улады і каштоўнасьцямі дэмакратыі. Затое гісторыя любіць рана ці позна ўсё расстаўляць на свае месцы. І ўжо цяпер ясна, што менавіта сёньняшняя дэмакратычная апазыцыя будзе фармаваць заўтрашнюю палітычную сыстэму ў краіне, вяртаючы Беларусь на цывілізаваны шлях. А гэта значыць, што апазыцыя мусіць прыходзіць на зьмену аўтарытарызму не на Лукашэнкавай ноце, на якой можна сьпяваць толькі падобныя песьні пераходнага пэрыяду і трэцяга сьвету. Зь іншага боку, з прыходам да ўлады апазыцыі бяз мовы і нацыянальнай ідэі мы атрымаем не Беларусь на шляху ў Эўропу, а хаос і, як вынік, гаспадараньне тут новых крамлёўскіх дэсантаў ды архангельскі АМАП на вуліцах беларускіх гарадоў.

**Сяргей Дубавец**

# Арыстакраты духу

Усё пачынаецца з «адзёжкі».

Неачэсанасьць (кепскія манеры, кепскае вымаўленьне, «калгасны стыль») стала прыкметаю ўлады, якая дыктуе грамадзтву нізкі чалавечы стандарт. Ці павернецца язык назваць А.Лукашэнку, ягоную «каманду» і ягоных вэртыкальнікаў людзьмі інтэлігентнымі або культурнымі? Рытарычнае пытаньне. Запанібрацтва — вось гэты кшталт, які прапануецца публіцы, пачынаючы ад безгустоўнай сымболікі і сканчаючы забойчай трасянкай з «мысьлямі» пра беларускі язык і паэзію Быкава. Праз іх гэтак выглядаем усе мы. Мы проста па-чалавечаму кепска выглядаем як нацыя сярод суседзяў на майдане геапалітычных жарсьцяў. Мы выглядаем непажаданымі, а таму — пасабленымі, і з намі (з нашай незалежнасьцю) ня маюць ахвоты лічыцца. У гэтым — першая перадумова страты незалежнасьці.

Хто можа тут супрацьстаяць? Толькі тая частка грамадзтва, якая цэніць выхаванасьць і адукаванасьць, прыстойнасьць і чалавечую годнасьць. Назавём гэтых людзей арыстакратамі духу. Даступна кожнаму, хто ўжо толькі разумее, што гэта такое.

Публіка ў любой краіне глядзіць на незалежнасьць як на штосьці, веларгодна, важнае, але абстрактнае. У руку ня возьмеш, як хлеб з маслам. Дзяржаўны апарат хоць і мае справу з рэаліямі незалежнасьці — меціць сваю тэрыторыю, вядзе гаспадарку краіны, але і ён ня ведае абстрактнае каштоўнасьці. Абстрактную, або духоўную каштоўнасьць ведае інтэлігенцыя. Па вялікім рахунку, на ёй і трымаецца незалежнасьць. І так ва ўсім сьвеце. Менавіта інтэлігенцыя, як апошні тылавы эшалён, падымае народ на абарону незалежнасьці, калі тая апынаецца пад пагрозай. Дзяржава мабілізуе, арганізуе і пасылае. Але ўсьведамленьне патрэбы гэтай мабілізацыі дае людзям інтэлігенцыя.

У Беларусі, дзе адбылася ўзурпацыя ўлады адным чалавекам, такі спрадвечны і паўсюдны парадак зламаны. Сканцэнтраваўшы ў сваіх руках увесь адміністрацыйны рэсурс, гэты чалавек распасьцёр свае прэтэнзіі і на тую ролю, якую ў краіне мусіць адыгрываць арыстакратыя духу. Ён захацеў усёй улады, у тым ліку і мэтафізычнай. На нейкі час яму сапраўды ўдалося паралізаваць волю тых, хто ведае абстрактную каштоўнасьць незалежнасьці. Але сам ён, паводле прыроды свае адміністрацыйнае ўлады, выконваць такую ролю ня можа. Ён ані духоўны лідэр, ані культурны герой. Ён — дырэктар.

Што адбылося? Незалежнасьць Беларусі ператварылася ў залатую манэтку ў кішэні Лукашэнкі. Хачу куплю за яе што-небудзь, хачу не куплю, хачу пагандлююся, а захачу — выкіну на пагоду. Публіка ўсё прыме за належнае, бо ніхто ёй ня скажа, чаго насамрэч каштуе мая залатая манэтка.

Нібы хлопчык, які знайшоў грош, Лукашэнка раўніва аберагае сваю ўласнасьць. Яго аж скручвае, калі пра Беларусь загаворвае з адказнасьцю хтосьці апроч яго. Ён зараз жа імкнецца стаптаць любы агмянёк — ці то Беларускі Ліцэй, ці памяць Васіля Быкава. Ён не разумее, што духовая роля — зусім не ягоная і што ён яе ніколі ня выканае. Але ён у прынцыпе не разумее, што можа быць нейкі падзел роляў у ягоным саўгасе, дзе ён — дырэктар. Ніхто ня можа прэтэндаваць на маю манэтку!

Размовы пра «зьмякчэньне» або «беларусізацыю» рэжыму, пра тое, што Лукашэнка выме кляп з роту інтэлігенцыі, — пазбаўленыя сэнсу. Ён сапраўды хутчэй скруціць сабе галаву ў перахітрываньнях з Пуціным. І спадзевы на ўдзел інтэлігенцыі ў Лукашэнкавых гульнях — марныя. Інтэлігенцыя ніколі ня будзе запатрабаваная ім, асабліва што да ўдзелу ў гарантыях незалежнасьці.

> У адрозьненьне ад Расеі, Беларусь ня ведала свайго ўласнага абсалютызму. Лукашэнка тут — першы. Моцная ўлада аднаго над усімі — наш досьвед, але ня наш шлях.

Але ён бясьсільны забараніць інтэлігенцыі ўдзельнічаць у гэтых гарантыях самой. Як бясьсільны адабраць у мяне маю асабістую адказнасьць за маю краіну.

Калі на ўсходзе і захадзе нашых людзей бачаць ня толькі як пасланцоў «апошняга дыктатара Эўропы», што ўручаюць даверчыя граматы са словамі «эт самае...», а ўмеюць падтрымаць гаворку на роўных, адпаведна і іншае ўяўленьне фармуецца пра народ ды краіну, якія вартыя сваёй незалежнасьці, бо разумеюць, што гэта і навошта.

Цалкам зьнішчыць (зьнівэляваць) духоўную арыстакратыю, інтэлігенцыю Лукашэнка ня здолеў, бо гэта ў прынцыпе немагчыма, а чым некалі пераканаўся і Сталін. Хіба толькі на час здалося, што Лукашэнка зьнішчыў (зьнівэляваў) грамадзкую іерархію. Хамства ва ўладзе расквітнела на галоўным тэлеэкране краіны, калі галоўны герой гэтага экрану тыкаў паважаным і пажылым людзям. Здалося, што ў краіне ўвогуле няма паважаных людзей — усе гаўнюкі, у тым ліку і любімы народам сукін сын прэзыдэнт. Усе — запанібрата. Калі ж няма паважаных людзей, няма і паважаных думак, да якіх людзі прыслухоўваюцца. Увесь працэс спыняецца.

Але гэта было надоўгае зацьменьне. Прыродная схільнасьць да прыстойнасьці ўзяла сваё.

Другая перадумова страты незалежнасьці — ліквідацыя падзелу ўлады.

Паспрабуйце ўявіць сабе, што Лукашэнка зь нейкай прычыны кудысьці зьнік. Што будзе ў краіне? Хаос і бязвольныя апэляцыі да Расеі — каб навяла парадак. Ці ўсё ж падыме голас «палатка»? Ці, можа быць, суд? Ці армія? Ці КДБ? Хто тут ямчэ рэальная ўлада? Ніхто.

Але хто можа гэтаму супрацьстаяць?

Тут варта зьвярнуцца да тэмы парлямэнцкіх выбараў — байкоту ці ўдзелу. На маю думку, гэтыя выбары шматкроць важнейшыя, чым прэзыдэнцкія, бо менавіта праз удзел у іх фармуецца тая самая, зьнішчаная ўзурпатарам палітычная сыстэма краіны (ня важна, што яна ў апазыцыі). Тады як прэзыдэнцкія выбары — гэта зноў пытаньне аднаго правіцеля — таго ці новага. Прэзыдэнцкія выбары не здымаюць праблемы абсалютызму ўлады, а толькі адкладаюць яе вырашэньне на наступныя гады. На зьмену ўзурпацыі мусіць прыйсьці сыстэма.

Беларусь у гісторыі ня ведала свайго ўласнага абсалютызму. Лукашэнка тут — першы. Нават за савецкім часам у нас дырэктар заводу або прафэсар «важыў» нашмат больш за цяперашняга кішэннага прэм'ера. Напэўна, досьвед свайго ўласнага абсалютызму карысны, як і ўсякі досьвед. Але хіба яго не дастаткова?

Заклік да байкоту прапануе адкласьці ўсё да прэзыдэнцкіх выбараў. Гэта значыць спыніць фармаваньне палітычнае сыстэмы заўтрашняе Беларусі. Чакаць цуду, другога прышэсьця ці нейкага выбуху. Зноў чагосьці чакаць?

Байкот эфэктыўны, калі ўсе разам, калі ў грамадзтве моцнае жаданьне перамен, калі ёсьць пэрспэктыва народнага паўстаньня. Але гэтага няма. А ўсё, што ёсьць, — гэта актыўнасьць людзей, гэта рух і кантакты, гэта гуртаваньне. Нават калі пяць чалавек прарываюцца ў той эфэмэрны парлямэнт, нават калі ніводнага (як цяпер), нехта ж усё адно бярэ на сябе ролю «парушальніка спакою». Гэта прырода прабіваецца, як трава праз асфальт.

Пазьняк не дае тактыкі байкоту — ён патрабуе толькі веры ў сябе. Але мы зьняверaныя ў цудах людзі. Доўгае і бясплённае чаканьне цуду зьняверыла нас і пакінула адну надзею на ўласныя дробныя крокі. Крок ступіў — маеш, рухаешся. Урэшце перажывём мы гэтага Лукашэнку, і тады спатрэбіцца пачынаць нармальнае парлямэнцкае жыцьцё — з партыйнымі выбарамі і падзелам улады. І сёньняшнія партыі, якімі б яны ні былі, — яны будуць гэта рабіць, іншых няма.

> Байкот ці не байкот... Гэта пытаньне палітычнага выбару паміж партызанкай і парлямэнтарызмам. Ці ты за эфэмэрны парлямэнт, ці за эфэмэрную рэвалюцыю.

Кажуць, ісьці на выбары — легітымізаваць палатку... Але, можа, яе якраз і трэба легітымізаваць. Бо тым самым мы ствараем прэцэдэнт ці хоць бы намёк, від на падзел улады ў краіне — тую форму, якая непазьбежна напоўніцца рэальным зьместам. Ці нехта яшчэ думае, што калі «прыйдуць нашы», яны адновяць у правах ВС 13-га скліканьня і выпішуць з ЗША «дзядзьку Сымона»?

Нелегітымнасьць «палаткі» была козырам менавіта ў ягоных руках. Але гэта пройдзеная гісторыя. Сёньня такая нелегітымнасьць толькі на руку ўзурпатару, бо дае яму магчымасьць лішні раз прынізіць парлямэнт і выкрасьліць яго са сьпісу гарантаў незалежнасьці. Не дзяліцца манэткай. На руку і суседу заграбушчаму, які, кажуць, Лукашэнку ставіць і здымае, не зважаючы на парлямэнт, тым больш што той нелегітымны.

Лукашэнка — ня Сталін і ня Кастра, а Беларусь — не імпэрыя зла і ня выспа свабоды, каб такая сытуацыя магла цягнуцца доўга. Але мяркуючы з прафанацыі нашага палітычнага краявіду, яна зьменіцца не на вуліцы, а ў кабінэтах. Не грамадзянская пазыцыя кагосьці з чытачоў гэтага тэксту прывядзе да перамен. Але менавіта ў рабленьні перамен, у іх падрыхтоўцы выявіцца грамадзянская пазыцыя. Адсюль мусіць прыйсьці заўтрашняя палітычная сыстэма, а не з Масквы і ня з штабу КБВА.

Для гэтага патрэбныя партыі. Яны захоўваюць палітычны спэктар і складаюць падмурак будучага парлямэнтарызму. Вось чаму ім трэба ўдзельнічаць нават у бутафорскіх выбарах. Каб трымаць сябе ў форме і прызвычайваць да сябе народ. Крытыку партыяў і апазыцыі ў цэлым тут апускаю — няма ў сьвеце ніводнай партыі, ня вартай вядра крытыкі ў памфлетным стылі, але, як той казаў, лепшага за дэмакратыю пакуль не прыдумана.

Аб'яднаная апазыцыя — структураваная, парлямэнтарна арыентаваная — толькі і можа на месцы абсалютызму аднавіць дэмакратычны кштальт. Ніхто, апроч яе, гэтага ня зробіць.

Трэцяя перадумова страты незалежнасьці — змазаны палітычны спэктар. Яшчэ адно наступства дзейнасьці ўзурпатара. Дбаючы пра ўзурпацыю ўлады, Лукашэнка падбаў і пра тое, каб гэтаму не было альтэрнатывы. Самы абсурдны манэўр палягаў у тым, каб усе свае сілы апазыцыя кінула на антылукашызм, што непазьбежна прыводзіла да ідэйнае прафанацыі — антылукашысты камуністы і нацыяналісты мусілі ад бясьсільля грызьці адзін аднаго, і на тым канец.

> Трэба быць бязьлітаснымі да ўсяго, што Беларусь разбурае, і больш чым талерантнымі да таго, што спрычыняецца да яе існаваньня.

Хто можа гэтаму супрацьстаяць? Натуральна, сама інтэлігенцыя, тая частка грамадзтва, якую мы назвалі арыстакратыяй духу. Якраз іхныя моцныя партыі мусяць стаць падставаю моцнага парлямэнту. А толькі ў парлямэнце зразумелая для арыстакратаў патрэба незалежнасьці можа атрымаць заканадаўчыя гарантыі.

З Лукашэнкам — ніякага супрацоўніцтва, але — адкрытае спаборніцтва. Няхай ён забаўляецца з манэткай, але ягоная роля гаранта незалежнасьці настолькі ж важкая, як ягоная роля духовага лідэра нацыі. Гэта значыць, што такой ролі ў прынцыпе няма. Той, хто ў краіне «атвячае» за ўсё, — насамрэч ні за што не адказвае і нікіх гарантыяў не дае, не забясьпечвае. Ня варта падманвацца ў гэтым, ці то бароняючы Лукашэнку, ці то лаючы яго. Варта думаць пра іншае. Пра тое, што роля інтэлігенцыі ў грамадзтве і ў справе незалежнасьці нікім іншым сыграная быць ня можа. Як ня можа быць забароненая ці дазволеная, уведзеная ці адмененая ўказам ці дзяржаўным апаратам.

Беларуская інтэлігенцыя, найлепшыя яе прадстаўнікі, добра разумеюць гэта. Толькі на іх, патаптаных і загнаных у падпольле, трымаецца сёньня беларуская незалежнасьць. А зусім не на Лукашэнку, які ў прынцыпе нічога рэальна не гарантуе.

Што да кожнага чалавека, кожнага, хто ў душы — духоўны арыстакрат, дык ягоны ўдзел у незалежнасьці — ня ў тым, каб легчы дзе-небудзь на рэйкі ці штосьці там падарваць... Калі ён можа хоць крупінку дадаць да вобразу самастойнай краіны Беларусі — гэта самае большае і самае патрэбнае. Каб у тых, хто наважыўся гэтую незалежнасьць ліквідаваць, хаця б закраўся сумнеў.

**Сяргей Паўлоўскі**

Паводле газэты «Свабода», 1'2004.


№ 1
Сакавік 2004
hazeta@tut.by

*Арыстакраты духу*
Хто зьяўляецца гарантам незалежнасьці? Выбары ці байкот?
*Палітычны артыкул* 2

*«Шчасьце»*
Добра забыты твор Янкі Купалы 2

*Одэрборн*
Беларусь (1581) вачыма нямецкага падарожніка 19

СВАБОДА

тэма
*Чым беларусы адрозьніваюцца ад расейцаў?*

Беларусы — больш спакойныя за расейцаў. Але беларусам не стае тонкага гумару. Беларусы крычаць, калі прыпячэ, расейцы – калі хочуць. Беларус перш падумае, а тады прамаўчыць, а расеец рэжа праўду-матку, ня думаючы пра наступствы...

На пытаньне адказваюць: Валянцін Тарас, Аляксандар Дабравольскі, Лявон Вольскі, Адам Глёбус, Артур Клінаў, Уладзімер Арлоў ды іншыя. 11

З гісторыі газэт

*14 гадоў таму мы выпусьцілі ў сьвет першы нумар "Свабоды". Яе магутны ўзьлёт, выхад у лідэры беларускай мэдыя-прасторы скончыўся прыкрым падзеньнем. Гісторыя мела нешчасьлівы канец, адбіты ў чалавечых лёсах. Але канец газэты ня мог стаць канцом свабоды. Таму "Свабода", зь якой у 1902-м пачалася сучасная Беларусь, і "Свабода", зь якой у 1991-м Беларусь стала незалежнай краінай, — выходзіць зноў.*

*Сёньня рабіць гэта шматкроць цяжэй ва ўсіх сэнсах. Гэта значыць, ва ўсіх сэнсах цяжэй для свабоды. Мы ўжо ня можам дзе хочам друкавацца, распаўсюджвацца, нават калі б мелі на тое грошы. Мы ня можам зарэгістравацца. Але гэта, бадай, і ўсё, чаго мы ня можам. І гэтага недастаткова, каб мы не змаглі быць. У Беларусі павінна быць "Свабода". Мы аднаўляем перапынены выхад.*

*100 нашых прычын быць...*

Праект
рэвалюцыі ў N.

Гэта ідэя "двухполюснасьці". Як у Літве ёсьць сталіца Вільня і сталіца Коўна, як у Польшчы – Варшава і Кракаў, як у Расеі – Масква і Санкт-Пецярбург...

Сутнасьць нашага праекту — ў пераносе сталіцы Беларусі ў N.

Гэта можа быць любы горад краіны, калі Вам хопіць фантазіі ўславіць яго, як новую сталіцу са старымі традыцыямі. Натуральна, будуць Полацак і Наваградак, якім ужо выпадала выконваць гэткія функцыі. Але гэта не выключае і усіх астатніх.

«Кожная нацыя – цэлы сьвет, кожная краіна – цэлая плянэта, а ў плянэты – два полюсы. Прынамсі, так мусіць быць.»

Дзе разьмесьцяцца інстытуцыі ўлады? Міжнародны аэрапорт? Гатэлі? Што прыбраць? Што перайназваць, перамяніць?

Сёньня – першыя Праекты рэвалюцыі – у Полацку і Горадні.

с. 18

Віленскія ўлюры

*Гісторыі праўдзівыя, хоць неправўдападобныя*

Цэнтар эўрапейскага мастацтва знаходзіцца, як вядома, у Парыжы.

Затое цэнтар самой Эўропы месьціцца ў Вільні.

Тут няма Манмартру, затое ёсьць Паваль, — месца каля Пятніцкай царквы, дзе мясцовыя мастакі прадаюць свае творы. І пачалося ўсё гадоў так дзесяць таму...

Погляд Алега Аблажэя на с. 22

*Моўная практыка*
анонс

Спрэчкі пра тое, як па-беларуску будзе правільна, а як няправільна, як па-беларуску, а як не па-беларуску, нагадваюць дыскусію калекцыянэраў, што маюць справу зь нежывым матэрыялам. Жывая мова кіруецца сваімі законамі гарманізацыі, утварае ўласную плынь.

І тут мы маем справу з найбольшай сёньня моўнай праблемай – нераспрацаванай тэрміналёгіяй урбаністычнай, камутарнай, банкаўскай, штодзённай...

ПАСЬЛЯ АТЛЯНТЫДЫ
Спробы пісаць "посткамуністычную гісторыю" з чыстага аркуша правалiліся...

Эсэ Ігара Бабкова на с. 9

**З газэтай «Свабода» можна скантактавацца праз e-mail: hazeta@tut.by**

# Ізноў галадоўка, ізноў посьпех

## Канфлікт у Смалявічах

30 сакавіка пайшлі дзясятыя суткі бестэрміновай галадоўкі 10 з 20 работнікаў малога смалявіцкага прадпрыемства «Юкі». Гэта тая самая крытычная рыса, за якой магчымыя сур'ёзныя наступствы для здароўя ўдзельнікаў пратэсту. 29 сакавіка шпіталізаваны ў раённую больніцу першы галадоўшчык — мэханік-трактарыст Мікалай Шановіч, у якога выяўленая хвароба Боткіна. Дырэктар «Юкі» Павал Юзвак трымае галадоўку нароўні з падначаленымі. Прычыну акрэсьлівае коратка: «Дзявацца няма куды».

Апошняй кропляй, якая перапоўніла кубак іх цярпеньня, сталася паўторнае рашэньне судзьдзі Вышэйшага гаспадарчага суду Валер'я Жандарава. Ён пастанавіў «вызваліць» зямлю, якую займае малое прадпрыемства. Гэта азначае канец «Юкі», якое корміць 20 смалявіцкіх сем'яў. «Юкі» — гэта т.зв. РБВ, раствора-бэтонны вузел. Штогод ён мае абарот у 1,3 млрд рублёў, зь якіх плаціць у дзяржаўную казну блізу 300 млн адных толькі падаткаў.

У 1997 г. прыватнае ТАА «Юкі» набыло ў дырэкцыі прадпрыемства «Легсынтэз», якое будавалася тады, памяшканьні на плошчы ў 1 гектар. «Сынтэз» той кануў у лету, разам зь ім зьліквідавалася й дырэкцыя. Праз колькі гадоў выявілася, што ня ўсе дакумэнты па набыцьці памяшканьняў у норме. Юрысты Смалявіцкага райвыканкаму заяўляюць, што «Юкі» незаконна займае ўчастак зямлі плошчай пад 2 га, бо падчас набыцьця вытворчых магутнасьцяў неналежным чынам афармлены землеадвод.

«Цягам двух з паловай гадоў мы перажылі амаль сорак судоў. Сорак судоў — ня сорак разоў сходзіць у лазьню. Выстаялі. Але цяпер, відаць, нас зьбіраюцца дацiснуць — каб іншых застрашыць, — перакананы дырэктар «Юкі» Павал Юзвак. — «Бадзяга» з Смалявіцкім райвыканкамам цягнецца ўжо шэсьць гадоў. Хоць адпачатку нам далі зямлю, пасьля з боку райвыканкаму пачалося лабіяваньне інтарэсаў другога прадпрыемства аналягічнай вытворчасьці. Нядобрасумленная канкурэнцыя, адным словам».

У справе «Юкі» былі два супярэчлівыя рашэньні Вышэйшага гаспадарчага суду. Першы раз пастанавілі ня зносіць пабудоваў, а зямельнае пытаньне вырашаць сумесна з райвыканкамам. Райвыканкам абскардзіў гэтае рашэньне. Справу паўторна разгледзеў судзьдзя Жандараў і пастанавіў — вызваліць зямельны ўчастак. Выдалі загад, праз Менскі абласны гаспадарчы суд прызначылі судовых выканаўцаў і ўжо 26 сакавіка пабудовы мусілі зьнесьці. «Юкі» абскардзіла выкананьне судовага рашэньня — знос перанесьлі на 31-га.

«У райвыканкаме гавораць: уезд у горад неўладкаваны (на стрэхах будынкаў РБВ нефарбаваная чарапіца). Маўляў, на гэтым месцы будзе парк ці лес — дзіцячы лепет, можна сказаць! — абураецца П.Юзвак. — РБВ з усімі падсобнымі памяшканьнямі працаваў паўтара году да таго, як мы прыйшлі. Міні-заводзік мы выкупілі па частках, а нас вінавацяць, што мы незаконна занялі зямлю. І стаяць на тым. А чыноўнікі, ад якіх залежыць рашэньне праблемы, баяцца — іх запужваюць, таму яны і падаюць «патрэбную» інфармацыю. А суды чапляюцца за гэта».

На момант здачы нумару «НН» дырэктар ня меў афіцыйнага рашэньня ўраду, што разглядаў праблему 29 сакавіка. Аднак вядома, што Саўмін загадаў райвыканкаму вырашыць праблему «мірам».

Паводле неафіцыйнае інфармацыі, якой валодае П.Юзвак, «зносіць памяшканні ня будуць, а выдзеляць іншы ўчастак для нашага прадпрыемства». Гэта значыць, праблема вяртаецца на стартавую лінію. «Юкі» чакае ў госьці дэлегацыю Смалявіцкага райвыканкаму.

У прынцыпе, гэта перамога. Як і ў Ваўкавыску, ў Віцебску, галадоўка працаўнікоў смалявіцкага малога бізнэсу вымусіла ўлады пайсьці на саступкі.

**Глеб Хмяльніцкі**




**Незалежныя прафсаюзы і камуністы выступілі супраць масавага пераводу працоўных на кантрактную сыстэму. На думку Аляксандра Ярашука (на здымку справа), гэта зробіць работнікаў яшчэ менш абароненымі і ўразьлівымі на ціск адміністрацыі. Парада прафсаюзьнікаў — усяляк адцягваць або зрываць падпісаньне кантрактаў. На фота: пяць дзясяткаў прафсаюзных і камуністычных актывістаў выйшлі на пікет супраць кантрактнай сыстэмы ў Менску.**

# Як жыве Мёршчына

Найбольш яскрава вынікі ўжо амаль дзесяцігадовай пабудовы «рынкавага сацыялізму» бачныя ў беларускай глыбінцы.

Сёлета ў Мёрскім раёне распачалася мясцовая «адміністрацыйная рэформа», а дакладней — ліквідацыя некаторых сельсаветаў. Так, да Даўгінаўскага сельсавету далучаюць Узьмёнскі, а замест Чараскага і Дварнасельскага вырашана стварыць адзін з цэнтрам у Мёрах. Мера гэта вымушаная з прычыны абязьлюджаньня вёскі. Яно і зразумела, калі ўлічыць, што сярэднямесячны заробак калгасьніка за мінулы год склаў 84 тыс. рублёў, а за студзень гэтага году калгасьнікі вымушаны 30% заробку «выбіраць» таварамі ў крамах райспажыўсаюзу. Не ратуе нават тое, што ў раёне ўжо пабудавана і будуецца далей некалькі дзясяткаў «прэзыдэнцкіх» дамоў. Калгасам па-ранейшаму тэрмінова патрабуюцца сельгасспэцыялісты амаль усіх спэцыяльнасьцяў, а ў апошнія гады назіраецца іх адток.

Ня лепшыя справы і ў прамысловасьці. Менш чым на трэціну загружаныя вытворчыя магутнасьці былога мясцовага прамгіганту — мясаперапрацоўчага камбінату. У ліку лідэраў па нядоімках падаткаў — райаграсэрвіс з амаль мільярднай запазычанасьцю, ільнозавод з 134 млн і камбікормавы завод з 126 млн незаплачаных падаткаў. У самым цэнтры Мёраў зеўрае пусткаю вялікі будынак былой станцы тэхабслугоўваньня, у якім у першай палове 90-х прыватны прадпрымальнік наладзіў перапрацоўку рыбы. Прадпрыемства збанкрутавала. Ужо больш за год пустуе й двухпавярховы будынак былога трыкатажнага цэху: фірма «Славянка» адмовілася весьці ў раёне гандлёвую дзейнасьць. За мінулы год выпуск прампрадукцыі на Мёршчыне скараціўся аж на 17,2%, сярэднясьпісачная колькасьць работнікаў зьменшылася на 5,8%, а сярэдні заробак у прамысловасьці склаў усяго 184 тыс. руб.

У мясцовым цэнтры занятасьці ў якасьці беспрацоўных зарэгістравана амаль 600 чалавек, а сярэдні памер дапамогі на беспрацоўе складае 32 тыс. руб. Было б беспрацоўных значна болей, але толькі за апошнія два гады з раёну зьехала на 616 чалавек болей, чым прыбыло на сталае жыхарства.

Шмат хто не становіцца на ўлік у цэнтар занятасьці і самастойна шукае працу ў Расеі. Тыя, хто не жадае пасьвіцца «на падножным корме» (а асноўнай большасьці жыхароў дапамагае выжыць толькі натуральная гаспадарка, сарамліва называная прысядзібнай), папросту ўцякаюць. У асноўным гэта моладзь, найбольш прадпрымальныя і добра адукаваныя людзі.

**Валеры Каралёў, Мёры**

## Дзесяць гадоў «сімяонаўцы»

25 сакавіка адзначыў сваё дзесяцігодзьдзе полацкі Музэй-бібліятэка Сімяона Полацкага. Ён зьяўляецца часткай Музэю беларускага кнігадрукаваньня. Праект «сімяонаўкі» выканаў дызайнэр, а цяпер галоўны мастак Полацку Ігар Куржалаў. У музэі захоўваецца звыш 15 тысяч кніг, у тым ліку арыгіналы выданьняў Сімяона Полацкага.

**Васіль Кроква, Полацак**

## «Кацюша» стане эталёнам

На пасяджэньні Віцебскага абласнога штабу па добраўпарадкаваньні тэрыторыяў вызначаныя аб'екты, якія павінныя ў 2004 г. стаць узорамі архітэктурна-мастацкага і ляндшафтнага афармленьня, прыродаахоўнага і санітарна-тэхнічнага ўтрыманьня. У Воршы эталёнамі вырашана зрабіць тэрыторыю вакол СШ №1 (былога рэальнага вучылішча), фасады дамоў №27, 30 па вул.Маркса ды мэмарыяльны комплекс «Кацюша». Даўно ўжо патрабуе рэканструкцыі пабудаваны ў 1966 г. мэмарыяльны комплекс «Кацюша» — адна зь візітовак Воршы. Фізычна састарэлі асобныя элемэнты мэмарыялу. Некалькі гадоў таму абвалілася васьмімэтровая жалезабэтонная рэйка «пускавой устаноўкі». Дзякуй Богу, нікога ў той момант пад ёй не было. Пару разоў п'яныя дзецюкі спрабавалі сапхнуць «кацюшу» з пастамэнту. Скрадзены мармуровыя пліты з абліцоўкі... Грошы тутака будуць дарэчы. Але на астатнія помнікі гісторыі ў Воршы сродкаў, на жаль, не хапае.

## Не суцешаць, дык пахаваюць

Нешта падобнае на пачуцьці героя аднаго з апавяданьняў Міхаіла Зошчанкі (яго прывозяць у больніцу, а там яму адразу кідаецца ў вочы плякат на сьцяне: «Выдача трупаў з 3-х да 4-х») адчуваеш, калі трапляеш у Сьвята-Траецкую царкву ў Воршы. Там вернікаў сустракае аб'ява на дзьвярах, якая паведамляе, што тут можна заказаць труну, крыжы, вянкі ды іншыя пахавальныя аксэсуары. Даўно ўжо зьвыкліся з тым, што ў храмах вывешваюць прэйскуранты на царкоўныя паслугі — да таго ж нятанныя. Цяпер трэба ведаць: калі вас тут не падтрымаюць маральна, дык дапамогуць, за вашыя грошы, пахаваць.

**Яўген Жарнасек, Ворша**

## Ня еж на рабоце

Своеасаблівы адрэагавалі ў Магілёўскім аблвыканкаме на прэзыдэнцкую дырэктыву №1. Цяпер чыноўнікі рызыкуюць набыць сур'ёзныя непрыемнасьці, калі будуць… есьці на працоўным месцы. Так што свой перапынак на абед ім прыйдзецца выкарыстоўваць па максымуме, набіраючыся сілаў у запас.

## Як Батура царкву будуе

Мільярд і трыста мільёнаў рублёў давядзецца ўкласьці сёлета ў будаўніцтва Спаса-Праабражэнскага сабору ў Магілёве. Старшыня аблвыканкаму Барыс Батура запатрабаваў ад прадпрыемстваў і арганізацый няўхільнага выкананьня дамоўленасьцяў па фінансаваньні. Даручэньне ўзьвесьці храм з дапамогай прадпрыемстваў і арганізацый даў кіраўнік дзяржавы. Хаця зьмены ў Канстытуцыйны артыкул пра адасабленьне царквы ад дзяржавы пакуль яшчэ ня ўнесліся.

**Алеся Чыж, Магілёў**

## Баранавіцкі Дзень Волі

Сьвяткаваньне Дня Волі ў Баранавічах пачалося зранку, калі група сяброў розных партый і арганізацый наведала могілкі ў Русінах і ўсклала кветкі да магілаў памерлых патрыётаў.

На пачатку 18-й каля 20 чалавек рушылі да Крыжа ахвярам гвалту 1939—53 г. Яны несьлі вянок зь бел-чырвона-белымі стужкамі й подпісам «Закатаваным за Волю і Бацькаўшчыну». Шлях пралягаў узоўж будынкаў КДБ і ГУУС. Не пасьпелі ўдзельнікі акцыі падысьці да крыжа, як да іх рашучым крокам наблізіліся тры міліцыянты і ветліва прапанавалі згарнуць нацыянальны сьцяг. Пачуўшы адмову, пачалі пагражаць затрыманьнем і выклікам машыны. «Выклікайце», — прагучала ў адказ. Да крыжа быў ускладзены вянок, запалена сьвечка, сказана каротка прамова. Прысутныя сфатаграфаваліся на памяць.

Пасьля гэтага ўдзельнікі мерапрыемства накіраваліся да ўправы БНФ. Дарогай іх фатаграфавалі людзі ў цывільным, «сустракалі» афіцэры міліцыі. Патрыёты павіншавалі іх з Днём Волі. Пасьля ўдзельнікі сьвяткаваньня сабраліся ў адной з рэстарацый на сьвяточную вечарыну.

Напярэдадні 25-га «зубры» былі вывесілі два сьцягі ў цэнтры гораду.

**Руслан Равяка, Баранавічы**

**Двор Уладзімера Залатара нагадвае лябірынты: мноства вальераў, хлявоў, адрынаў, зь якіх нясецца чыліканьне й квахтаньне. У хляўку — самаканструяваны яйказборнік, па жолабе якога могуць скочвацца яйкі розных памераў — ад двухсантымэтровых да гіганцкіх. Над падворкам узносіцца дзюба мэталёвага бусла — фантан. На кожным вольным кавалачку зямлі расьліны — тутэйшыя й нетутэйшыя. На рай гэта непадобна, на рацыянальную гаспадарку — таксама. Нешта сярэдняе арытмэтычнае. Летам тут заасад, батанічны сад і дзіцячы сад у адным фляконе. Некаторыя людзі лічаць Залатара дурным…**



# «Чалавек мусіць жыць

## Жыхар вёскі Петкавічы Койданаўскага раёну разводзіць рэдкіх птушак, трымае 38 пародаў курэй і вырасьціў грушы на рабіне

**Уладзімер Залатар:** Мая сям'я — заможная, валодалі мы трыццацьцю гектарамі зямлі на хутары Залатары. А нарадзіўся я на хутары Міхалеўшчына ля Налібоцкае пушчы, недалёка ад Кромалю. Там толькі ў 1974 г. электрычнасьць правялі. Калгасу людзі не любілі, называлі яго «шлях да торбы». Начальства ня надта заглядала. Памятаю, усё было сваё, асобнае. Сьвіней на калкі навязвалі. Абвяжаш сьвіньню за плечы й пад пахамі і на выгане прывяжаш. А вакол яе пятнаццаць парасятаў таўкуцца. Сабакі таксама асобныя былі, з гонарам. А цяпер гайнёю адну костку па вёсцы ганяюць. Так, людзі жылі самі сабе. Той жыў, у каго конь быў, сям'я, хто хацеў працаваць і мець. Нас у сям'і было чатыры сыны і шэсьць дачок, і ўсе добра жывуць і здаровыя, дзякуй Богу. Я быў трэці сын у сям'і. Як у казцы: «Два сыны разумныя, а трэці фэрмэр»...

**«НН»: Толькі фэрма Вашая — птушыная.**

**У.З.:** Птушак у нас у сям'і трымалі заўсёды, яшчэ мой дзед іх вельмі любіў і разводзіў. Бабка мая, ужо нябожчыца, была добрым птушкаловам. Мяне навучыла. Начоўкамі лавілі, сеткамі, падхватамі, як называлі ў нас у вёсцы. Вось мы ўкрадзём у бацькі падхват — і ў лес. Якая там школа?

**«НН»: У вёсках хлопчыкі пяклі птушак і елі.**

**У.З.:** Ну што ж Вы такое кажаце, Вы ня ведаеце. Я трымаю шмат птушак, і курэй, гусей, качак у тым ліку, але мы іх не ямо. Гэта трагедыя, калі, ня дай Бог, птушка загіне. Я лаўлю птушак, кальцую і адпускаю. Вось злавіў амялушку, акальцаваную ў Фінляндыі. У красавіку ўсіх птушак, што перазімавалі ў хаце, мы выпускаем. Гэта сьвята птушак.

**«НН»: Сур'ёзна не палявалі ніколі?**

**У.З.:** Паляваў раней. Але прыходзіць часіна, калі задумваешся: а нашто забіваць, а хто табе даў права? Гадоў сем як не палюю. Абараняю і разводжу жывёл і птушак. Хочацца аддаць тое, што я забраў. Думаю, і жыцьця ня хопіць на гэта. І сабака ў мяне калека, хоць некалі быў паляўнічы, — такса Марта. Пайшлі мы зь ёй некалі на барсука. І яе барсук закапаў у нары. А быў гэта ў гары старажытны барсучыны гарадок, шматузроўневы, па 5—6 мэтраў глыбінёю норы бываюць. Мы зь сябрамі Марту выкопвалі цэлыя суткі. Была яна ўся пагрызеная барсуком і ўтрамбаваная. Барсук — гэта такая 17-кілаграмовая істота, ён і не такога сабачку прыкапаў бы.

**«НН»: З сабакам зразумела, а птушкі ці пазнаюць свайго гаспадара?**

**У.З.:** Мой брат возіць камплекты дэталяў МАЗу па ўсім кантынэнце ў вялізным МАЗ-МАNе. І я зь ім падарожнічаю, бывае, па паўтара месяца дома няма. Прыяжджаю, а яны лезуць на плечы, на калені. Гілёк быў, дык сядзе на плячо, каву са мной п'е. Горлінкі бягуць насустрач. Да галубоў зойдзеш — аблепяць з галавы да ног.

**«НН»: Ці ёсьць у вас сорак выраяў?**

**У.З.:** У мяне дзікай птушкі дваццаць відаў жыве. Можна было б і сорак разьвесьці, але я трымаю толькі тых, каго магу пракарміць. Насякомаедных, драпежных не трымаю, толькі зерняедных. Мучнога чарвяка вырошчваю, праўда, для фазаноў.

**«НН»: Вы з сваімі птушкамі жывяце на першым паверсе дому, Вашыя суседзі — на другім. Не замінаеце адно аднаму?**

**У.З.:** Я выкупіў 45 сотак зямлі, абсадзіў садам і праз год мяркую пабудаваць сабе асобны дом, прадаўшы гэтыя паўдому. Чалавек мусіць жыць асобна. У нас набудавалі тут чатырохпавярховікаў і людзей на верталётах у пушчы па хутарох высочвалі, сьцягвалі ў калгас, у гэтыя дамы. Добра хіба зрабілі? Тыя людзі цяпер і працаваць ня хочуць.

**«НН»: Для бальшыні людзей птушкі й іхнае жыцьцё нябачныя…**

**У.З.:** Птушак найменьняў тысячы, мы проста не заўважаем. Летась, калі памятаеце, шпакі папрылятаці зарань, а тады ўдарылі маразы. Я адлавіў сотні птушак і трымаў у вальерах, каб не памерзьлі. Па два-тры мяхі зерня ў дзень елі. Два тыдні я іх гадаваў. А па ўзбоччы дарог і ў парках раскідаў зерне й проса. У мяне было 200 кг рабіны, яны гэта ўсё зьелі, бедныя. Рабіну рваць я еджджу ў Менск, па краёх гораду птушкі аб'елі, а ў цэнтры засталася. Узьлезу зь секатарам на рабінку, унізе коўдру пасьцялю, рабіна на яе сыплецца. Людзі дзівяцца: «Мабыць, на віно?» На віно, кажу, на віно. Дык падыдуць, пакаштуюць рабінку: «Смачнае віно будзе». Але птушнікаў у нас у краіне шмат. Ходзяць па цеплатрасах, падкормліваюць птушак, што там ад холаду хаваюцца.

Адны людзі лічаць мяне дурным: ходзіць птушачак корміць, гаворыць зь імі. За пяць гадоў, што ў мяне стаяць тут вальеры, ніводзін сусед ня кінуў птушкам і семачкі.

**«НН»: А ёсьць тыя, хто спачувае?**

**У.З.:** Добрых людзей заўжды болей, чым кепскіх. Вось старшыня калгасу, Леанід Чыжык, выдатны чалавек. Два гады назад у мяне ў лістападзе ўжо былі гусяняты. Карміць няма чым. Ім жа трэба зялёны корм. Дык я шчыплю азіміну на калгасных палёх, а старшыня едзе і галаву адверне, маўляў, ня бачу. Тры гады, як выдзяляе маім птушкам зернеадкіды па тры—чатыры тоны. І дырэктар школы вельмі мне дапамагае. Дзяцей адпраўляе рабіны назьбіраць. Зь дзецьмі мы ў паходы ходзім, жалуды садзім, глядзім, як лес расьце, як птушкі жывуць. Я вучу іх *бачыць* птушак. 75 шчэпаў падарыў для школьнага саду.

**«НН»: Свой сад ці вялікі?**

**У.З.:** У мяне 134 гатункі яблык, 43 гатункі грушаў, 8 гатункаў вінаграду, розныя парэчкі, кізыл і японскія айвы. Раней было выгадна прадаваць шчэпы, калі людзям толькі давалі зямлю пад лецішчы. Цяпер зямлі набраліся, а працаваць ня хочуць, і нікому гэта не патрэбна. А паколькі ў мяне парэчак і іншых ягад мноства, то ў кустоўі навіваюць па вясьне дзясяткі гнёздаў, адно каля аднаго. Як гэта цікава назіраць! Летась заводжу трактар, нешта прыараць. Гляджу, птушка лётае над трактарам — дрыг, дрыг, дрыг — так трымціць, крычыць! «Што такое, мамачка, — пытаю. — Мо наехаў на каго?» Гляджу, а яна ў плузе зрабіла гняздо і вывела птушанят. Ну, я адчапіў плугі і не араў. Чужымі плугамі араў, свае стаялі.

**«НН»: Мабыць, каршуны пільнуюць па пэрымэтры Вашыя палеткі...**

**У.З.:** Пахаваюцца на дахах, дрэвах і кустох. Толькі галубоў выпусьціш — тут як тут... Дый 630 курэй было, два вядры яек штодня. Жонка вазіла прадаваць у Менск. А людзі пачалі красьці. Кралі й рэдкіх курэй. Балюча мне было. Бачыш у суседа сваю курыцу. Пытаешся: дзе ўзяў? Глядзіць у вочы і кажа: купіў. Дзе ты такую купіш? Шчэпы саджаю насупраць дому, а ўночы ўсе пакрадуць. Але я буду саджаць да тых часоў, пакуль накрадуцца ўсе. Ёсьць прымаўка: у яго й на вярбе грушы растуць. Так і ў мяне! Я прышчапіў на рабіну грушку. Я гэта магу! У мяне гэта ў генах. Бацька й дзед хадзілі з ножыкам па лесе, прышчэпкі рабілі. Я й цяпер ем дзічкі зь яблыняў, што прышчаплялі мае бацька зь дзедам. І сам іду ў грыбы, бяру чаранок, ножык і ізастужку.

**«НН»: Вы не зьбіраецеся зарабляць грошы на паказе Вашай сядзібы? Гэта называецца экатурызм.**

**У.З.:** Мы бяром на лета дзяцей з прытулкаў, яны ў нас тут жывуць, бывае дзіцячы сад. Летам тут заасад, батанічны сад і дзіцячы сад у адным фляконе. Я больш за 40 аповедаў пра гэта напісаў. Можа, калі кніжку зраблю, як вальнейшы буду. Вось нядаўна было: залез заяц у сад. Атрымалася трагедыя і для саду, і для зайца. Пагрыз ён мне шчэпаў. Хай бы еў! Дык не: панадгрызае, пажмякае й павыплёўвае. Я нарабіў пудзілаў з уласнай вопраткі, толькі пара штаноў у мяне засталася, сетку паставіў, калючым дротам аплёў. Не, пералазіць спрытна, як кот, і пудзілаў не баіцца. Паставіў пастку і злавіў. У пастцы ён і памёр, відаць. Ад страху. Біўся лапкамі й памёр. Праз тыдзень другі зьявіўся! Дык таго я бляшанкамі напалохаў. А лавіць ужо ня стаў. Шкада.

**«НН»: Птушкі прыносяць прыбытак?**

**У.З.:** А як жа. Але 70% на птушак і сыходзіць, 20% на каву, а 10% — на жыцьцё. Я бяз кавы жыць не магу. Паеду ў Менск гусей ці курэй прадаваць, жонка спадзяецца, што шмат грошай прывязу. Дзе ж яна ўгадала? Я накупляю новых птушак. Рэдкіх… Халмагорскія гусі трымаю статачак для захаваньня генафонду. Прывёз з Уладзіміру. У краінах СНД іх было толькі 500 галоў, 175 былі ў мяне. Халмагоры тым адрозьніваюцца ад іншых гусей, што ў іх ёсьць шышка на галаве, кашалёк-вальляк пад шыяй і складкі-мяшкі з тлушчам па ўсім целе.

38 пародаў курэй раней трымаў. Мінорскі былі, паўлаўскія (гэтыя два віды зьніклі амаль незваротна), брамы, кахінхіны, юрлаўскія, арлоўскія, пуховыя, кучаравыя, галашыйныя куры. Карлікавыя бэнтамкі, гэта ўвогуле не ўявіць! Восем сантымэтраў росту, яйкі — як у дразда. Была ў мяне бэнтамка Вольга Сьцяпанаўна. Чалавечым імем называў. Дзевяць гадоў у мяне жыла, пакуль ад старасьці не памерла.

**«НН»: А сярод «непрамысловых» птушак якія ёсьць экзоты?**

**У.З.:** Афрыканскія горлінкі жывуць у мяне ў хаце, яны сьмяюцца: ха-ха-ха, хі-хі-хі, таму завуцца сьмяшлівыя горлінкі. Былі ў мяне чыюкі й канарэйкі, штук трыццаць. Але моцна лаялі-ся й білі майго сабаку, каўказкую аўчарку Джыну. Дралі воўну зь яе. Брахалі на яе рознымі галасамі, павывучвалі ад суседзкіх сабакаў. Былі ў мяне павы тут. Як запяюць у тры гадзіны ночы, звар'яцець можна. Крычаць так, што мёртвыя ўстаюць, вылятаеш голы, без паўзуноў, і заганяеш у вальеру. Дык я іх сябру ў Маладэчна аддаў — хай пабудзяць Маладэчна.

**Гутарыла Сьвятлана Курс**

**Фатаздымкі Андрэя Лянкевіча**

# сам сабе»



**У пуховых курэй дзівосныя сінія мяса і скура.**

**Фазан залаты**





**Фазан каўкаскі дае шмат яек. Трымаюць такіх прыгажуноў толькі ў вальеры, бо на 10-ы дзень жыцьця ў іх абуджаецца ўстойлівая прага да палётаў.**



**Халмагорская гусь — экзатычны для Беларусі від. На сёньня ва ўсёй СНД такіх толькі паўтысячы. Мясная птушка: на падножным харчаваньні яе вага даходзіць да 17 кг.**

# Дзесяць тысячаў гадоў разам

Колькі мы жывём разам — мы й нашае быдла? Цяжка даць веры, але болей як дзесяць тысячаў гадоў. На мяжы сёмага і шостага тысячагодзьдзяў да нараджэньня Хрыстовага ў Беларусі ўжо гадавалі свойскую жывёлу. Беларускія абарыгены балты за паўтысячы гадоў да нашае эры шырака разводзілі кароваў, сьвіней, сабакаў. Ад часоў нэаліту жывёлагадоўля стала істотным чыньнікам гаспадараньня ў нашым краі. У тыя дрымучыя часы людзі прыўлашчвалі й гадавалі ўсялякую жывёліну, што можна было ўзяць зь лесу: тураў, казуляў, дзікоў. Гэтак рабіліся й першыя крокі ў сэлекцыі.

Увесь час да нас патраплялі новыя й новыя пароды быдла з розных куткоў Эўропы й Азіі. Іх куплялі, выменьвалі й разводзілі, урэшце, на месцы. Як пачаўся век жалеза ў Беларусі, то ўжо ніхто й ня памятаў, адкуль узяліся тыя ці іншыя жывёлы на сялянскіх падворках. Адно калматасьць ды мышастая ці буланая масьці нагадвалі пра пырскі тарпановай крыві ў конях, турынае — у валах, дзіковае — у сьвіньнях. Як нядаўна тое было, можна праўдзіць на гісторыі 1920-х, калі польскія навукоўцы вылучылі зь сялянскіх конікаў рысы канстытуцыі тарпанаў. Сэлекцыянаваныя тады дзікія конікі й дасюль гойсаюць у Белавескай пушчы. Прыкладна гэтаксама былі ўзноўленыя й зубры.

Зь цягам часу, прыкладна ад XV ст., у Беларусі ўсталявалася спэцыфічнае раянаваньне жывёлагадоўлі.

На паўночным усходзе гадавалі найперш буйную рагатую жывёліну, кароваў ды валоў, а таксама коні. Успамінам аб тых колішніх традыцыях засталіся амсьціслаўскія цяжкавозы, коні-волаты, што гадуюцца й да сёньня.

Тым часам на Меншчыне й Берасьцейшчыне аралі часьцей ня коньмі, а валамі, і конегадоўля займала сьціплейшае месца. Затое паўсюдна былі сьвіньні, авечкі, козы. Яшчэ Мацей зь Мяхова пісаў, што тут гадуецца свойская жывёла «самая разнастайная». А немец Самуэль Кіхель з Ульму, які вандраваў па нашым краі ў 1586 г., з захапленьнем зазначаў: «Зямля гэтая вельмі багатая на дзікую й хатнюю птушку, ягнятаў, аслоў, цялятаў, дзічыну».

Жывёлагадоўля ў Беларусі да XVIII ст. ня мела выразнае таварнае арыентацыі. То бок задавальняліся патрэбы лякальных натуральных гаспадарак. Гэта ў сваю чаргу не прыводзіла да ўніфікацыі гадаваных пародаў — як авечак на Пірэнэях, кароваў у Нідэрляндах ці сьвіней у Нямеччыне. Праз тое статак багатых і бязрогіх нашых братоў меншых быў надзвычай пярэстым. У адной і той жа гаспадарцы былі каровы, сьвіньні й козы розных пародаў, масьцяў і якасьцяў. Вось гэтая дымчатая махнатая каза — каб часаць зь яе поўсьць, а гэтая беленькая з вымем да зямлі — каб даіць. Гэтае рудое парася — на мяса, а гэтага пярэстага з вушамі над брывамі — гадуем год на сала.

Працяг на старонцы 12.

# Сьвіньня XXI стагодзьдзя

**Якую сьвініну мы будзем есьці праз дзесяць гадоў — беларускую ці прывазную? Пакуль нашая сьвініна ня можа канкураваць з заходняй. А ўступленьне краіны ў Сусьветную гандлёвую арганізацыю будзе вымагаць ад беларускіх прадуктаў адпаведнасьці агульным стандартам. Сьвінагадоўцы пэўныя, што дадуць рады праблеме. Дзеля гэтага выводзіцца адмысловая мясная парода — беларускі дзюрок.**

«Гаспадару трэба ведаць, што вялікая карысьць можа быць не ад усялякай сьвіньні, але толькі ад сьвіньні добрай пароды (гатунку), культурнай сьвіньні — заводзкай, як кажуць. Бо наша простая (некультурная) сьвіньня шмат карысьці ня дасьць. У ёй, як вядома, толькі косьці ды скура, а сала і мяса вельмі мала; хоць яе кармі-раскармі, а больш як 2—2$^1/_2$ пуды вагі ў год яна не набярэ. Праўда, так яе і даглядаюць у нас: яна сама па сабе харчуецца, чым і як прыйдзецца, асабліва ўлетку, — то ў агародзе, то ў лесе, то на выгане, і большай часткай жыве паўгалодная», — пісаў у 1920-х у сваёй кнізе «Сьвіньня — скарбніца гаспадара» першы кіраўнік ураду БНР вэтэрынар Янка Серада.

На той час у беларускіх гаспадарках дамінавала мясцовая парода сьвіней — чорна-пярэстая. Зьявілася яна праз шматвяковае бессыстэмнае скрыжоўваньне дзікіх мясцовых сьвіней з прывазнымі. У розных рэгіёнах гэтыя сьвінкі зваліся па-рознаму — «слуцкімі», «чавускімі», «сьвіслацкімі», але былі ўсё ж аднае пароды. Савецкія сэлекцыянэры клікалі яе «палепшанай беларускай» і хвалілі за пладнасьць, непатрабавальнасьць, досыць буйныя габарыты.

Працяг на старонцы 11.

# Эўропа ідзе

З 1 траўня Беларусь стане непасрэднай суседкай аб'яднанай Эўропы: да Эўразьвязу далучацца Польшча і Літва. У сувязі з гэтым хачу спыніцца на візыце ў Менск намесьніка памочніка дзяржаўнага сакратара ЗША Стывэна Пайфэра. Заслугоўваюць вялікай падзякі такія намаганьні міжнароднай супольнасьці дзеля дэмакратызацыі Беларусі. Але лёс Беларусі перадусім мусім вызначаць мы, яе грамадзяне. Наколькі мы гатовыя адстойваць дэмакратычныя каштоўнасьці: свабоду СМІ, свабодныя выбары? Большасьць беларусаў чакаюць зьменаў да лепшага. А ці гатовыя яны за гэта лепшае змагацца, а ня проста чакаць добрага дзядзьку Сэма?

Што для звычайнага абывацеля значыць вольны друк, калі яму няма чаго апрануць ці зьесьці? Што можа зрабіць студэнт, калі яму не даваліяюць здаць запазычанасьць без уступленьня ў БРСМ? Пытаньні, на якія далёка ня кожны адважыцца сказаць: я чалавек, і я не дазволю за сябе вырашаць, куды мне ўступаць і што мне чытаць.

Кажуць, што беларусы не дарасьлі да дэмакратыі. А хто даў права так судзіць? Няўжо й дзіцяці можна адмовіць у яго асноўных правах, бо яшчэ малы?.. Чалавек — мера ўсяго. І правы асобы перадусім. Пасьней — сям'я. А толькі тады — грамадзтва, дзяржава. І калі дзяржава не дае мне свабоды ці ня здольная гарантаваць людзкі ўзровень жыцьця, то нашто мне такія ўлады? Ці я ня маю права свабодна выказваць думкі, атрымліваць за працу людзкі заробак, патрабаваць сацыяльнай абароны? А тое, што нехта карыстаецца з нашай слабасьці, зь няведаньня, ганьбіць добрае, дык гэта, я пэўны, часова. І канец такіх незайздросны.

Чую, што блізка той час, калі кожны зможа адчуць сябе Асобай, а не бездапаможным шрубкам. І ці варта дзівіцца, калі ўжо й у старых людзей расплюшчваюцца вочы на сапраўдны стан рэчаў, на хлусьлівасьць улады. Да нас пачнуць ставіцца як да людзей.

Эўропа ідзе! Вітайма!

**Мікола Арцюхоў, Менск**

# Шыз нашага часу

Актывісты праваe партыі — Аб'яднанае грамадзянскае — ідуць да прахадных заводаў, каб весьці непасрэдны дыялёг з рабацягамі. Людміла Гразнова, якая ўваходзіла ў лібэральную фракцыю Вярхоўнага Савету, таксама дзяячка АГП, аргагізуе сход грамадзянаў, абураных абдзіралаўкаю, якую чыняць камунальныя службы. «Дэмакрат нагул», доктар Вячаслаў Оргіш, піша вялікі артыкул пра кантрактную сыстэму эканамічнага і палітычнага паняволеньня працоўных...

А дзе абаронцы людзей працы паводле азначэньня, дзе левыя? Дзе Аляксандар Бухвостаў, дзе Мікола Статкевіч, дзе Станіслаў Шушкевіч? «Ды супакойся, — скажуць мне, — быў жа ў «НН» артыкул Леаніда Гаравога». Але, па-першае, у «НН» аніяк не пазначана, што Л.Гаравы — сацыял-дэмакрат. Па-другое, Л.Гаравы сам апынуўся ў сытуацыі шызу. Яшчэ ў студзені ён прапанаваў зьезду БСДГ праект рэзалюцыі аб кантрактнай сыстэме, але партыйныя кіраўнікі адхілілі яго. І маўчаць, як тыя ягняты. Маўчаць і БСДП (НГ), і Партыя працы, ня кажучы пра Сацыял-дэмакратычную партыю народнае згоды ці «Надзею».

Сацыял-дэмакратыя ў Беларусі рызыкуе ператварыцца, кажучы словамі Яна Станкевіча, у ганьбу нашага часу. Гонар левых бароняць людзі з ПКБ. Добрыя весткі пра іх ацы і намеры прыходзяць зь Віцебшчыны і Берасьцейшчыны. І хоць я зь недаверам стаўлюся да камуністаў, гэтыя іх крокі надаюць мне трохі аптымізму: а мо шыз удасца ўсё-такі пераадолець?

**Анатоль Сідарэвіч**

# Ніжэй за плінтус

«Ня можна такімі быць», — сарвалася з вуснаў па прачытаньні артыкулу Данілы Жукоўскага «Сваё, пра сваё, для сваіх» у «Arche».

Ад пачатку малаверагоднай падавалася магчымасьць сур'ёзнага канкураваньня «Arche» й «Дзеяслова» — праз адрознасьць жанрава-тэматычнай арыентаванасьці, заўважны пераход першага ад бэлетрыстыкі да крытыкі й аналітыкі, ды праз свае колы аўтараў, што згуртаваліся вакол кожнага з выданьняў. «Arche», што сярод сваіх асноўных мэтаў канстатуе патрэбу «выяўляць і абмяркоўваць ключавыя для аздараўленьня інтэлектуальнага жыцьця праблемы, гуртаваць інтэлектуалаў, прадукаваць ідэі», ніколі й словам не абмаўляўся пра існаваньне «Дзеяслова». Але водгук на такую адметную зьяву ня мог не зьявіцца (прынамсі, ён чакаўся — грунтоўны і аб'ектыўны). І зьявіўся.

Сп.Жукоўскі кляймуе дзеясловаўскія тэксты: «настальгічныя, безнадзейна пэсімістычныя, простаілінейныя, без выкрутасаў і хітрыкаў», «алергія на навацыю і экзотыку». А погляд на жыцьцё, сьведчыць крытык, застаўся «ранейшым прыгнечана-зайздросным поглядам зацкаванага жыцьцём інтэлігента». Падобныя высновы робіцца на грунце аналізу перадусім празаічных твораў зь першага і другога нумароў «Дзеяслова». А на сёньня іх выйшла ўжо восем. Чацьверты ж нумар літасьціва абвяшчаецца аўтарам як той, што «дазваляе мець асьцярожную надзею». Гэта, бадай, самы высокі камплімэнт, што губляецца сярод безапэляцыйных фармулёвак, кшталту «адбылося кланаваньне «Полымя». Праз падобную «аналітыку» панятак «беларускі інтэлектуалізм» усё больш трывала атаясамліваецца з пыхлівым снабізмам. Да жалю.

**Анатоль Івашчанка**

# Трашчанку — прэмію Вешальніка

Апошнім часам беларускія культурніцкія колы адзначыліся вялікай колькасьцю наладжаных прэмій. Яны маюць розны век, свае дзялянкі й вызначанае кола кандыдатаў, таму некаторыя прэзэнтуюцца як «суб'ектыўныя». Сама ідэя ўзнагароджваць суб'ектыўнай прэміяй не зьяўляецца абсалютна арыгінальнай.

Ініцыятарам такога ўшанаваньня быў у сярэдзіне XIX ст. вядомы мэцэнат і філянтроп М.М.Мураўёў. Пасьля задушэньня паўстаньня Каліноўскага графу і віленскаму генэрал-губэрнатару закарцела ўзнагароджваць прэміяй ад свайго імя тых навукоўцаў, якія стварылі б гэтак запатрабаванае «особое руководство по русской истории для Северо-Западного края». У гэтай працы трэ было давесьці лягічнасьць зьядnаньня краю з Расейскай імпэрыяй праз бясспрэчную прыналежнасьць мясцовага насельніцтва да расейскага народу. Прэмія гэтая ў хуткім часе была забытая, бо ўсё ж большасьць дасьледчыкаў з тых, што шчыравалі над перапрацоўкай нашае гісторыі на патрэбны капыл, адзначалі яе адрознасьць ад расейскай. Цяпер жа, у абставінах новае ідэалягічнае ўстаноўкі зноў ствараць «правільную гісторыю», знайшліся ахвотнікі, што гэтак шчыра кіруюцца дадзенымі амаль 150 гадоў таму рэкамэндацыямі, што рыхтык трэ было пераправіць...

**Усевалад Сьцебурака, Менск**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты, мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам. Наш адрас: а/с 537, 220050, Менск. E-mail: nn@promedia.by. Факс: (017) 284-73-29.

# Пэрспэктывы беларускіх партызанаў

**Калі Беларусь будзе пазбаўленая дзяржаўнага сувэрэнітэту і ўключаная ў склад Расеі, беларускі вызвольны рух можа разьлічваць на гарачае спачуваньне Украіны, Польшчы і мусульманскіх народаў Расеі.**

Цягам сотняў гадоў найлепшыя прадстаўнікі беларускага народу марылі пра сваю дзяржаву. Але Беларусь заўсёды была разьменнай манэтай для больш шматлікіх і больш арганізаваных суседзяў.

Да часу кіраваньня Міхаіла Гарбачова беларусы былі самым «савецкім народам» на ўсёй тэрыторыі СССР. Сваю незалежную дзяржаву беларусы атрымалі на «спадачку», як вынік палацавых інтрыгаў. Не было «дыванових» бамбаваньняў зь «Мігаў» і «Сушак». І генэрал Грачоў не спрабаваў узяць Менск за дзьве гадзіны адным дэсантным палком. Шаманавы і трошавы, «Альфа» і розныя іншыя «Амэгі» не рабілі зачысткаў у беларускіх мястэчках. Таму і сёньня стаўленьне да расейскага чалавека ў Беларусі захавалася такім самым прыязным, як і ў ранейшыя савецкія часы. Зусім ня ў прыклад, як ставяцца да расейцаў у астатніх рэспубліках цяпер ужо былога СССР.

Адначасова за 12 гадоў незалежнасьці адбыўся нечуваны ўсплёск нацыянальнай самасьвядомасьці беларусаў. Па сутнасьці, пачалося адраджэньне беларускай нацыі. Найбольш абнадзейвае тое, што ідэю незалежнай дзяржавы і разьвіцьцё нацыянальнай культуры падтрымлівае ўсё большая колькасьць моладзі. Калі раней многія саромеліся нават размаўляць на роднай мове, то сёньня ўжо лічыцца кепскім тонам, калі чалавек не валодае беларускай мовай. Многія беларусы ўсьвядомілі сваю нацыянальную ідэнтычнасьць і ганарацца быць грамадзянамі сваёй нацыянальнай, незалежнай дзяржавы.

А цяпер паспрабуем змадэляваць сытуацыю, што непазьбежна ўзьнікла б, калі Беларусь была б уключаная ў склад Расеі, пазбаўленая дзяржаўнага сувэрэнітэту.

Можна абсалютна перакананa сьцьвярджаць, што пэўная частка Беларускага народнага фронту радыкалізуецца. Ад мітынгаў і дэманстрацый актывісты-патрыёты пяройдуць да пакрыёмых партызанскіх дзеяньняў. Пакрыёмымі яны будуць у першым часе, але ўзмоцняцца па меры рэпрэсіўных акцый з боку так званага «фэдэральнага» цэнтру. Зьявяцца свае народныя героі, свае «басаевы». Натуральна, у Крамлі беларускіх партызан назавуць «тэрарыстамі» і «бандытамі». Прыём стары і правераны. Так беларусаў называлі сваім часам гітлераўскія акупанты.

Напалеон таксама называў «бандытамі» расейскіх і гішпанскіх партызанаў. Сёньня ў «бандытах» лічацца чачэнцы, курды і палестынцы, а заўтра так, магчыма, назавуць татараў і башкіраў.

Ня варта расейцам спакушацца мітам, што мы «народы-браты», славяне, адной веры і г.д Тут гэта «не спраце». Народ, які атрымаў глыток свабоды, ужо ня будзе мірыцца з новым паняволеньнем. Мы ж добра памятаем, як «браты-славяне», украінскія партызаны, з аднолькавай зацятасьцю змагаліся як з гітлераўскімі акупантамі, так і з расейцамі. Тое ж можна сказаць і пра славянаў-палякаў. Пра латышоў, эстонцаў і іншых казаць залішне. Нават баўгары, атрымаўшы незалежнасьць, пачалі зьнішчаць памяткі расейска-савецкага «братэрства».

Можна не сумнявацца, што беларускі нацыянальна-вызвольны рух выкліча гарачае спачуваньне ў значнай часткі мусульманскіх народаў Расеі. Найперш Татарстану і Башкірыі. Народы гэтых рэспублік даўна мараць пра выхад з імпэрыі і ўтварэньне сваёй незалежнай дзяржавы.

І ўжо тым больш беларусы сустрэнуць маральную і іншую падтрымку ад Украіны і Польшчы. Бо анэксію Беларусі яны справядліва расцэняць як пагрозу ўласнай дзяржаўнасьці.

Ёсьць і яшчэ адзін важкі момант. З чачэнскімі партызанамі лягчэй змагацца дзякуючы расісцкім забабонам расейскага насельніцтва.

Хто больш за ўсё выйграе ад зьяўленьня яшчэ аднoй «гарачай кропкі» на тэрыторыі Расеі? Галоўны выйгрыш атрымаюць КДБ-ФСБ і камандныя склад войска. Зьявіцца безьліч новых «працоўных» месцаў. Новыя пасады, новыя «баявыя», чарговае павышэньне акладаў. Сынкам генэралаў і палкоўнікаў ня трэба будзе вывучаць рабочыя прафэсіі. Усё гэта — пад ужо вядомымі лёзунгамі: «адраджэньне войска», «барацьба зь міжнародным тэрарызмам», «абарона тэрытарыяльнай цэласнасьці» і гэтак далей.

Ну, а хто прайграе ад анэксіі Беларусі? Пытаньне рытарычнае. Пра «братоў-славянаў» давядзецца забыць на доўгія гады, калі не назаўсёды. Бо да гэтага часу татары памятаюць зьнішчэньне Казані.

Абсалютна ўсе расейскія князі, цары, імпэратары і генсекі (за выключэньнем М.Гарбачова) абсалютна зьненавідныя народам Расеі. Такі ж лёс чакае і ўсіх цяперашніх кіраўнікоў, што прагнуць выкарыстаць расейскі народ для паняволеньня іншых, дзеля ўласнага ўладалюбства. А ці трэба гэта самому расейскаму народу?

Гісторыя Расеі, на жаль, ідзе амаль па коле — значыць, нічому ня вучыць. Старэйшае пакаленьне памятае, як нашы слаўныя генэралы «абараняў» «сацлягер» у ГДР, Вугоршчыне, Чэхаславаччыне, Польшчы. А таксама, час ад часу, яны «абараняў» так званыя далёкія межы: у Афрыцы, Азіі, у Цэнтральнай і Паўднёвай Амэрыцы.

Вынік вядомы. Галеча «падабаронных» народаў і галеча народаў Расеі. А прыклад Югаславіі — хіба ня ўзор таго, як ня варта рабіць?! Спрабуючы захаваць сваю міні-імпэрыю, Мілошавіч зьнішчыў дзясяткі (калі ня сотні) тысяч людзей. Цяпер чакае прысуду Гаагскага трыбуналу.

Спрабуючы любым чынам захаваць Імпэрыю, спадары Ельцын і Пуцін зьнішчылі чвэрць мільёна чачэнцаў і невядомую колькасьць расейцаў. Разбурылі сотні гарадоў і мястэчак. Каля 400 тысяч чалавек ператварылі ва ўцекачоў. Па сутнасьці, гэта генацыд. Тым самым яны пасеялі міжнацыянальную варажнечу на многія дзесяцігодзьдзі наперад. Інакш кажучы, значна пераўзышлі пана Мілошавіча.

Аднак Гаагскі трыбунал ім не пагражае, якія б злачынствы яны ні зьдзейсьнілі ў мінулым і якія б ні меліся зьдзяйсьняць. Бо ў руках пана Пуціна атамная бомба. Калі б такая зброя была ў Мілошавіча, ён таксама не сядзеў бы за кратамі. І нябожчык цяпер Пол Пот не хаваўся б у камбаджыйскіх джунглях да канца сваіх дзён. І Гітлеру не давялося б труціцца.

Тэрмаядравая зброя даўно ўжо не зьяўляецца зброяй абароны насельніцтва краіны. Яна стала сродкам міжнароднага шантажу. Атамная зброя — гэта гарантыя беспакаранасьці Кіраўніка за любыя злачынствы супраць чалавецтва і супраць уласнага народу. Атамная бомба — таксама гарантыя беспакаранасьці і за любыя парушэньні міжнароднага права, якія б асуджальныя рэзалюцыі ні выносіла ААН.

А ёсьць жа багата добрых прыкладаў для пераймання. Скандынавія калісьці таксама была «імпэрыяй». Сотню гадоў таму Нарвэгія без адзінага стрэлу здабыла незалежнасьць. І цудоўна жыве з суседзямі сёньня. У наш час Славакія таксама «бязгучна» адасобілася ад Чэхіі. Трагедыі ня здарылася. Такім чынам можна было б (і яшчэ ня позна) зрабіць з Чачэніяй, Татарстанам, Башкартастанам і іншымі рэспублікамі, што жадаюць сувэрэнітэту. Усім вядома, што сябраваць асобнымі кватэрамі альбо дамамі значна прыемней, чым сем'ямі ў «камуналках».

Час імпэрый сыходзіць у незваротнае мінулае. Імпэрыя і дэмакратыя — панятакі абсалютна несумяшчальныя. Палітычная сыстэма цяперашняй Цэнтральнай Эўропы — цудоўны прыклад для пераймання.

**Міхась Кукабака, Масква**
**Паводле kavkazcenter.com, скарочана**




**Міхась Кукабака — беларускі дысыдэнт. У 1968 г. адкрыта выступіў супраць акупацыі Чэхаславаччыны. Быў асуджаны за «антысавецкую дзейнасьць», знаходзіўся на прымусовым псыхіятрычным лячэньні. У 1978 г. яго нарыс «Скрадзеная Бацькаўшчына» (пра русіфікацыю Беларусі) трапіў на «Нямецкую хвалю». М.Кукабаку арыштавалі за «распаўсюд хлусьлівых выдумак». Агулам прабыў у савецкіх турмах 17 гадоў.**

# Сьвіньня XXI стагодзьдзя

**Працяг са старонкі 9.**

За часоў калектывізацыі ў чорнапярэстых зьявіўся магутны канкурэнт — белая буйная сьвіньня. Гэтую пароду насаджалі ва ўсім СССР. Чорна-пярэстыя прератварыліся ў бедных сваякоў, годных хіба на скрыжаваньне з буйным белым братам. Хоць нават маскоўскі акадэмік Міхаіл Іваноў, выпускнік Горацкай вучэльні, лічыў мясцовую пароду найбольш прыдатнай для Беларусі.

Ініцыятарам аднаўленьня чорнапярэстае пароды, зьведзенай амаль на нішто, стаў у другой палове 40-х прафэсар Мікалай Замяцін. Ён давёў: на аснове мясцовай пароды можна стварыць сьвіней зь лепшымі прадукцыйнымі паказчыкамі, чым буйныя белыя. Распрацоўка была запатрабаваная: Беларусь ператваралі ў край сьвінакомплексаў. Паводле савецкай сыстэмы раянаваньня, беларусы і прыбалты мелі гадаваць сьвіньні й малочныя каровы, украінцы — мясныя пароды быдла, Каўказ — авечкі... Калі ў 1951 г. у гаспадарках краіны налічвалася 1623,2 тыс. сьвіней, дык празь дзесяць гадоў іх было ўжо ў два разы болей, а яшчэ праз дваццаць, у 1981-м, пагалоўе дасягнула 4567,1 тыс. — па сьвіньні на двух беларусаў.

Тая машэраўска-сьлюнькоўская інэрцыя й дагэтуль рухае гаспадарку: сьвінагадоўляй займаюцца каля 500 дзяржаўных гаспадарак. Сярод іх 14 племгасаў і 120 сьвінакомплексаў рознай магутнасьці: ёсьць па пяць гігантаў на 108 тыс. і на 54 тыс. галоваў. Астатнія — на 24 тыс. галоваў і менш. А яшчэ ж прыватнікі: у Інстытут жывёлагадоўлі НАН ледзь не штодня завітваюць фэрмэры, каб атрымаць кансультацыю: хочуць гадаваць мясныя сьвіньні.



**Большасьць сьвінак у нашай краіне належаць да «беларускай буйной белай» пароды.**

## Сьвіны стрэс

Уступленьне краіны ў Сусьветную гандлёвую арганізацыю будзе вымагаць ад беларускіх прадуктаў адпаведнасьці заходнім стандартам. Так, у Эўропе на кілё прыросту прыпадае тры кармавыя адзінкі, у Беларусі — шэсьць. То бок нашым сьвіньням трэба скарміць удвая болей. Нашыя дзюдзі неканкурэнтаздольныя й па мясных якасьцях: сьвініна тлусьцейшая і даражэйшая. Таўшчыня сала ў беларускіх сьвіней пакуль што 25—27 мм (у заходніх — 20—22 мм), сабекошт кілі мяса — больш за даляр (на Захадзе — 0,7—0,9). Але сьвінагадоўцы гатовыя даць рады гэтай праблеме. Дзеля гэтага яны пачалі выводзіць адмысловую мясную пароду — беларускі дзюрок.

Здавалася б, самы просты шлях — прывезьці сюды заходніх сьвіней. Аднак імпартныя пароды ў Беларусі не выжываюць. Уплываюць тут найперш кліматычныя ўмовы — халадней, ніжэйшая вільготнасьць паветра. Дый умовы ўтрыманьня і абслугоўваньня, харчы розьняцца ад заходніх. Так што перавезеныя дзюркі й ляндрасы рэзка зьніжаюць прадукцыйнасьць. Адаптацыя адбываецца толькі ў трэцім-чацьвертым калене.

Яшчэ новыя ўмовы ўтрыманьня — нязвыклы корм ці тэхніка, загазаванасьць паветра, вялікая скучанасьць — могуць выклікаць у сьвіньні... стрэс. У заходніх пародаў ёсьць нават рэцэсіўны стрэсавы ген, які ў нашых экстрэмальных умовах робіцца дамінантным. «На шчасьце, айчынныя пароды да стрэсаў устойлівыя», — кажа загадчык лябараторыі гадаваньня і сэлекцыі сьвіней Інстытуту жывёлагадоўлі Мікалай Лобан. Асабліва хваліць ён чорна-пярэстую сьвіньню, якая адаптуецца ў любых умовах утрыманьня, аж да экстрэмальных. «Гэтая парода — рэкардсмэн і па якасных характарыстыках сьвініны. Мы ёй прышчапляем мясныя пароды — дзюрка, пэтрэну, ляндрасу», — кажа навуковец. Але буйных белых у краіне пакуль болей. Іх разводзяць у 14 племгасах краіны: маецца 5 племзаводаў, 6 сэлекцыйна-гібрыдных цэнтраў і базавыя гаспадаркі сьвінакомплексаў. Белая папулярная праз высокую прадукцыйнасьць.



**Беларускі дзюрок мае адрозьніваецца вялікімі кумпякамі і быць пладавітым.**

## Хто найлепшы сьвінабацька

Сьвінагадоўцы падзяляюць пароды на мацярынскія і бацькаўскія: першых часьцей выкарыстоўваюць у якасьці сьвінаматак, другіх — у якасьці сьвінабацькаў-кныроў. Асноўныя мацярынскія пароды — буйная белая (менскі й віцебскі тыпы, выведзеныя ў 1990 г.) і чорнапярэстая. Асноўная бацькаўская — пакуль таксама буйная белая (задняпроўскі тып, выведзены летась), але ўсё большай папулярнасьцю карыстаюцца замежнікі: дзюркі, пэтрэны й ляндрасы.

Да сёньняшняга дня буйная белая застаецца асноўнай пародай нашай сьвінагадоўлі: з агульнай колькасьці 280.000 сьвінаматак толькі буйная белая сьвіньня налічвае каля 150.000 галоваў (53,6%). Беларускай мясной каля 10.000 матак (3,6%), чорна-пярэстай — каля 7000 (2,5%), эстонскай бэконнай 3000 матак (1%). Іншыя пароды наагул не дабіраюць нават гэтае лічбы: дзюркоў каля 500 матак, ляндрасаў — каля 1500 галоваў, пэтрэнаў — каля 100.

Прыкладна гэткія ж прапорцыі і па «бацькаўскім» баку, хаця колькасьць кныроў непараўнальна меншая. Беларуская буйная белая сьвіньня сярод бацькаўскага пагалоўя складае 80% папуляцыі (каля 6000 кноразаў). На другім месцы — чорна-пярэстая: каля 7% (1500—2000 кноразаў). На трэцім — беларуская мясная (1500 япрукоў). Эстонская бэконная — парода, створаная яшчэ ў 60-х, у нас захавалася папуляцыя ў адной гаспадарцы — сэлекцыйна-гібрыдным цэнтры «Зарэчча» Рагачоўскага раёну. І потым — спэцыялізаваныя мясныя пароды, імпартныя генатыпы: пэтрэн (блізу 100 кныроў), дзюрок і ляндрас.

## Кныру — чалавечыя ўмовы

Другі шлях паляпшэньня сьвінскае пароды — тэхналягічны. Укараняць новыя распрацоўкі ў будаўніцтве сьвінакомплексаў, паляпшаць умовы ўтрыманьня і кармленьне. Сьвіньня, насуперак стэрэатыпным уяўленьням, — жывёліна дужа ахайная і патрабавальная да чысьціні. Прычым больш камфортныя ўмовы патрэбныя асабліва кнырам. Беларускія ж сьвінакомплексы эксплюатуюцца ўжо па 20—30 гадоў, прыйшоў час будаваць новыя — з арыентацыяй на заходнія генатыпы.

«Калі раней мы сэлекцыянавалі жывёлаў пад тэхналёгіі, дык цяпер тэхналёгія павінна прыстасоўвацца пад жывёлаў, — кажа М.Лобан. — Трэба аптымальна выкарыстоўваць іх біялягічныя магчымасьці. Сэлекцыйны мэтад больш кансэрватыўны, чым тэхналягічны: так хутка не дасягнеш зруху ў прадукцыйнасьці, як пры паляпшэньні ўмоваў утрыманьня. Але мы карыстаемся камбінаваным мэтадам: спалучаем першы і другі. Калі пры сэлекцыі мы адбіраем найлепшых жывёлаў і ня можам ім забясьпечыць найлепшыя ўмовы ўтрыманьня, яны «выбываюць з абарачэньня».

Ультрамясныя замежныя пароды — пэтрэн і дзюрок (абедзьве з ЗША) — выкарыстоўваюць у нас для паляпшэньня беларускіх сьвіней. Ёсьць і свая адмысловая — беларуская мясная парода, выведзеная шляхам складанага скрыжаваньня з удзелам пяці спэцыялізаваных пародаў. Яна выкарыстоўваецца каля 15 гадоў. Спэцыялісты кажуць, што гэта таварная прадукцыя, адпаведная патрабаваньням міжнароднага рынку — з высокімі мяснымі якасьцямі: выхад тушы складае 70—75% ад масы, выхад мяса ў тушы — да 60%.

Аднак усяго гэтага недастаткова. Вядучы навуковы супрацоўнік лябараторыі М.Лобана, дацэнтка Тацяна Цімашэнка кажа, што беларускі дзюрок будзе да 2005 г. Завозіць дзюркоў будуць з Польшчы, скрыжоўваць зь беларускай мясной, эстонскай бэконнай, ляндрасамі — сэлекцыянаваць. Эканамічны эфэкт ад укараненьня новай пароды складзе 60 млрд руб.

**Адам Воршыч**

Працяг са старонкі 9.

# Дзесяць тысячаў гадоў разам



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

**Разам з распадам калгаснага ладу мы станем сьведкамі й непазьбежнае рэвалюцыі ў жывёлагадоўлі.**

Аслоў (асьлюкоў, вісьлюкоў) трымалі збольшага ў гарадах, для патрэбаў манаства, якому забаранялася езьдзіць верхам, і габрэйства, з тае ж нагоды. Зрэшты, і людзі паспалітыя ў мястэчках аддавалі перавагу вослікам: цяглавая сіла блізу конскае, затое на дзьве траціны меней трэба фуражу.

Татары гадавалі часам і калматых двухгорбых вярблюдаў. А пры магілёўскай ратушы вярблюды былі папросту ў «штаце», каб несьці на гарадзкіх парадах паланкіны з алегарычнымі кампазыцыямі.

Крыху інакшым ад цяперашняга быў і склад птаства на панадворках. Яно было разнастайнейшым. Куды болей, чым сёньня, гадавалі качкі. Не былі дзівам і цацаркі, запазычаныя з Турцыі. У паноў звычайнай птушкаю быў фазан, пёры якога гэтак надаваліся для аграфаў на шляхецкія шапкі. Пры тым гэта былі ня дзікія фазаны, якіх у прыродзе паўтара тузіна відаў, а свойскія, зьмяшаныя, сэлекцыянаваныя ў нашых засьценках. У старасьвецкія часы двары нашае шляхты часам нагадвалі заасады.

А былі й сапраўдныя зьвярынцы, у якіх разводзілі й гадавалі зьвяроў на ежу й для спартовага паляваньня. Радзівілы, Сапегі, Тызэнгаўзы мелі сур'ёзныя зьверынецкія гаспадаркі на тысячы галоваў сарнаў, даніэляў, казуляў, аленяў... Сур'ёзная, між іншым, была крыніца харчу, скураў, рагоў. Відавочна, тыя традыцыі ўтрыманьня зьвярынцаў могуць быць адроджаныя. І з самай што ні ёсьць карыснай мэтаю. Так, ужо цяпер многія гаспадаркі на Магілёўшчыне гадуюць азіяцкіх плямістых аленяў. Ня толькі дзеля каштоўных скураў і далікатэснага мяса, але й дзеля пантаў — маладых рагоў, зь якіх вырабляюць надта дарагія й патрэбныя лекі.

У другой палове XVIII ст., за часоў Асьветніцтва, магнатэрыя рабіла сур'ёзныя захады дзеля ўніфікацыі племянной жывёлагадоўлі. Завозіліся каровы тырольскае й галяндзкае пародаў, сьвіньні з Ангельшчыны й зь Нямеччыны, авечкі з Гішпаніі й Францыі. І гэтая дзейнасьць дала свой сур'ёзны плён. Беларусь стала пастаўляць у Эўропу высакаякасныя сыры, скуры й воўну ў прамысловых маштабах. Закруціліся машыны на нашых мануфактурах, вырабляючы нашае, не чужое.

Але той пэрыяд драматычна скончыўся з падзеламі Рэчы Паспалітае й вайною 1812 г. Ад панскіх статкаў засталіся адно напамінам тыя чорныя кароўкі-«галяндкі», што цяпер гадуюцца ў сялянскіх дварах.

Адраджэньне жывёлагадоўлі ў Беларусі пачалося толькі пры канцы 1840-х. Прыкладна ў гэты час ізноў вяртаецца мода на завоз высокапрадукцыйных пародаў жывёлы з Эўропы. Адно толькі ў гомельскіх уладаньнях Паскевічаў было пад 18 тыс. танкарунных авечак-мерыносаў. Зьявіліся чыстапародныя статкі коней зь Нямеччыны й Ангельшчыны, козы з Францыі й Швайцарыі ды багата чаго яшчэ. Тым часам цалкам ігнараваліся дасягненьні мясцовае сэлекцыі. Пакрысе зьніклі ці ня ўсе тутэйшыя пароды быдла.

Гэтая тэндэнцыя перахавалася й у XX ст., калі пытаньні індустрыялізацыі сельскае гаспадаркі цалкам засьцілі ўсё іншае. Зьявіліся ў нас цалкам асьлюкі, кашмірскія козы, урэшце, валы, што гэтак хараша апетыя ў фальклёры й мастацтве. Дзясяткі тутэйшых пародаў коней, кароваў, сьвіней, якіх мы можам убачыць на старых малюнках, ужо не існуюць. Уніфікацыя савецкае гаспадаркі ў Беларусі нават авечак паставіла на мяжу зьнікненьня. Навошта беларусам авечкі, калі іх росьцяць у Казахстане? Навошта тут коні, калі яны ёсьць на Каўказе? Мусілі застацца адно дзьве пароды кароваў — чорна-пярэстая ды чырвоная — і дзьве сьвіней — ББС1 ды ББС2.

Будучыня беларускіх жывёлагадоўлі й птушкагадоўлі выглядае пакуль няпэўна. Але тэндэнцыі відавочныя. Гэтак, высьвятляецца, можна з прыбыткам гадаваць у нас страўсаў. На рынках і ў крамах бракуе бараніны. Вялізарным попытам карыстаецца казінае малако, што гэтакае патрэбнае дзецям, найперш у гарадах. У сваю чаргу, калі браць нацыянальны маштаб, дык перавытворчасьць сьвініны відавочная. Прыбыткі ад яе параўнальна невялікія, бо пра аніякі экспарт на Захад гаворкі няма. Няўхільна, амаль натуральным шляхам скарачаецца й колькасьць буйнога рагатага тавару.

Таму разам з распадам калгаснага ладу мы, хутчэй за ўсё, станем сьведкамі й чарговае рэвалюцыі ў жывёлагадоўлі, зьмены прыярытэтаў, зьмяншэньня маштабаў паасобных статкаў. Рынкавыя зьмены прынясуць і новыя ідэі. Чаму, напрыклад, не аднавіць статкі паўдзікіх сьвіней, што колісь пасьвіліся ў дубровах? Колісь тое самае за сабою пакінулі баскі — і маюць сёньня самыя дарагія ў Эўропе далікатэсныя кумпякі. Чаму б не заняцца конегадоўляю для спорту, турызму й на экспарт мяса туды, дзе яго ядуць? А мо нехта з адмысловых зоймецца аднаўленьнем айчыннае сэлекцыі? Дзякаваць Богу, нашае травы хопіць на ўсіх! І на пушыстых козаў, і на пародзістых авечак, на каровак ды вослікаў. Усё ж пражылі мы зь імі дзесяць тысячаў гадоў разам.

**Гары Куманецкі**



## Дзень народзінаў Содэрбэрг

29 сакавіка адсьвяткавала 45-годзьдзе кіраўнічка Беларускай суполкі Швэцыі Марыя Содэрбэрг. Марыя — вядомая фотажурналістка. Цікавасьць да Беларусі прыйшла да яе ў 1988 г. Падчас працы ў Аўганістане яна сустрэла ў палоне хлопцаў-жаўнераў з Палесься.

У 1997 г. разам з славутым польскім пісьменьнікам Рышардам Капусьцінскім Марыя наведала Пінск — ягоную родную мясьціну. Вынікам вандроўкі стала кніга «Візыт у Пінск», выдадзеная Швэдзкім інстытутам.

У тым самым годзе зь вялікім посьпехам у шэрагу швэдзкіх гарадоў прайшла фотавыстава М.Содэрбэрг «Беларусь — адно падарожжа». У 2000 г. адчынілася новая выстава «Пікнік», прысьвечаная праблеме правоў чалавека ў Беларусі. Цяпер рыхтуецца выстава «Палесьсе».

З 1998 г. Марыя — кіраўнічка суполкі «Беларусь» і рэдактарка сайту www.vitryssland.nu — аднаго з найбольш зьмястоўных заходніх сайтаў, прысьвечаных Беларусі. На запрашэньне суполкі «Беларусь» Швэцыю наведвалі Быкаў, Шэрман, Разанаў, Маркевіч.

У 2003 г. Марыя падрыхтавала конкурс маладзевай паэзіі ў Пінску. Пераможцы наведалі швэдзкі кніжны кірмаш у Гётэбарзе. З парады Марыі шмат швэдзкіх грамадзкіх суполак знайшлі партнэраў у Беларусі. За апошнія пяць гадоў М.Содэрбэрг больш за 20 разоў наведала Беларусь. Яе артыкулы пра нашу краіну друкавалі найбуйнейшыя швэдзкія газэты.

**Андрэй Катлярчук, спэц. кар. «НН» у Стакгольме**

## Марыя Захарэвіч — акторка году

У Міжнародны дзень тэатру, 27 сакавіка, адбылося ўрачыстае ўручэньне тэатральных узнагародаў. Акторка Купалаўскага тэатру Марыя Захарэвіч атрымала сёлетнюю «Крышталёвую Паўлінку». Сярод іншых прэміяў сёлета ўпершыню ўручалі «Крышталёвага анёлка» — прыз дзеячам лялечных тэатраў. Першым яго ляўрэатам стаў актор Рэспубліканскага тэатру лялек Уладзіслаў Уласаў.

## Фільм пра Быкава па-за пракатам

Дзяржрэгістар кінавідэафільмаў пры Міністэрстве культуры не дазваляе паказваць на тэлебачаньні й у пракаце фільм Ірыны Пісьменнай і Мікалая Дзінава «Доўгая дарога дадому... Рэквіем», прысьвечаны Васілю Быкаву. Чаму? Бо фільм недастаткова якасны. Аўтарка фільму І.Пісьменная бачыць у адмове палітычныя прычыны: «Сьпярша спасылаліся, што ўсё вырашыць камісія па гвалце і парнаграфіі. А цяпер кажуць, што будуць стварaць новую камісію, бо гэта выклікана ідэалягічнай неабходнасьцю».

У 26-хвілінную напаўаматарскую стужку ўвайшлі ўспаміны сяброў Быкава — Рыгора Барадуліна, Анатоля Вярцінскага, Валянціна Тараса, Генадзя Бураўкіна, здымкі ў менскай кватэры пісьменьніка. Без унясеньня ў дзяржрэгістар у Беларусі аўтары могуць паказваць фільм толькі прыватным чынам, на відэакасэтах.

## Кніга пра Мулявіна

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» зьбіраецца выдаць кнігу пра кіраўніка «Песьняроў» пад назвам «Нота лёсу». У яе ўвойдуць дакумэнты з архіву сьпевака, успаміны блізкіх, інтэрвію, фатаздымкі, матэрыялы з фальклёрных экспэдыцыяў. Прэзэнтацыя кнігі, 20-ці аўдыёдыскаў, дакумэнтальнага фільму «Гучаньне жыцьця» мае адбыцца 17 чэрвеня на «Славянскім базары» ў Віцебску.

## З тураўцаў зьбіраюць грошы

Тураў пачаў падрыхтоўку да Дня беларускага пісьменства: даводзяць да ладу ўстановы культуры і адукацыі, а таксама пашыраюць плошчы краязнаўчага музэю. З абласнога бюджэту на гэтыя мэты вылучана 300 млн руб. У Жыткавіцкім раёне, дзе месьціцца Тураў, абвешчаны збор сродкаў сярод насельніцтва «для рамонтна-аднаўленчых і рэстаўрацыйных работаў».

## Кніга Яна Паўла II

Папа Рымскі скончыў працу над кнігай-аўтабіяграфіяй «Уставайце і хадзеце». У папярэдняй аўтабіяграфіі «Дар і тайна» Папа распавядаў пра сваё юнацтва. Новая кніга пачынаецца з 1958 г., калі сьвятар Караль Вайтыла стаў біскупам. Частку кнігі Папа надыктаваў, а частку напісаў уласнаручна па-польску. Італьянскае выдавецтва «Mondadori» мае выдаць кнігу ў траўні, на 84-годзьдзе Яна Паўла II.

## Помнік невядомаму паэту

У горадзе Сарока (Малдова) 27 сакавіка быў адкрыты помнік невядомаму паэту — архітэктурны комплекс у выглядзе сьвечкі, узьнесенай на вышыню ў некалькі дзясяткаў мэтраў над Днястром. Да сьвечкі вядуць 600 прыступак. Каля першай зь іх ляжыць мэмарыяльны камень з надпісам «Падарожны, спыніся! Наверсе гарыць сьвечка падзякі». Ідэя помніка належыць пісьменьніку Іёну Друцэ.

## Роб-Грые стаў неўміручым

Француская акадэмія абрала новым чальцом пісьменьніка Алена Роб-Грые, аднаго з найбольш значных прадстаўнікоў францускага «новага раману» і кінарэжысэра. Француская акадэмія, заснаваная ў 1635 г. кардыналам Рышэльё, мусіць мець 40 чальцоў, званых «Неўміручымі». 81-гадовы Роб-Грые (аўтар раманаў «Рэўнасьць», «У лябірынце», «Праект рэвалюцыі для Нью-Ёрку» і інш.) — агратэхнік з адукацыі. Беларускія пераклады з Роб-Грые, зробленыя Зьмітром Коласам, яшчэ чакаюць свайго выдаўца.

**АВ**



Фота з палескага цыклу Марыі Содэрбэрг.

### Купалаўскі тэатар

**1—3 красавіка** (чц-сб) — «Чорная панна Нясьвіжу». Містычная легенда аб каханьні

**3 красавіка** (сб) — «Беларусь у фантастычных апавяданьнях». Ян Баршчэўскі. (Малая сцэна)

**4 красавіка** (ндз) — «Афрыка». Казка-мюзыкл (пачатак аб 11.30); «Дзіўная місыс Сэвідж. Дж.Патрык». Камэдыя

**6 красавіка** (аўт) — «Памінальная малітва». Камэдыя

### Опэра

**1 красавіка** (чц) — «Баль-маскарад»

**3 красавіка** (сб) — «Багема»

**8 красавіка** (чц) — «Набука2

### Балет

**2 красавіка** (пт) — «Рамэо і Джульета»

**4 красавіка** (ндз) — «Беласьнежка і сем гномаў» (11.30)

**6 красавіка** (аўт) — «Эсмэральда»

**7 красавіка** (ср) — «Прыгажуня ў сонным лесе». Балет-фэерыя

### Музычны тэатар

**1 красавіка** (чц) — «Вясёлая ўдава». Апэрэта

**2 красавіка** (пт) — «Мэфіста». У.Кандрусевіч. Балет

**3 красавіка** (сб) — «Бураціна.by» (прэм’ера). Мюзыкл для дзяцей і дарослых

**4 красавіка** (ндз) — «Айбаліт-2002». Мюзыкл для дзяцей і дарослых; Цыганскі барон. Камічная опэра

**7 красавіка** (ср) — «Даратэя». Камічная опэра

**8 красавіка** (чц) — «Капялюш Напалеона»

### Тэатар імя Горкага

**1, 5 красавіка** (чц, пн) — «Дэтэктар хлусьні». Камэдыя

**2 красавіка** (пт) — «Суцяшальнік удоваў». Фарс па-італьянску

**3 красавіка** (сб) — «Анджэла ды іншыя». Драматычныя гісторыі ў сучасных рытмах

**4 красавіка** (ндз) — «Перад захадам сонца». Гісторыя каханьня

**6 красавіка** (аўт) — Адзіны спадкаемец». Камэдыя

### Моладзевы тэатар

**1 красавіка** (чц) — «Акадэмія сьмеху». Камэдыя. Прэм’ера

**2 красавіка** (пт) — «Трамвай «Жаданьне». Псыхалягічная драма

**3 красавіка** (сб) — «На шчупакоў загад» (12.00); «Хітрамудрая закаханая». Камэдыя

**4 красавіка** (ндз) — «Акадэмія сьмеху». Камэдыя. Прэм’ера

### Тэатар юнага гледача

**1, 3 красавіка** (чц, сб) — «Паліяна». Прэм’ера. (12.00)

**2 красавіка** (пт) — «Апошняя дуэль». Фантазія на тэму жыцьця, сьмерці і каханьня А.С.Пушкіна. Экспэрымэнтальная сцэна. Прэм’ера

### Тэатар беларускай драматургіі

**1, 2 красавіка** (чц, пт) — «Містэр розыгрыш Гульні дарослых». Прэм’ера.

**2 красавіка** (пт) — «Толькі дурні сумуюць». Спэктакль-прыпавесьць

**3—4 красавіка** (сб-ндз) — «Крыштальны туфлік». Баль-маскарад (12.00)

**4 красавіка** (ндз) — «Адэль». Гісторыя каханьня

**6 красавіка** (аўт) — «Песьні ваўка». Драматычна-пластычная элегія

**7 красавіка** (сер) — «Жанчыны Бэргмана»

**8 красавіка** (чц) — «Чорны квадрат». Кабарэ-дэтэктыў

### Хрыстафор

**1—4 красавіка** (чц-ндз) — «Хоць стой — хоць падай». Гумарыстычная шоў-праграма. Прэм’ера

## КІНААФІША

**«Аўрора»** (253-33-60)

«Дом зь пяску і туману»: **2—4** (пт-ндз) 20.30.

«Другі бок пасьцелі»***: **2** (пт) 17.00, 19.00, 21.00; **3, 4** (сб, ндз) 15.00, 17.00, 19.00, 21.00.

**«Берасьце»** (272-87-91)

«Скарбы Амазонкі»: **2—4** (пт-ндз) 16.30, 21.00.

«Дзень Хамячка»: **2** (пт) 14.00, 18.50; **3, 4** (сб, ндз) 14.00 (іл), 18.50.

**«Кастрычнік»** (232-93-25)

«Каханьне паводле правілаў... і без»: **2** (пт) 13.40, 16.00, 18.30, 21.00; **3, 4** (сб, ндз) 13.40 (іл), 16.00, 18.30, 21.00.

**«Масква»** (223-27-10)

«Каханьне паводле правілаў... і без»: **2** (пт) 16.20, 18.40, 21.00; **3** (сб) 14.00, 16.20, 18.40, 21.00; **4** (ндз) 14.00 (іл), 16.20, 18.40, 21.00.

**«Мір»** (284-37-71)

«Буйная рыба»: **2** (пт) 16.40 (іл), 21.10; **3, 4** (сб, ндз) 16.40, 21.10.

«Летуценьнікі»****: **2—4** (пт-ндз) 19.00.

**«Перамога»** (223-77-66)

«Заплямленая рэпутацыя»***: **2—4** (пт-ндз) 19.00.

«Дзюплекс»: **2—4** (пт-ндз) 21.10.

«Іншы сьвет»: **2** (пт) 16.40; **3, 4** (сб, ндз) 16.40 (іл).

**«Піянер»** (227-64-87)

«Апошні самурай»: **2—4** (пт-ндз) 16.00, 20.40.

«Старыя»: **2—4** (пт-ндз) 18.40.

«Апошняя фантазія»: **3, 4** (сб, ндз) 12.00.

**«Цэнтральны»** (220-34-16)

«Кармэн»: **2—4** (пт-ндз) 18.30, 21.00.

«Цяжкасьці перакладу»: **2** (пт) 14.00; **3, 4** (сб, ндз) 14.00 (іл).

(іл) — ільготны сэанс (скідка 50% для ўсіх гледачоў)

Рэйтынгавыя абмежаваньні:
*** — дзеці да 16 год не дапускаюцца;
**** — дарослым з 18 год.

### Юнаму гледачу:

**«Аўрора»**

«Дзеці шпіёнаў-3D: гульня скончана»: **2** (пт) 16.30, 18.30; **3, 4** (сб, ндз) 12.30, 16.30, 18.30.

«Ліла і Стыч»: **2—4** (пт-ндз) 14.20.

**«Берасьце»**

«Прыгоды Бураціна»: **3, 4** (сб, ндз) 12.00.

**«Мір»**

«Блізард»: **3, 4** (сб, ндз) 14.00.

**«Перамога»**

«У пошуках Нэма»: **2** (пт) 14.40; **3, 4** (сб, ндз) 12.40, 14.40.

**«Піянер»**

«Вовачка»: **2** (пт) 14.00.

«Кашэчыя лісты»: **2** (пт) 12.00; **3, 4** (сб, ндз) 14.00.

«Ну, пачакай!»: **3, 4** (сб, ндз) 10.30.

МЕНСКАЯ КІНАПРЭМ’ЕРА

# Каханьне паводле правілаў… і без

(Something’s Gotta Give)
ЗША, 2003, каляровы, 128 хв.
Жанр: Мэлядраматычная камэдыя
Адзнака: 5 (з 10)

Гэта гісторыя пра недарэчна-пяшчотнае каханьне паміж немаладой ужо жанчынай-драматургам і старым кавалерам. Той зьвальваецца з сардэчным прыступам у доме гераіні пасьля трапных заляцаньняў да ейнай дачкі.

Карціна легкаважна-сьветлая з прадуманай тактоўнай здольнасьцю казытаць да сьмеху і нат калектыўнага рогату з авацыямі, але не раздражняць. Фільм напоўніцу трымаецца на дуэце





Джэка Нікалсана і Даяны Кітан, якія пертвараюць любую павярхоўнасьць рэжысэра й сцэнарыста Нэнсі Мэерс у неабавязковыя і прыемныя жарты.

Кіяну Рыўз засьвяціўся ў нязвыклай для гледачоў ролі закаханага герантафіла, але чакаць мэлядраматычных кепстваў ад яго героя не прыходзіцца, бо сытуацыя рассмоктваецца сама сабой.

Абыгрываньне сюжэту карціны ў мыльнаопэрнай п’есе, якую піша гераіня, — найлепшыя сцэны фільму. Але й тут рэжысэр збаяўся хоць каго-небудзь пакрыўдзіць. Асабліную «падзяку» трэба выказаць мясцовым пракатчыкам за беспрытульны мікрафон у кадрах, але нат гэта зьяўляецца часткай зусім неабавязковага шарму ў карціне.

Фільм разьлічаны на тое, каб не пакідаць у гледачоў *аніякіх* непрыемных пачуцьцяў, — і задачу гэтую выконвае паводле ўсіх правілаў.

**Андрэй Расінскі**

# Рэп жывы



**8 красавіка** беларускія рэпэры масава засьпяваюць па-беларуску. У 18.30 у клюбе «Рэактар» зьбяруцца 10 камандаў, каб прэзэнтаваць складанку беларускага рэпу «Пасадзіў dead RAPку — Rap Not Dead». Сярод выступоўцаў: Аляксандр Памідораў пад «мінусоўку», «Нестандартны варыянт», вядомы з кавэру Вольскага «Паветраны шар», «Please, mr.Shtal» — рэпавы праект блюзмэна Андрэя Плясанава, «Пан Жыжма» — гурт эксвакаліста «IQ-48» Фройда. Апошні прэзэнтуе зусім новы для Беларусі кірунак — фольк-рэп. Адна зь песьняў «Пана Жыжмы» нават зробленая на сэмпл «Ліцьвінаў». Гэта самая буйная акцыя беларускіх рэпэраў за апошнія некалькі гадоў. Квіток каштуе 5500, у дзень канцэрту — 6500 руб.

**Сяргей Будкін**

# Нямецкія словы Разанава



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

Алесь Разанаў экспэрымэнтуе на нямецкай мове

**Ales Rasanau. Wortdichte.** — Steirische Verlagsgesellschaft, 2003




Алесь Разанаў — паэт, чыё імя дасюль гучыць пры абмеркаваньні магчымага намінанта на Нобэлеўскую прэмію ад Беларусі. Апошняя ягоная кніга, выдадзеная на радзіме, пабачыла сьвет пяць гадоў таму. Пасьля чаго беларускі чытач меў падставу згадваць пра існаваньне слупа айчыннай інтэлектуальнай паэзіі адно праз рэдкія часопісныя публікацыі («Arche», «Дзеяслоў»). Па ад'езьдзе паэта ў Нямеччыну (2000 г.), на сутыку стагодзьдзяў, зьявілася знакавая кніга «Гліна. Камень. Жалеза» (Беласток, 2000), амаль не заўважаная крытыкай. У 2002 г. у Нямеччыне выйшлі дзьве кнігі-білінгвы — «Танец з вужакамі» і «Гановэрскія пункціры». Патрапіўшы да вузкага кола літаратурных гурманаў, апошняя спарадзіла змрочныя прагнозы пра згасаньне зоркі выбітнага паэты.

На пачатку году, выпадкова сустрэўшы спадара Алеся ў Менску, атрымаў у падарунак яго новую кнігу, выдадзеную ў Нямеччыне, — «Wortdichte» («Словавершы»). Кніга ўнікальная ня толькі тым, што адкрывае новую паэтычную форму (словавершы вытворныя ад разанаўскіх вершаказаў), але й тым, што не зьяўляецца перакладам, а створаная паэтам ад пачатку па-нямецку. Кожны *словаверш* мае друкаваны й рукапісны (!) варыянты.

Далей прыгадваецца Вазьнясенскі: усе творы выкананыя з ужываньнем графічных сродкаў — «лесьвічак», перагорнутых літараў, колцаў, падкрэсьліваньняў ды іншага «блюзьнерства», што, ствараючы кактэйль сэнсаў і алюзіяў, мае на мэце паказаць тэкставы адбітак пэўнай *рэчы* (люстра, гузік, талерка, мост, нож і інш.). У біяграфічнай частцы сярод прэміяў і ўзнагарод згаданы шэсьць нямецкіх стыпэндыяў, атрыманых Разанавым з 1999 да 2003 г.

**Анатоль Івашчанка**

# Ультракаталіцкая асьветніца

**Францішка Ўршуля Радзівіл. Выбраныя творы.** — Менск: Беларускі кнігазбор, 2003

Прачытаў кнігу невядомае мне аўтаркі. Праўдзівей, імя аўтаркі было мне вядомае даўно, але творы яе — не. Шкадую, што ў мяне няма арыгінальных тэкстаў: хацелася б самому паглядзець, ці належыць Францішка Ўршуля Радзівіл да майстроў слова, да ўплывовых польскіх пісьменьнікаў. На жаль, гэтыя сюжэты — У.Радзівіл і, скажам так, літаратурны працэс Рэчы Паспалітай, У.Радзівіл і яе месца ў гісторыі польскае літаратуры — не акцэнтаваныя аўтаркамі прадмовы Жаннаю Некрашэвіч-Кароткаю і Натальляю Русецкаю. Заадно я зразумеў бы, чым тлумачацца адрозьненьні ў вэрсіфікацыйным майстэрстве паміж паасобнымі п'есамі. Ці гэтыя адрозьненьні запраграмаваныя яснавяльможнаю аўтаркаю, ці ўсё тлумачыцца ўмельствам перакладчыкаў.

Забаўна і нават сапраўды сьмешна бачыць, як пэўныя рэаліі Вялікага Княства Літоўскага У.Радзівіл пераносіць у Сырыю ці Эгіпэт. І думалася: што сказалі б фэміністкі, прачытаўшы «Золата ў агні»? Такая рабская пакорлівасьць жанчыны папросту немагчымая ў хрысьціянскім сьвеце. І такі мужаў садызм (прабачаюся, маркіз дэ Сад яшчэ ў вайну гуляў). Але што зробіш: мы маем узор тэндэнцыйнага мастацтва. На жаль, тлумачачы прыналежнасьць У.Радзівіл да мастакоў эпохі барока, нам не патлумачылі, што гэта была таксама эпоха Контррэфармацыі, то бок і Каталіцкай Рэфармацыі, якую распачаў Папа Павал ІІІ. Царква пачала надаваць выключнае значэньне адукацыі й выхаваньню, асабліва рупячыся пра сям'ю. Адсюль і рыгарысьцкія вымогі да жанчыны — жонкі і маці. І ў гэтым сэнсе Ўршуля Радзівіл — каталіцкая, нават ультракаталіцкая пісьменьніца. І ня толькі пісьменьніца: яна — маці князя Караля Станіслава Пане Каханку, ультракаталіка, героя Барскай канфэдэрацыі.

Скажам таксама, што У.Радзівіл — асьветніца. І адзначым: для яе найперш важная асьвета маральная. Яе мастацкія творы тэндэнцыйныя, адарваныя ад жыцьця краіны і народу, але тэндэнцыя нам сымпатычная: дабро заўсёды перамагае зло, справядлівасьць бярэ верх. Яе твор «Гульня фартуны», калі б былі іншы час і абставіны, мог бы стацца прыгодніцкім раманам.

Дачка свайго асяродзьдзя, каталічка, княгіня Радзівіл усё ж заставалася жывым чалавекам. І ў яе творах прарываюцца і гульлівасьць («Партрэт пэўнага ксяндза» нават трохі і пікантны, як на той час), і нават малюнкі рэальнага жыцьця, як у вершы «Раніца. Стансы».

Наколькі я разумею, У.Радзівіл была вядомая ў свой час больш як аўтарка п'есаў, што выйшлі асобнаю кніжкаю ў Жоўкве (праз паўтара стагодзьдзя там выдала свае кніжачкі і Цётка). Што тычыцца вершаў ды лістоў, дык іх зьбіралі для гэтае кнігі (укладальнік Сяргей Кавалёў) па архівах.

Беларускае выданьне твораў У.Радзівіл багацейшае за польскае. Што яно дае нам? Не памылюся, калі скажу: гэтаю кнігаю запаўняецца яшчэ адна лякуна ў гісторыі культуры Беларусі.

Не згаджуся з аўтаркамі прадмовы, якія пішуць, што У.Радзівіл «стаяла ля вытокаў беларускага прыгожага пісьменства». Яна стаяла ля вытокаў нашае літаратуры апасродкавана. Ад яе лінія ідзе да яшчэ аднаго драматурга — Юльяна Урсына Нямцэвіча (таксама лякуна, яшчэ адзін пакуль што незьбеларушаны аўтар-зямляк), ад яго — да геніяльнага Адама, а там і Сыракомля, і Дунін-Марцінкевіч... І таму прывітайма выхад кнігі княгіні Радзівіл па-беларуску.

**Анатоль Сідарэвіч**

# У сіняй сэрыі

**Фёдар Дастаеўскі. Выбраныя творы:** Перакл. з расейск. А.Каляды, прадмова А.Рагулі. — Менск: Беларускі кнігазбор, 2004

На пачатку існаваньня адноўленай «НН» Сяргей Дубавец зьмясьціў артыкул, у якім засьцерагаў рабіць далекасяжныя высновы з таго факту, што Дастаеўскі меў беларускае паходжаньне. У тым артыкуле было пасьлядоўна паказана, чаму Дастаеўскі — у сваёй сутнасьці расейскі пісьменьнік, чаму яго нашваюць дасьледчыкам — а часам і стваральнікам! — «расейскай душы». Лягічным выглядае рашэньне «Кнігазбору» выдаць Дастаеўскага ў сэрыі «Замежная літаратура». Цікава, што творы Булгарына выйшлі летась у тым жа выдавецтве ў «беларускай» сэрыі. Напраўду, у булгарынскай мэнтальнасьці можна ўбачыць куды больш беларускіх рысаў, чым у творчасьці сапраўднага расейскага клясыка Дастаеўскага…

У «Выбраных творах» зьмешчаныя раманы «Прыніжаныя і зьняважаныя» і «Гулец», а таксама аповесьці «Белыя ночы» (якую сам Дастаеўскі таксама ўважаў за раман) ды «Дзядзечкаў сон». Гэты том ёсьць як бы працягам апублікаваных у 2002 г. у тым жа выдавецтве — але паза сэрыяй — «Аповесьцяў і апавяданьняў» Ф.Дастаеўскага. У той кнізе былі зьмешчаныя яго аповесьці «Слабое сэрца», «Нетачка Нязванава», «Запіскі з падпольля» ды 17 апавяданьняў, у тым ліку знакамітая «Ціхмяная».

Абодва названыя выданьні твораў Дастаеўскага — плён ахвярнай працы прафэсара Акадэміі мастацтваў Андрэя Каляды. У сёньняшнім імклівым часе трэба мець не абы-якую сілу волі, каб засесьці за пераклады раманаў-«цаглінаў». Яшчэ больш адвагі й імпэту трэба мець у пошуку сродкаў на ажыцьцяўленьне такога выданьня.

Каляда спрабаваў свае сілы ў перакладзе і раней (Чэхаў і Купрын, Кабылянская і Булгакаў, Набокаў і Ібсэн, Джойс і Мрожак). На жаль, практычна нічога з таго дагэтуль не надрукавана… Каляда ставіцца да арыгіналу абярэжна — часам нават, можа, і залішне, дакладна перадае складаныя моўныя канструкцыі Дастаеўскага. Мова перакладу — не «трасянчаная», хоць часам і сухаватая.

Асобна трэба зьвярнуць увагу на грунтоўную прадмову прафэсара Аляксея Рагулі. Ён піша, што «сьмехавая народная культура не змагла ў Расеі адыграць ролю, падобную да той, якую яна адыграла ў гісторыі, напрыклад, францускай, украінскай ці беларускай культуры», і што — як вынік — «Ф.Дастаеўскі абапіраўся на расейскі тып рамантычнага мысьленьня, якія былі псыхалягічнай рэальнасьцю ў XIX ст.».

Не пакіньце па-за ўвагай дыхтоўнага кнігазбораўскага тому ў сіняй вокладцы.



Фрагмэнт карціны Ільлі Глазунова «Ф.М.Дастаеўскі». 1956 г.

**Лявон Баршчэўскі**

## НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

**Віктар Альшэўскі = Victar Alshevsky.** — Менск: Новік, 2003. — 396 с. 1000 ас.

У альбоме зьмешчаны жывапіс Віктара Альшэўскага, а таксама артыкулы пра ягоную творчасьць, напісаныя вядомымі мастакамі й дасьледчыкамі мастацтва. Тут зьмешчаныя і дзёньнікавыя запісы аўтара — «Фрагмэнты Бабілёнскай вежы (дыярыюш мастака)». У «Акадэмкнізе» цана 80 тыс. руб.

**Плян З. Таксыдэрмічны практыкум.** — Менск: Логвінаў, 2004. — 52 с. 200 ас.

**Букчин С. Тайная свобода: Разыскания. Этюды. Память. Сцена и экран. Книжный развал.** — Менск: Энцыклапэдыкс, 2004. — 520 с. 300 ас.

У кнігу ўвайшлі матэрыялы, што ствараліся ў пэрыяд пабудовы й «росквіту» дэмакратычнай дзяржавы — ад канца 1980-х і да сёньня. У кнізе зьмешчаныя гісторыка-літаратурныя нарысы, прысьвечаныя аўтарам «Энэіды навыварат» і «Тараса на Парнасе», першай беларускай фальклярыстцы Лізавеце Паўлоўскай, швайцарскаму пэрыяду жыцьця Касьцюшкі, эцюды й эсэ пра расейскіх паэтаў, а таксама роздумы пра грамадзкія праблемы — да прыкладу, пра «славянскую ідэю». Асобны раздзел склалі рэцэнзіі на айчынныя й замежныя кніжныя выданьні. Пытайцеся на выставе ў ТБМ.

**Дастаеўскі Ф. Выбраныя творы:** Перакл. з рас. А.Каляды; Прадм. А.Рагулі. — Менск: Беларускі кнігазбор, 2004. — 672 с. — (Беларускі кнігазбор; Сэрыя 3, Замежная літ.). 1000 ас.

У «Цэнтральнай кнігарні» цана 3840 руб.

**Дубровский Н. Бессмертие подвига:** Док. повесть. — Менск: Беларусь, 2004. — 112 с. 1000 ас.

Аўтар гэтай дакумэнтальна-мастацкай кнігі быў асабіста знаёмы з героямі аповеду — Марыяй Восіпавай, Аленай Мазаник, Валянцінай Шацкай, Мікалаем Пахлябаевым, якія ў верасьні 1943 г. забілі гаўляйтара Вільгельма Кубэ.

**Корзун У. Успаміны й роздум.** — Маладэчна, 2004. — 110 с. — (Бібліятэчка час. «Кufэрак Віленшчыны». № 7). 298 ас.

Прыватны рукапіс, напісаны ў 1970-я як споведзь перад сваякамі-нашчадкамі, сёньня прыцягне ўвагу гісторыкаў, этнографаў. Аўтар успамінаў — шараговы грамадзянін вялікае савецкае краіны, настаўнік беларускае мовы — ахапіў у сваіх запісах пэрыяд, большы за 50 гадоў. Грамадзянская вайна, калектывізацыя, «хапун», другая сусьветная й пасьляваенныя нястачы апісаныя У.Корзунам стрымана, самакрытычна. «Час, калі кожны чалавек быў уласнасьцю дзяржавы, як рэч», — такую страшную характарыстыку даў аўтар гадам, пра якія піша. Пытайцеся на выставе ва Ўправе БНФ.

**Пракаловіч І., Вансовіч А., Заяц І. Манькавічы:** Гісторыка-геаграфічны нарыс. — Паставы, 2004. — 60 с.: іл. — (Былыя мястэчкі Паазер'я).

Вёска Манькавічы, дзе ў 2001 г. налічылі ўсяго 26 жыхароў, колісь была слаўным мястэчкам з царквою, капліцаю й старадаўняй сядзібай ды паркам. Тут ладзіліся фэсты, працавала школа. Менавіта ў Манькавіцкай пачатковцы вучыўся ў свой час Уладзімер Дубоўка. Аўтары брашуры рупліва аднаўляюць гісторыю паселішча, апісваюць адметныя мясьціны Манькавічаў, падаюць успаміны жыхароў і зьвесткі, датычныя ролі мястэчка ў творчасьці Дубоўкі. Сюды ж уключаная аўтабіяграфічная проза паэта, дзе прыгадваецца манькавіцкае маленства. Кніга створаная зь любоўю. Колькі яшчэ вёсачак чакаюць такіх летапісцаў...

**Скрадзеная перамога: Да 60-годзьдзя Вялікай Перамогі.** — 23 с. — (Бібліятэчка народнага баявога лістка «Дуброўскі настрой»). 3000 ас.

У якасьці эпіграфу да брашуры скарыстаныя словы селяніна зь вёскі Кабульшчына: «Амэрыканцы вызвалілі немцаў ад фашызму. Хто вызваліць нас ад нашага фашызму?» Аўтар у экспрэсіўнай манеры даводзіць, што фашызм і камунізм аднолькавыя ў сваёй сутнасьці й з гэтае прычыны перамога над таталітарызмам у 1945 г. не была поўнаю. Сёньняшні беларускі рэжым «ня мае права адзначаць Дзень Перамогі», бо ў «вольнай краіне гэты дзень будзе днём ушанаваньня загінулых і днём напамінку жывым, што таталітарызм, якога б колеру ён ні быў, ёсьць найгоршым ворагам людзтва». Жанр выданьня — агітацыйная брашура.

**Бешанков В. Брестская крепость.** — Мінск: Беларусь, 2004. — 158 с.: ил. 2000 ас.

Муры Берасьцейскай крэпасьці, што налічваюць ужо болей як 170 гадоў, да сёньня хаваюць шмат таямніцаў. У кнізе прыведзеныя здымкі канца XIX — пачатку XX ст., сучасныя выявы крэпасьці-музэю й распаведзена пра будаўніцтва ды гісторыю колішняга фарпосту імпэрыі.

**Мартыненко И. Правовая защита культурного наследия:** Навуч. дапаможнік. — Менск: ЭГУ, 2003. — 240 с. 250 ас.

Упершыню ў Беларусі выйшаў навучальны дапаможнік гэткага кшталту. Цана ў «Акадэмкнізе» 5750 руб.

**Мезенко А. Имя внутригородского объекта в истории: Об урбанизмах Беларуси XIV—XX в.** — Мінск: Вышэйшая школа, 2003. — 301 с. 400 ас.

У кнігарні «Веды» цана 27740 руб.

**Чудаков М. Конституционный процесс в Беларуси (1447—1996 г.)** / Академия управления при Президенте Беларуси. — Минск, 2004. — 327 с. 500 ас.

Аўтар дасьледаваньня вылучае пяць этапаў станаўленьня беларускай дзяржаўнасьці й характарызуе адпаведныя ім помнікі канстытуцыйнага права, у тым ліку й Статуты ВКЛ, Канстытуцыю 3 траўня 1791 г., Устаўныя граматы БНР, першую Канстытуцыю ССРБ. Апошнія раздзелы кнігі прысьвечаныя сёньняшняму Асноўнаму закону з улікам зьменаў 1996 г. Аб'ёмісты дадатак уключае тэксты прававых дакумэнтаў.

**Тацяна Вабішчэвіч**

## Па старонках «Моладзі»

«Месца выданьня — Парыж» — гэтак называецца кніга, што выйшла ў «Беларускім кнігазборы» і якою запачаткавалася бібліятэка ЗБС «Бацькаўшчына». Кнігу склалі выбраныя старонкі часопісу «Моладзь», што выдавалі беларусы ў Парыжы ў 1948—54 г. Цікавыя асобы, архіўныя матэрыялы, факты з жыцьця паваеннай хвалі эміграцыі... Прэзэнтацыя кнігі адбудзецца 2 красавіка а 18.30 у чытальнай залі Дому літаратара.





АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

запісы

# Шарм невытлумачальны

Франц Сіўко

* * *

У Бешанковіцкую парафію ксёндз малады прыехаў, Алег Будкевіч. І за кароткі час прывабіў ня толькі каталікоў, а і шмат людзей старонньніх. Карпатліваю працай сваёй, абыходлівасьцю, беларускасьцю непадробнаю, выкшталцонай. Гэтаксама годна і апантана Аляксандар Рагіня на Пастаўшчыне, Вячаслаў Пялінак у Друі і Павяцьці шчыруюць. З дабром ідуць да людзей, дабром і адгукаецца.

А мы ўсё, бязьдзейнасьць уласную апраўдваючы, на люд наракаем. І цёмны ён у нас, і дурны, і збыдлячаны. Нібыта самі не з таго катуха.

* * *

Дзед у восемдзесят з гакам на ровары за тры вярсты прыяжджаў галіцца. У портках спартовых, на галаве — капялюш, вакол шыі — хусьціна чырвоная накшталт піянерскага гальштука. Усё жыцьцё — у вёсцы, у працы пякельнай, а вось жа — хоць у кіно за героя-палюбоўніка. Аскепак цывілізацыі гаспадарскай, трывушчасьці й годнасьці ўвасабленьне. І шмат такіх, толькі не заўважаем, самаедствам ды разборкамі сваімі занятыя.

* * *

У спадарыні Эвы, полькі з Канады, муж у Маскве працуе.

— Шмат зарабляе? — пытаемся неяк.

— О, нават казаць няёмка, — багачка ўсьміхаецца. — Паверце, дастаткова, каб запрасіць вас у кавярню.

На наступны дзень, падчас экскурсіі ў Асызы, непярэліўкі ў нашай Эвы: партманэт з сумкі выцягнулі.

— Восемдзесят даляраў! — заенчыла роспачліва. — Вось, мела запрасіць вас дзе пасядзець — дык цяпер ужо выбачайце!

* * *

Маці на вадзе дзьвінскай гадавалася. Падчас вайны дзіцём пошту перавозіла на лодцы на латыскі бок. Лодка перакулілася на сярэдзіне ракі, мусіла малая ратавацца. Да берагу даплыла, а лістоў з далоні ня выпусьціла. Але вады з тае пары баяцца стала.

Калі быў клясе ў пятай, выправіліся ўдвух зь ёю ў Бігосава трускалкі прадаваць. А перавозчык — п'янюткі, ды яшчэ і лодку сюды-туды, каб напалохаць, наўмысна гайдае. Памятаю, як прыхінула мяне да сябе і ўсё жагналася.

Незадоўга да яе сьмерці ля ракі разам былі, калі на працу ў Дрысу праз Краслаўшчыну дабіраўся. На хвалі паказала, тузанула да сябе:

— Не плыві, патонеш яшчэ!

Адпіхнуў яе ды і паплыў да другога берагу. Самае большае, пра што па сёньняшні дзень шкадую.

* * *

Ля вадаспаду ва Ўстшэжы, на месцы былой кардоннай фабрыкі, малымі штодзень кулогаліся, рыбу лавілі. І не заўважалі ні харства таго, ні дзівосаў наўкола. Іншыя заўважылі. Цяпер прыяжджаеш улетку — людзі чужыя, засьмечана ўсё, тлумна. Быццам і не сваё ўжо.

* * *

У Сыгулдзе да латыша пажылога — спраўдзіць штосьці — зьвярнуўся. Залапатаў па-свойму злосна ў адказ, ажно сьліна пырснула.

— Ня так нешта? — пытаюся.— Ну, прабачце.

— А как ты ко мне, так я к тебе, — ідзе ў наступ.— Учи язык!

— Вучу, — паказваю размоўнік. — Нетутэйшы я.

— А-а, тогда ладно, — мякчэе. — Извини тогда.

* * *

Падчас дыялекталягічнай практыкі заўважыў: «заходнікі» старыя больш на здароўе скардзяцца, «усходнікі» — на адсутнасьць увагі ды жыцьцё наагул. Зь першымі зразумела ўсё, з другімі… Едзеш дзе-небудзь па Лёзьненшчыне — каб сьвятыня табе, каб цэркаўка. А каму даверыш апошні зямны клопат, як не Яму? Вось і пакутуюць людцы невыкупным болем, мажлівасьці яго пазбыцца ня маючы.

* * *

Як знарок хто падбіраў прозьвішчы старшыняў у нашым паваенным калгасе: Гайдулькін — Мятла — Таўкач. Адзіны, хто парушыў ненадоўга страхавіты той шэраг, — Капуста. А пасьля зноў — Міна… Ня толькі, відаць, дрэва ў навальніцу, як кажуць у нас, «цёнг мае», а і грамадзкае ўладкаваньне.

* * *

Пробашч забараніў ставіць на стол гарэлку падчас хаўтураў па бацьку. Людзі ж — здарожаныя, зубамі ад сьцюжы ляскаюць, прайшоўшы пехатой па бездаражы да могілак ды з могілак каля дзясятка вёрст.

— Грэх мне будзе, як пастаўлю, — кажу. — Так што і на сябе яго бярыце.

Узялі ахвотна. Але як гуртам, супольна — і не такім страшным выдаваў.

* * *

Зь сястрою стрыечнай наўкола возера на міні-трактарку калясім. Дзень, быццам знарок, — сьветлы, сонечны. Твар Ганьнін — чысты, як і надвор'е, — каб смужынка, каб аблачына на лбе. А праз тыдзень, ведаю, суд. Пасьля кампаніі нецьверозай узяўся адзін далязаць, тыцнула нажом — і паваліўся вобзем нежывы.

Дзіўнае адчуваньне — на мяжы двух існаваньняў блізкага чалавека. І памагчы хочацца, і ведаеш, што немагчыма.

* * *

Цётка Анэля зазвычай «Прыму» паліла. Ідзеш, бывала, паўз хату, абавязкова спыніць:

— Папалім?

Паліла ня тоячыся, не хаваючы сваёй слабасьці, хоць жанчына з цыгарэтаю для землякоў маіх — не з ухвальных відовішча. Але ніхто ніколі не папракаў, не пацьвельваўся.

Шарм нейкі мела невытлумачальны — ад старых польскіх часоў, і адчувалі гэта, і ставіліся належным чынам.

* * *

У катавіцкім кляштары кармэлітак босая манашка, мяркуючы з голасу (твар чорным закрыты) — зусім маладая, пра побыт ды ўладкаваньне ўнутрыкляштарнае апавядае. Нашы кабеты слухаюць уважліва, зрэдку пытаньне хто-ніхто задасьць. На тварах жа — няўцямнасьць усясьветная напалову са шкадобай: гэткая маладая, жыць ды жыць ёй, а во ў кляштар — ды строгі які! — падалася! Выпадак той нядаўна зь іншае нагоды згадаўся. Студэнтаў сваіх на спэктакль запрасіў у капліцу. А тут — набажэнства, кленчыць трэба. Такога жаху ды пратэсту ў вачох спаконвеку ня бачыў, як у гэты дзень мне прадэманстравалі.

* * *

Сястра дома заўсёды па-беларуску, зь мёрскім «акцэнтам» размаўляе. Неяк падчас выступленьняў у раёне вырашыў зь пісьменьнікамі пазнаёміць. «Глядзі ж, — папрасіў, — прыйдуць — прывітай, як заўсёды мовіш». Прыходзім па абедзе. «Добры дзень!» — госьці вітаюцца. «Здравствуйте! Проходите, пожалуйста!» — адказвае. Адкуль што ўзялося?

* * *

З ксяндзом-палякам знаёмым моваю колькі часу займаліся. Сякія-такія і посьпехі ўжо былі. А тут — у Піцер у яго камандзіроўка, на сэмінар нейкі. Вярнуўся сумны дахаты.

— Усё, ня буду больш вучыць тваёй мовы!

І распавёў такое. У Піцеры да беларусаў, гэткіх, як ён сам, «сэмінарыстаў», зьвярнуўся па-беларуску — пасьмяяліся, як з блазна.

* * *

Маладыя раз-пораз рукапісы прыносяць — апавесьці, а то і раманы. А самім гадкоў — сямнаццаць-васямнаццаць. Паўшчуваеш за агрэхі, пахваліш за ўседлівасьць. А сам міжволі падумаеш іншым разам: «Калі ж жыць будзеце? Ці ня выйдзе так, што, у маладосьці не напамыляўшыся, пад старасьць тое пачняце рабіць?»

* * *

Бацькі — ва ўладзе, -ізмы працягваюць «дабудоўваць». Дзеці зь цёткамі ды цешчамі — па банках зазвычай, дабрабытам заклапочаныя. Унукі ва ўнівэрсытэтах — эканоміку, права асвойваюць. І пяць гадоў міне, і дзесяць — усё адны і тыя ж прозьвішчы навідавоку застануцца. Далызлыя* бо.

* * *

Клясе ў другой настаўнік наш, Антон Фэліксавіч, вершык загадаў на памяць вывучыць. А ў ім словы такія: «Таварыш, будзь жа пільны, сьвятыя рубяжы…» Два ўрокі мучыліся, вымаўляючы тыя «рубяжы», «будзь жа». Чужое, незразумелае, неарганічнае.

* * *

Бацька вечарамі, пасьля рэпэтыцый у вясковым хоры, песьням нас вучыць. Пры гэтым асабліва чамусьці на «Ленин всегда живой» націскае. Падцягваем, як можам.

— А хто такі Ленін? — пытаемся, адсьпяваўшыся.

— Чалавек.

— Чалавек? А чаму тады ён «всегда живой»?

— Таму што вождь.

— А хто такі вождь?

— Дык ён, Ленін…

* * *

Атрымаеш «сьвятое пісьмо» з прынукаю перапісаць дваццаць восем разоў — і сьцепанешся ад вораху. І выкінуць карціць тую пісаніну ў сьметніцу, бо ведаеш — глупства, і боязна: а раптам сапраўды благое, у ім напрарочанае, збудзецца. Памуляешся гэтак ды і апусьціш у суседзкую скрыню. На наступны дзень глядзіш — тры ўжо ў тваёй скрыні замест таго аднаго.

Вера — фэтыш у нас, сымбаль на ўзроўні памяці, традыцыі перарванай недатручаны парастак.

* * *

Лекар малады, асьпірант, падчас ранішняга абходу першы раз у нашай палаце. Скаргаў — мора, адно моршчыцца пасьпявае будучае сьвяціла ды асадкаю шморгаць у нататнікy. Апошнім да інваліда, што збоч акна, коўдраю па самыя вочы накрыўшыся, ціхмяна ляжыць, падыходзіць.

— Ну, у вас што чуваць?

— Нішто… Дахаты ўжо можна.

— Дахаты! Баліць што?

— Не-е…

— Які вы! Не каб паскардзіцца, як іншыя. Ану пакажыце ногі!

Дзядзька коўдру адкідвае, на прасьціне замест дзьвюх ног — адна, і тая апухлая.

— Вось, а кажаце — нішто.

— Дык і нішто! Было б нешта — то і скардзіўся б.

---

* Далызлыя (дыял.) — прабіўныя.

# Галоўнае — торс

фэльетон

Зранку ў аўторак БТ радасна паведаміла, што ў Гарадзенскім мэдычным інстытуце адбыўся конкурс прыгажосьці. Адбыўся пры нечуванай колькасьці прэтэндэнтак. Сакрэт папулярнасьці шоў просты: першая прыгажуня атрымлівала працоўнае месца ў гарадзкім клінічным шпіталі.

Адразу перад вачыма паўстаў малюнак: паступіўшы ў мэд, адна частка студэнтак сядзіць за кніжкамі, а другая не вылазіць з касмэтычных салёнаў. У выніку батанічкі выпраўляюцца ішачыць чаўнакамі ў Польшчу, а тыя, у каго ногі даўжэйшыя, працуюць па спэцыяльнасьці.

Ідэя наконт прыгажосьці не такая ўжо і дрэнная. Як мала ў нашым жыцьці эстэтычнага і прыгожага! Напрыклад, крытэр прыгажосьці можа быць уведзены на біржах працы. Браць на вакансіі толькі самых прыгожых беспрацоўных і самых элегантных бамжоў. Той жа прынцып увесьці на пунктах прыёму шклатары. Аб’ява на ўваходзе павінна гучаць так: «Сёньня бутэлькі прымаюцца ў кліентаў, падобных да Марлона Брандо й Сафі Ларэн». Чэргі да пунктаў здачы посуду ня будуць больш нагадваць кастынг актораў на ролю ў п’есе «На дне». Гэта будзе падобна да перакуру банкіраў падчас Эканамічнага форуму ў Давосе.

Пры канцы прыярытэт эстэтычнага можа быць пашыраны і на вялікую палітыку. Цяпер у нас людзі абіраюць прэзыдэнта, грунтуючыся на ўласных забабонах. Але гэтыя забабоны хвілінныя, іх можна лёгка сфармаваць з дапамогай СМІ. Хіба ня лепей было б абіраць начальніка дзяржавы паводле адпаведнасьці надчасавым ідэалам прыгажосьці?

Уявіце сябе выбары-2006.

На подыюме — аголеныя кандыдаты: змарнелы Лябедзька, пануры Вячорка ў акулярах, схільны да атлусьценьня Калякін... і Сам — статны, атлетычны, загарэлы на аўстрыйскіх курортах і загартаваны на раўбіцкай лыжні. Пачынаюцца выбары. «Пакажыце, калі ласка, біцэпсы», — просіць электарат. Прадстаўнікі дэмакратычнай эліты кажуць пра нейкі нелегальны гандаль зброяй, а АРЛ, быццам Шварц, гуляе накачанымі трыцэпсамі.

Вынікі прадказальныя. Міжнародныя назіральнікі канстатуюць, што парушэньня перадвыбарчага працэсу не было...

Дарэчы, у турнірах па бодыбілдынгу няма абмежаваньняў на колькасьць балятаваньняў. Шварцэнэгер быў «містэрам Алімпія» аж сем разоў. Сем на пяць — гэта 35 гадоў... Так што — усе ў «качалку»!

**Лёлік Ушкін**

## КРЫЖАВАНКА



**Па гарызанталі:** **7**. «Шухер» па-марскому. **8**. Тое, што зрабіў Дунін-Марцінкевіч з «Панам Тадэвушам». **11**. Малпін хлеб. **12**. Лятальны апарат Ікара. **13**. Прозьвішча жонкі вядомага хакеіста Цыплакова. **16**. Шапка, якую, згодна з назваю, мусяць насіць толькі пілёты, але чамусьці носяць і іншыя. **17**. Сябрук. **18**. У дылеме «кашалёк або смерць» жыцьцё важкі … на карысьць кашалька. **20**. Папярэдняя рэінкарнацыя Бураціна. **21**. Размова з хваробай у выглядзе перамоваў з мэтай схіліць яе капітуляваць без умоваў. **22**. Згодна з Андэрсэнам, лебедзяня — гэта брыдкае … **23**. Калматы бацька ўсіх сланоў. **25**. «Вісіць Сталіна партрэт, // залатая …, // Вывеў ён мяне ў сьвет, // цёмную сялянку» (псэўдафальклёр 1930-х). **29**. Прадукт, які лічыцца найлепшай рыбай (згодна з савецкай народнай мудрасьцю). **31**. Адна з магілёўскіх брамаў XVII ст. **33**. Фальварак, дзе пан Тадэвуш «ёмка ў шчоку ляснуў» маёра расейскага войска. **35**. Нялюдзкая эпідэмія, ад якой рабілі прышчэпку крымінальнай тройцы ў стужцы «Каўкаская паланянка». **36**. «У адным сяле — няважна дзе, хадзіў … у чарадзе». **37**. Гарэлка, настоеная на табурэце, — табурэтаўка, а гарэлка, настоеная на анісе, — … **38**. Тое ж, што й гарладзёр.

**Па вэртыкалі:** **1**. Месяц у пару сваёй маладосьці. **2**. Тое, што розьніць боршч ад капусты. **3**. Князі ды піянерважатыя проста жыць не маглі безь яе. **4**. Спосаб перадаць грошы праз банк. **5**. … ды косткі — набор для булёну. **6**. Наш тынэйджэр. **9**. Вельмі жальлівая грузінская песьня пра дзяўчыну-пярэваратня і яе магілку. **10**. Гейшы, самураі ды камікадзэ называюць вішню менавіта так. **14**. Неправінцыйная. **15**. У яго на пагонах «СВВ». **18**. Безумоўны лідэр умоўных адзінак у Беларусі. **19**. Гэтак маглі клікаць у дзяцінстве маскоўскага князя Дзьмітрыя Данскога. **24**. Трава, якую не дакасіў Ясь дзеля праблемаў сямейнага ўладкаваньня. **26**. Сваякі стружак ды трэсак. **27**. Аблегчаная мадыфікацыя пяльменяў. **28**. «І толькі ў беднай … стаяў хляўчук, сядзелі кветкі, ляжаў нявораны дзірван» («Сказ пра Лысую гару»). **30**. У Аб’яднаных Арабскіх Эміратах ансамбль «Арабэскі» піў каву «…». **32**. Боты з калючкамі. **31**. Антыпракурор. **34**. Адзіны беларус, якому выпала патанчыць з Вэнэраю на Парнасе.

**Склаў Павал Касьцюкевіч**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

Запрашаем на падарожжа **4 красавіка** (нядзеля) па маршруце: **Менск—Сноў—Вольна—Стайкі—Гарадзішча—Дварэц—Дзятлава—Наваельня—Райца—Менск.**

**24—25 красавіка**: Меднікі—Вільня—Трокі.

Тэл. 232-54-58; 622-57-20 (Зьміцер), 264-12-38; 776-24-35 (Павал)

### МГА «Гісторыка» запрашае

**Вербная Нядзеля ў Жыровічах**

**4 красавіка.** У вандроўку па маршруце: гістарычны **Слонім** (архітэктурныя помнікі XV—XIX ст.) — **Альбярцін** (сядзіба п.п.XIX ст.) — **Жыровічы** (Жыровіцкі манастыр XVI—XIX ст., сьвятая крыніца) — **Сынкавічы** (царква Сьвятога Міхаіла XV ст.)

Цана — 18 тыс. руб. для дзяцей і 21 тыс. для дарослых.

**Вандроўка «Вялікае княства Літоўскае = Беларусь + Валынь»**

**3 красавіка. Зімняе** (Сьвятагорскі кляштар) — **Уладзімір Валынскі** (першая сталіца Галіцка-Валынскага княства) — **Затурцы** (касьцёл Сьв.Тройцы) — **Луцк** (княжы замак, Малы замак, палац Вітаўта ды інш.).

**4 красавіка**. **Алыка** (палац Радзівілаў) — **Дубна** (замак, палацы Астроскіх і Любамірскіх, праваслаўныя і каталіцкія кляштары) — **Міжырыч** (кляштар-крэпасьць) — **Астрог** (замак Астроскіх, вежы, храмы, музэй кнігі)

**Два дні — 45 у.а.+15.000.** Студэнтам — зьніжка.

Заходзьце: Фабрыцыюса, 9, оф.13. Т.: 222-88-76, 8-029-755-03-70; http://altusplus.narod.ru

**ВІТАНЬНІ**

**Ігара Мацьвеева** зь Віцебску, сапраўднага сына Бацькаўшчыны, віншую з Днём народзінаў. Духовай моцы, шчасьця! Тацяна

**30 сакавіка** ў самай прыгожай дзяўчыны быў Дзень народзінаў. Віншую цябе, Аленка! Більдзюк Дзяніс

**Віншую** ўсіх магілёўскіх, а таксама іншагародніх сяброў сэкты Віньні з Камаедзіцай! Тацяна

**КАНТАКТЫ**

**Моладзевая ініцыятыва «Вока».** http://www.voka.tk. E-mail: info@voka.tk. Будзем разам!!!

**Зьбіраю любую інфармацыю** па гісторыі беларускага футболу. goalkiper@tut.by. Bramnik

**Штотыдзень у нядзелю** ад 14 да 16-й Купалавы чытаньні. Каля помніка Паэту

**КНІГІ, МУЗЫКА**

**«Навінкі-magazine»** поштай! Замовы дасылаць на mail: alegmzr@tut.by

**Набуду CD** «Я нарадзіўся тут» з каляровым фотаальбомам. Т.: 285-82-18. Андрэй

**Прапаную кнігу** «Краіна Беларусь» (У.Арлоў, З.Герасімовіч). Таньней, чым у крамах! Т.: 8-029-400-62-25

**Новыя ды рэдкія кнігі**, часопісы, календары, дапаможнікі, слоўнікі, майкі, відэа, аўдыё, CD, значкі на Румянцава, 13 (ТБМ), ля Лінгвістычнага ўнівэрсытэту, 13.00—19.40, апроч суботы ды нядзелі

**Прадам** (нядорага) ці абмяняю акадэмічную «Расейскую граматыку» ў дзьвюх частках. Т.: 230-91-53

**ПРАЦА**

**Праца для студэнтаў**, офісная работа, сфэра абслугоўваньня насельніцтва. Пэйдж.: 207-00-00, аб.20819. Т.: 230-59-13. Раіса

**Падпрацоўка** ў вольны час для пэдагогаў, мэдыкаў. Т.: 8-092-689-07-74. Раіса

**Падпрацоўка** для студэнтаў, 4 гадзіны ў дзень, добры заробак. Т.: 230-06-85 пасьля 15.00. Сьвятлана

**Юрыст** (гаспадарчае, цывільнае, працоўнае права) шукае дадатковы заробак. 221-13-81. Натальля

## КОШТЫ

**На платныя прыватныя абвесткі (для прыватных асобаў) на старонку 16 рэклямныя расцэнкі:** да 20 словаў (тэкставы модуль) — 4100 руб., за кожныя наступныя 20 словаў (тэкставы модуль) — 4000 руб. Афармленая абвестка з улікам кошту арыгінал-макету за 1 кв. см. — 650 руб.

## IN MEMORIAM

# Ірына Шаблоўская



Яна сышла ціха, да апошняга моманту хаваючы сваю хваробу, не дазваляючы сябе шкадаваць нават самым блізкім людзям. Сышла, пакінуўшы нам сьветлыя згадкі і сваю любоў. І яна жыве любоўю тых, хто яе ведаў, хто побач жыў ці працаваў, каму пашчасьціла быць яе вучнямі.

25 сакавіка ня стала Ірыны Шаблоўскай. Першая ў Беларусі доктарка філялягічных навук у галіне замежнай літаратуры, прафэсарка, больш як 20 гадоў загадчыца катэдры замежнай літаратуры БДУ, яна з 1969 г. выкладала на філфаку, рупілася пра рэформу нацыянальнай вышэйшай школы. Зь лекцыямі І.Шаблоўская выступала ў многіх краінах сьвету, два гады выкладала славістыку ва ўнівэрсытэце Гранады. Сёньняшняя катэдра замежнай літаратуры БДУ — гэта ў многіх адносінах плён яе працы.

За яе прастатой, прыроднай сьціпласьцю хаваўся аналітычны розум, сапраўдная інтэлігентнасьць і душэўная тонкасьць. Таленавіты і ўважлівы Настаўнік, яна любіла жыцьцё і цаніла прыгожае ў любых яго праявах — у словах, гуках вясны, водарах кветак. Да апошняга ўздыху яна заставалася жанчынай, пяшчотнай і надзвычай моцнай.

**Ганна Бутырчык**

## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Мікалаю В. з tut.by.** Над Вашай прапановай падумаем. Толькі праблема ў тым, што паліталягічных крыніцаў такіх зусім няшмат, а з тых, якія ёсьць, ня ўсе прыдатныя для аналізу. У цэлым жанр агляду больш уласьцівы часопісу. Таму з Вашага дазволу пераадрасуем гэты Ваш ліст і часопісу «Arche». З рознымі рэсурсамі сапраўды часам ёсьць такая бяда, што яны не заўжды кіруюцца нацыянальнымі інтарэсамі. За кампліменты дзякуй.

**Т.В.** Што да рэцэнзій: асабліва цікава, калі яны даюць нейкую экстраінфармацыю і экстрарэфлексіі, а не абмяжоўваюцца пераказам зьместу кнігі.

**Алесю Р. зь Менску.** Пераконваць чытачоў «НН», нават расейскамоўных, у карыснасьці й неабходнасьці гаварыць па-беларуску патрэбы няма.

**У.Ш. зь Менску.** Грэцыю зь Беларусяй Вы зьвязваеце толькі супольным Днём Волі. Хацелася б глыбейшага пранікненьня ў тэму, пошуку аналёгіяў сутнасных, а не выпадковых. У тэксьце ёсьць фактычныя памылкі й недакладнасьці ў напісаньні імёнаў.

**Усім стурбаваным.** Сайт www.nn.by функцыянаваў із збоямі праз праблемы на сэрвэры. Прабачце, напраўляем.

## УДАКЛАДНЕНЬНЕ

У мінулым нумары на с.16 у артыкуле «Апэрацыя «Ы» замест «Лемянтоўскі» трэба чытаць «Лемяноўскі».

Наша Ніва КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. А/с 537, 220050, Менск.

**Тэкст** ____________________

**Імя і прозьвішча** ____________________

**Адрас, тэлефон** ____________________

Наша Ніва

незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
галоўны рэдактар — Андрэй Дынько
фота-рэдактар — Арцём Лява
карэктар — Сяргей Петрыкевіч
карэктарка — Галіна Рабянкова
нам. галоўнага рэдактара — Андрэй Скурко
тэхнічны рэдактар — Андрэй Чык
выдавец і заснавальнік — Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 3535. Газэта выдаецца 48 разоў на год.

Нумар падпісаны ў друк 22.00 31.03.2004.

Замова № 1932.

Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а